ЭНЦЫКЛІКА

# *LAUDATO SI’*
Святога Айца

Францішка

ПРЫСВЕЧАНАЯ КЛОПАТУ ПРА СУПОЛЬНЫ ДОМ

Пераклад Секцыі па перакладзе літургічных тэкстаў
і афіцыйных дакументаў Касцёла
Камісіі Божага Культу і Дысцыпліны Сакрамэнтаў
пры Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі

1. «*Laudato si’, mi’ Signore* – , », – спяваў святы Францішак Асізскі. У гэтым прыгожым спеве ён прыпамінае, што наш супольны дом – гэта як сястра, з якой мы разам існуём, і як прыгожая маці, якая бярэ нас у абдымкі: «Будзь праслаўлены, мой Пане, праз нашую сястру, зямлю-маці, якая корміць нас і аберагае, прыносіць розныя плады з рознакаляровымі кветкамі і травамі» [1] .

2. Гэтая сястра пратэстуе супраць шкоды, якую мы прычыняем ёй неадказным карыстаннем і рабаўнічай эксплуатацыяй дабротаў, якія ў ёй змясціў Бог. Мы прызвычаіліся думаць, што з’яўляемся яе ўладальнікамі і распарадчыкамі, якія маюць права яе рабаваць. Насілле, якое жыве ў зраненых грахом людскіх сэрцах, выяўляецца таксама праз хваробы зямлі, вады, паветра і жывых істот. Таму сярод найбольш занядбаных і дрэнна трактаваных знаходзіцца нашая прыгнечаная і спустошаная зямля, якая «стогне і нараджае ў пакутах» ( 8, 22). Мы забываем, што самі пахо-дзім з зямнога пылу (пар.  2, 7). Нашае ўласнае цела пабудавана з элементаў нашай планеты, яе паветра дазваляе нам дыхаць, а яе вада ажыўляе і аднаўляе

нас.

Ніштo са спраў гэтага свету нам не абыякава

3. Больш за пяцьдзесят гадоў назад, калі свет хістаўся на мяжы нуклеарнага крызісу, Святы Айцец Ян XXIII напісаў энцыкліку, у якой не абмяжоўваўся толькі аспрэчваннем вайны, але хацеў пераказаць прапанову спакою. Зварот *Pacem in terris* ён скіраваў «да ўсяго каталіцкага свету», але дадаў: «да ўсіх людзей добрай волі». Сёння, перад аблiччам глабальнай дэградацыі навакольнага асяроддзя, я хацеў бы звярнуцца да кожнай асобы, якая жыве на планеце. У маёй адгартацыі *Evangelii gaudium* я пісаў да членаў Касцёла, каб мабілізаваць іх да ажыццяўлення рэформы місійнай дзейнасці. У гэтай энцыкліцы я прапаную распачаць дыялог з усімі наконт нашага супольнага дому.

4. Праз восем гадоў пасля *Pacem in terris*, у 1971 годзе, благаслаўлёны папа Павел VI звярнуўся да пытання экалогіі, указваючы на крызіс як на «драматычны вынік» бескантрольнай дзейнасці чалавека, які «ў выніку неразважлівага выкарыстання прыроды выклікае небяспеку яе знішчэння, і ў сваю чаргу таксама ён сам стане ахвярай гэтай дэградацыі» [2] . Больш за тое, у ФАА казаў таксама пра магчымасць «экалагічнай катастрофы з-за выбуху прамысловай цывілізацыі», падкрэсліваючы «пільную неабходнасць радыкальнай змены ў паводзінах чалавека», бо «найбольш незвычайныя навуковыя дасягненні, найбольш выдатныя тэхнічныя дасягненні, найцудоўнейшае развіццё эканомікі, калі не спалучаны з сапраўдным грамадскім і маральным развіццём, у канчатковым выніку паварочваюцца супраць чалавека» [3] .

5. Святы Ян Павел II займаўся гэтым пытаннем з усё большай зацікаўленасцю. У сваёй першай энцыкліцы папярэджваў, што «чалавек, здаецца, часта не заўважае іншых значэнняў свайго прыроднага асяроддзя, акрамя тых, якія служаць неадкладнаму выкарыстанню і спажыванню» [4] . Таму заклікаў да глабальнага «экалагічнага » [5] . Але адначасова заўважыў, што «вельмі мала ўвагі звяртаецца на абарону маральных умоў сапраўднай „чалавечай экалогіі”» [6] . Знішчэнне чалавечага асяроддзя з’яўляецца вельмі сур’ёзнай справай не толькі таму, што Бог даручыў чалавеку свет, але таксама таму, што само чалавечае жыццё з’яўляецца дарам, які трэба берагчы ад розных формаў дэградацыі. Кожны клопат і імкненне да паляпшэння свету патрабуе глыбокіх «зменаў стылю жыцця, мадэляў вытворчасці і спажывецтва, умацаваных структур улады, на якія сёння абапіраецца грамадства» [7] . Сапраўднае развіццё чалавека мае характар маральны і вядзе да поўнага шанавання чалавечай асобы, яно павінна быць таксама накіравана на свет прыроды і «браць пад увагу сутнасць кожнай істоты, а таксама іх узаемасувязь ва ўпарадкаванай сістэме» [8] . Таму здольнасць чалавека перамяняць рэчаіснасць павінна развівацца на падставе першаснага прызначэння рэчаў, якое акрэсліў Бог [9] .

6. Мой папярэднік Бэнэдыкт XVI паўтарыў заахвочванне да «ліквідацыі структурных прычынаў кепскага функцыянавання сусветнай эканомікі і выпраўлення мадэляў развіцця, якія здаюцца няздольнымі забяспечыць шанаванне прыроднага асяроддзя» [10] . Нагадаў, што свет не можа быць аналізаваны на падставе толькі аднаго аспекту, бо «кніга прыроды – адна і непадзельная» і ахоплівае навакольнае асяроддзе, жыццё, сэксуальнасць, сям'ю, грамадскія адносіны, а таксама іншыя аспекты. У сувязі з гэтым «дэградацыя прыроды сцісла звязана з культурай, якая фарміруе чалавечае суіснаванне» [11] . Папа Бэнэдыкт звярнуў увагу, што прыроднае асяроддзе поўнае ранаў, нанесеных нашымі неадказнымі паводзінамі. Таксама грамадскае асяроддзе мае свае раны. Але ўсе яны, па сутнасці, выкліканы тым самым злом, г.зн. ідэяй, што бясспрэчнай праўды, якая кіруе нашым жыццём, не існуе, таму свабода чалавека не мае межаў. Мы забываем, што «што чалавек – гэта не толькі свабода, якую ён сам сабе стварае. Чалавек не стварае самога сябе. Ён з'яўляецца духам і воляй, але з'яўляецца таксама натурай» [12] . З бацькоўскім клопатам заахвоціў нас прызнаць, што стварэнне знаходзіцца ў небяспецы там, дзе «мы самі з'яўляемся канчатковай інстанцыяй, дзе ўсё проста належыць нам і дзе мы спажываем толькі для саміх сябе. Марнаванне стварэння пачынаецца там, дзе мы не прызнаем над сабою ніякай інстанцыі, але бачым толькі саміх сябе» [13] .

Мы аб'яднаныя агульным клопатам

7. Гэты ўклад Папаў падсумоўвае развагі вялікай колькасці навукоўцаў, філосафаў, тэолагаў і грамадскіх арганізацый, якія ўзбагацілі думку Касцёла па гэтых пытаннях. Мы не можам ігнараваць таго, што побач з Каталіцкім Касцёлам таксама іншыя Касцёлы і Хрысціянскія супольнасці – як і іншыя рэлігіі – выказваюць глыбокі клопат і каштоўныя разважанні на тэму гэтых пытанняў, што турбуюць нашыя сэрцы. Каб прывесці хаця бы адзін асабліва важны прыклад, хачу коратка нагадаць навучанне экуменічнага патрыярха Барталамея, з якім мы падзяляем надзею на касцёльную камунію.

8. Патрыярх Барталамей асабліва падкрэсліў неабходнасць скрухі за адсутнасць нашага клопату аб планеце, бо «кожны з нас па меры сваіх сціплых магчымасцяў прычыняецца да малых экалагічных катастроф». Мы пакліканы прызнаць «наш меншы ці большы ўклад у шкоды і знішчэнні навакольнага асяроддзя» [14] . На гэтую тэму ён неаднаразова станоўча выказваўся, заахвочваючы прызнаць грахі суп-раць створанай рэчаіснасці: «Калі людзі становяцца прычынай вымірання відаў, а таксама знішчэння біялагічнай разнастайнасці Божага стварэння, калі людзі разбураюць інтэгральнасць зямлі, выклікаючы змены клімату, рабуюць зямлю, знішчаючы яе натуральныя лясы або водна-балотныя рэсурсы, калі людзі забруджваюць атрутнымі субстанцыямі водныя рэсурсы зямлі, яе сушу, паветра, жаццё, то ўсё гэта грахі» [15] . Паколькі «злачынства супраць прыроды з'яўляецца таксама злачынствам супраць нас саміх і грахом супраць Бога» [16] .

9. Адначасова Барталамей звярнуў увагу на этычныя і духоўныя прычыны экалагічных праблем, якія заахвочваюць нас шукаць вырашэнняў не толькі ў тэхніцы, але таксама ў перамене чалавека, бо ў адваротным выпадку мы будзем змагацца толькі з пра-ява-мі. Я прапанаваў перайсці ад спажывання да прысвячэння, ад хцівасці да веліндушнасці, ад марнавання да здольнасці дзяліцца, да аскезы, якая «вучыць аддаваць, а не проста адмаўляцца... Гэта спосаб любові, які заключаецца ў тым, каб пераходзіць ад таго, чаго хачу я, да таго, чаго хоча Божы свет. Гэта вызваленне ад страху, хцівасці і залежнасці» [17] . Больш за тое, мы, хрысціяне, таксама пакліканы «прыняць свет як сак-рамэнт еднасці, як спосаб сумеснага адчування разам з Богам і бліжнім у глабальным вымярэнні. Гэта нашае сціплае перакананне, што тое, што Боскае, і тое, што людское, сустракаюцца ў найменшых падрабязнасцях, заключаных у непадзельнай шаце Божага стварэння, аж да апошняй пясчынкі пылу нашай планеты» [18] .

Святы Францішак Асізскі

11. Яго сведчанне паказвае нам таксама, што ін-тэгральная экалогія патрабуе адкрытасці на катэгорыі, якія выходзяць па-за межы дакладных навук ці біялогіі, і лучыць нас з сутнасцю таго, што людское. Падобна як закаханы чалавек, Францішак кожны раз, калі гля-дзеў на сонца, месяц ці найменшых жывёлаў, складаў спеў, уключаючы ў сваё праслаўленне ўсё стварэнне. Яднаўся з усім стварэннем, а нават абвяшчаў казанне кветкам, «запрашаў іх услаўляць Пана, як бы яны мелі розум» [19] . Яго рэакцыя была чымсьці большым, чым удзячнасць за інтэлектуальныя або эканамічныя калькуляцыі, бо для яго кожнае стварэнне было як сястра, звязаная з ім повязямі любові. Таму адчуваў сябе пакліканым клапаціцца аб усім, што існуе. Яго вучань, святы Банавентура, апавядаў, што «разважаючы пра пачатак усіх стварэнняў, ён штораз больш ажыўляў сваю пабожнасць і ўсе стварэнні, нават самыя найменшыя, называў братамі і сёстрамі, бо ведаў, што разам з ім яны паходзяць з той самай Крыніцы» [20] . Нельга недаацэньваць гэтае перакананне і лічыць яго нерацыянальным рамантызмам, бо яно ўплывае на выбар, а ён уплывае на нашыя паводзіны. Калі набліжаемся да прыроды і навакольнага асяроддзя без гэтай адкрытасці на здзіўленне і захапленне, калі не прамаўляем мовай братэрства і прыгажосці ў нашых адносінах са светам, то нашыя паставы будуць паставамі кіраўніка, спажыўца або таго, хто толькі выкарыстоўвае натуральныя рэсурсы і няздольны абмежаваць свае зямныя інтарэсы. Аднак, калі мы адчуваем сябе цесна звязанымі з усім, што існуе, то ўмеркаванасць і клопат з'яўляюцца спантанна. Убоства і прастата святога Францішка не былі толькі знешняй аскезай, але чымсьці больш радыкальным: адмаўленнем ад стаўлення да рэчаіснасці толькі як да аб'екту выкарыстання і панавання.

12. З другога боку святы Францішак, верны Свя-тому Пісанню, прапануе нам прызнаць прыроду цудоўнай кнігай, праз якую да нас прамаўляе Бог і пераказвае нам штосьці са

сваёй прыгажосці і дабрыні: «праз веліч і хараство стварэнняў па аналогіі пазнаецца іх Творца» (*М* 13, 5), а «Яго моц і боскасць, заўважальныя ў чынах, бачныя» ( 1, 20). У сувязі з гэтым патрабаваў, каб у кляштары заўсёды пакідалі неапрацаванай частку сада, каб там раслі дзікія зёлкі, каб тыя, хто захапляецца імі, маглі ўзнесці думкі да Бога, Стварыцеля такой вялікай прыгажосці [21] . Свет – гэта штосьці большае за праблему, якая патрабуе вырашэння, гэта радасная таямніца, якой мы захапляемся, аддаючы пашану Богу.

Мой заклік

13. Тэрміновы заклік да абароны нашага супольнага дому ахоплівае клопат аб з'яднанні ўсёй чалавечай сям'і ў імкненні да ўстойлівага і інтэгральнага развіц-ця, бо ведаем, што ўсё можа змяніцца. Стварыцель нас не пакідае, ніколі не адступае ў сваім плане любові, не шкадуе, што стварыў нас. Чалавецтва яшчэ здольнае да супрацоўніцтва ў будаванні нашага супольнага дому. Хачу выказаць прызнанне, дадаць адвагі і падзякаваць усім, хто актыўна ўдзельнічае ў абароне нашага су-польнага дому. Асаблівай удзячнасці заслугоўваюць тыя, хто энергічна змагаўся з драматычнымі наступствамі знішчэння навакольнага асяроддзя ў жыцці самых бедных на свеце. Моладзь патрабуе ад нас зменаў. Разважае, як гэта магчыма, што мы імкнемся будаваць лепшую будучыню, не думаючы аб крызісе навакольнага асяроддзя і пра цярпенні людзей, адкінутых грамадствам.

14. Кірую тэрміновы заклік да адновы дыялогу на тэму спосабу будавання будучыні нашай планеты. Мы патрабуем дыскусіі, якая нас усіх з'яднае, бо экалагічны выклік і яго чалавечыя карані датычаць і закранаюць усіх нас. Глабальны экалагічны рух мае доўгую і багатую гісторыю, нарадзіў шмат грамадзянскіх груп, якія дапамаглі абудзіць свядомасць. На жаль, шмат намаганняў у адшуканні канкрэтных вырашэнняў экалагічнага крызісу было змарнавана не толькі багатымі гэтага свету, але таксама з прычыны адсутнас-ці зацікаўленасці астатніх. Аспрэчванне праблемы, што вынікае з выгоднай абыякавасці, адмаўленне або сляпая вера ў тэхнічныя сродкі – гэта паставы, якія перашкаджаюць знаходзіць адпаведныя вырашэнні і якія сустракаюцца нават сярод веруючых. Мы патрабуем новай усеагульнай салідарнасці. Як сказалі біскупы Паўднёвай Афрыкі: «Таленты і актыўнасць кожнага з нас неабходны для выпраўлення шкодаў, учыненых людзьмі Божаму стварэнню» [22] . Усе мы можам супрацоўнічаць як прылады Бога ў клопаце аб стварэнні, кожны са сваёй культурай і досведам, сваімі ініцыятывамі і магчымасцямі.

15. Спадзяюся, што гэтая энцыкліка, далучаючыся да сацыяльнага вучэння Касцёла, дапаможа нам распазнаць веліч, неабходнасць і прыгажосць выкліку, які стаіць перад намі. Спачатку коратка згадаю розныя аспекты сённяшняга экалагічнага крызісу, карыстаючыся найлепшым плёнам навуковых даследаванняў, якія сёння з'яўляюцца для нас даступнымі, каб яны да глыбіні нас усхвалявалі і стварылі падставу для этычных і духоўных

разважанняў. Зыходзячы з гэтага, закрану пэўныя пытанні, што вынікаюць з юдэахрысціянскай традыцыі, каб надаць большую паслядоўнасць нашай дзейнасці на карысць навакольнага асяроддзя. Затым паспрабую разгледзець больш глыбокія прычыны дадзенай сітуацыі, не спыняючыся на яе сімптомах. Такім чынам мы зможам прапана-ваць такую экалогію, якая ў сваіх розных вымярэннях спалучала б асаблі-вую пазіцыю, якую чалавек займае ў гэтым свеце, а таксама яго адносіны з акружаючай рэчаіснасцю. У святле гэтых разважанняў хацеў бы зрабіць крок наперад у вызначэнні пэўных агульных напрамкаў дыялогу і дзейнасці, як для кожнага з нас, так і для міжнароднай палітыкі. Урэшце, паколькі я перакананы, што кожная перамена патрабуе матывацыі і адукацыйнага працэсу, прапаную пэўныя шляхі чалавечага сталення, натхнёныя скарбам хрысціянскага духоўнага досведу.

16. Хоць кожны раздзел мае сваю тэматыку і канкрэтную метадалогію, я разглядаю з новай перспектывы важныя пытанні, якія закраналіся ў папярэдніх раздзелах. Гэта датычыць асабліва некаторых галоўных тэм, якія пранізваюць усю энцыкліку. Напрыклад, цесная сувязь паміж убогімі і крухкасцю нашай планеты, перакананне, што ўсё на свеце цесна паміж сабою пераплятаецца, крытыка новай парадыгмы і форм тэхнакратычнай улады, заахвочванне да пошуку іншых спосабаў разумення эканомікі і прагрэсу, каштоўнасць, уласцівая кожнаму стварэнню, чалавечы сэнс экалогіі, неабходнасць у адкрытай і шчырай дыскусіі, сур’ёзная адказнасць міжнароднай і мясцовай палітыкі, культура адкідвання, а таксама прапанова новага стылю жыцця. Гэтыя пытанні ніколі не будуць зачыненыя і забытыя, але няспынна будуць разглядацца і дапаўняцца.

## РАЗДЕЛ ПЕРШЫ

## ШТО АДБЫВАЕЦЦА З НАШЫМ ДОМАМ

17. Тэалагічныя або філасофскія разважанні пра сітуацыю чалавецтва і свету могуць гучаць як паўтор пустых дэвізаў, калі не будуць нанова змешчаныя ў актуальным кантэксце, беспрэцэдэнтным для гісторыі чалавецтва. Таму перш, чым распазнаем, як вера прыўносіць новыя матывацыі і патрабаванні адносна свету, часткай якога мы з’яўляемся, прапаную на хвіліну затрымацца і задумацца над тым, што адбываецца ў нашым супольным доме.

18. Няспынна ўзрастаючая хуткасць пераменаў чалавецтва і нашай планеты спалучаецца сёння з больш інтэнсіўным рытмам жыцця і працы, што па-іспанску некаторыя называюць «rapidacio2n» (паскарэнне). Хоць змены належаць да дынамікі складаных сістэм, хуткасць, якую ім навязвае дзейнасць чалавека, стварае сёння кантраст з натуральнай павольнасцю біялагічнай эвалюцыі. Далучаецца да гэта-га праблема, што мэты дадзеных хуткіх і

пастаянных зменаў не заўсёды арыентаваныя на агульнае дабро і ўстойлівае і інтэгральнае чалавечае развіццё. Змена з’яўляецца чымсьці жаданым, але абуджае неспакой, калі вядзе да дэградацыі свету і якасці жыцця значнай часткі чалавецтва.

19. Пасля перыяду ірацыянальнай веры ў прагрэс і людскія магчымасці частка грамадства распачынае этап больш глыбокай свядомасці. Мы адзначаем усё большую ўвагу да асяроддзя і ўзрастаючы клопат аб прыродзе, а таксама шчыры і поўны болю страх за тое, што адбываецца з нашай планетай. Разгледзім коратка пытанні, якія сёння выклікаюць наш неспакой і ад якіх мы больш не можам ухіляцца. Не ідзе тут гаворка пра збіранне інфармацыі ці заспакойванне нашай цікавасці, але пра балючае ўсведамленне таго, каб мець адвагу перамяніць у асабістае цярпенне тое, што адбываецца на свеце, а праз гэта распазнаць, які ўклад можа зрабіць кожны з нас.

## I. Забруджванне і глабальнае пацяпленне

### Забруджванне, адходы і культура адкідвання

20. Існуюць формы знішчэнняў, якія штодзённа ўплываюць на чалавека. Небяспека забруджвання паветра стварае шэраг уздзеянняў на здароўе людзей, асабліва самых бедных, выклікаючы мільёны выпадкаў заўчаснай смерці. Яны хварэюць, напрыклад, з прычыны ўдыхання дыму ад паліва, якое выкарыс-тоўваецца для бытавых мэтаў ці ацяплення. Усеагуль-ную шкоду нясе забруджванне, выкліканае транс-партам, прамысловымі выкідамі, складзіраваннем субстанцый, якія акісляюць глебу і ваду, угнаеннямі, інсектыцыдамі і фунгецыдамі, пестыцыдамі і паўсюд--на ўжыванымі ў сельскай гаспадарцы хімічнымі сродкамі. Тэхналогія, звязаная з фінансамі, якая прэтэндуе на тое, каб быць адзіным вырашэннем праблемаў, на самай справе не можа заўважыць таямніцы разнастайных повязяў, якія існуюць паміж рэчамі, і таму часам, вырашаючы адну праблему, стварае наступныя.

21. Трэба таксама ўзяць пад увагу забруджванне адходамі, у тым ліку адходамі шкодных рэчываў у розных асяроддзях. Штогод з’яўляецца сотні мільёнаў тон смецця, з якога пэўная частка не падлягае біялагічнаму распаду: бытавыя і камерцыйныя адходы, будаўнічае смецце, медыцынскія, электронныя і прамысловыя адходы, вельмі таксічныя і радыёактыўныя адходы. Наш дом, Зямля, становіцца штораз больш вялізным складам смецця. У многіх кутках свету асобы старэйшага ўзросту з настальгіяй узгадваюць краявіды з мінулага, якія сёння засыпаюцца смеццем. Як прамысло--выя адходы, так і хімічныя сродкі, якія выкарыстоўваюцца ў гарадах і на палях, могуць выклікаць утварэнне атрутных

злучэнняў у арганізмах жыхароў ваколіц, і гэта здараецца нават тады, калі ўзровень таксічнага элемента ў дадзеным месцы нізкі. Вельмі часта прэвентыўныя сродкі выкарыстоўваюцца толькі тады, калі вынікі аказваюцца незваротнымі для здароўя чалавека.

22. Гэтыя праблемы цесна звязаны з культурай адмаўлення, якая закранае як адкінутых людзей, так і прадметаў, якія хутка становяцца смеццем. Напрыклад заўважаем, што большасць выпушчанай паперы выкідваецца без перапрацоўкі. Цяжка пагадзіцца з тым, што прыкладам з'яўляецца функцыянаванне натуральных экасістэм: расліны сінтэзіруюць пажыўныя рэчывы, якія становяцца ежай для траваедных. Гэтыя ў сваю чаргу становяцца ежай драпежных звяроў, даючы значную колькасць арганічных адходаў, якія даюць пачатак новаму пакаленню раслін. А прамысловая сістэма ў канцы вытворчага цыкла і спажывецтва не распрацавала здольнасці паглынання і паўторнага выкарыстання рэштак і адходаў. Яшчэ не ўдалося прыняць канчатковай мадэлі вытворчасці, якая б запэўніла рэсурсы для ўсіх і для будучых пакаленняў, і якая патрабавала б максімальнага абмежавання ў выкарыстанні неўзнаўляльных рэсурсаў, запавольвання спажывецтва, максімальна эфектыўнага выкарыстання, паўторнага выкарыстання і перапрацоўкі. Вырашэнне гэтай праблемы было б спосабам супрацьстаяння культуры адмаўлення, якая прыносіць шкоду ўсёй планеце, але бачым, што прагрэс ў гэтай галіне вельмі абмежаваны.

## Клімат як агульнае дабро

23. Клімат – гэта агульнае дабро ўсіх і для ўсіх. У глабальным вымярэнні – гэта складаная сістэма, якая істотна ўплывае на чалавечае жыццё. Існуе вельмі грунтоўны навуковы кансенсус, які паказвае, што мы маем справу з непакоячым фактам пацяплення клімату. Гэтаму глабальнаму пацяпленню цягам мінулых дзесяцігоддзяў спадарожнічае пастаяннае павышэнне ўзроўню мора, і цяжка не спалучыць гэтага з узрастаннем экстрымальных кліматычных з'яў, не кажучы пра тое, што нельга звязаць з кожнай паасобнай з'явай нейкай адной навукова акрэсленай прычыны. Чалавецтва паклікана ўсвядоміць неабходнасць змены стылю жыцця, вытворчасці і спажывецтва, каб спы--ніць глабальнае пацяпленне або, прынамсі, акрэсліць яго антрапагенныя прычыны. Гэта праўда, што існуюць іншыя фактары (напрыклад, вулканічныя з'явы, змена арбіты і восі Зямлі, сонечны цыкл), але шмат-лі-кія навуковыя даследаванні паказваюць, што ў большасці глабальнае пацяпленне за апошнія дзесяцігод-дзі адбылося ў выніку высокай канцэнтрацыі цепла-вых газаў (вуглякіслы газ, метан, аксіды азоту і іншыя), выкліканых галоўным чынам дзейнасцю чалавека. Іх канцэнтрацыя ў атмасферы перашкаджае цяплу сонечных промняў адбівацца ад зямлі і рассейвацца ў прасторы. Гэта павялічвае мадэль развіцця, што грунтуецца на інтэнсіўным выкарыстанні выкапневага паліва, якое з'яўляецца цэнтрам сусветнай энергетычнай сістэмы. Свой уплыў мела таксама ўзрастаючая практыка змены спосабу выкарыстання зямлі, галоўным чынам праз карчаванне лясоў дзеля сельскагаспадарчых мэтаў.

24. У сваю чаргу пацяпленне ўплывае на вугляродны цыкл. Стварае замкнёнае кола, што дадаткова пагаршае сітуацыю, уплываючы на даступнасць асноўных рэсурсаў, такіх як пітная вада, энергія і сельскагаспадарчая вытворчасць у найцяплейшых раёнах, выклікаючы знікненне біялагічнай разнастайнасці нашай планеты. Таянне палярнага лёду і горных леднікоў пагражае сур'ёзнай небяспекай пароў метану, а раскладанне замарожанай арганічнай матэрыі можа яшчэ больш павялічыць выкіды двухвокісу вугляроду. У сваю чаргу знікненне трапічных лясоў пагаршае сітуацыю, бо яны прычыняюцца да змякчэння зменаў клімату. Забруджванне вуглякіслым газам павялічвае кіслотнасць акеанаў і пагражае харчоваму ланцугу ў марскім асяроддзі. Калі такая тэндэнцыя захаваецца, то гэты век можа спазнаць нечуваныя кліматычныя змены і беспрэцэдэнтнае знішчэнне экасістэм, з сур'ёзнымі наступствамі для ўсіх нас. Напрыклад, павышэнне ўзроўню мора можа стварыць над-звы-чай сур'ёзную сітуацыю, калі возьмем пад увагу, што чвэрць жыхароў свету жыве каля мора ці блізка ад яго, а большасць мегаполісаў сканцэнтравана на ўзбярэжжах.

25. Кліматычныя змены з'яўляюцца глабальнай праблемай з сур'ёзнымі экалагічнымі, грамадскімі, эканамічнымі, палітычнымі наступствамі, а таксама з тымі, што звязаны з размеркаваннем прыбытку, і з'яўляюцца адным з найбольшых выклікаў для чалавецтва. Праўдападобна, самыя сур'ёзныя наступствы мы адчуем у найбліжэйшыя дзесяцігоддзі ў развіваючыхся краінах. Значная колькасць убогіх жыве на землях, якія асаблівым чынам закранутыя з'явамі, звязанымі з пацяпленнем, а іх сродкі ўтрымання залежаць у вялікай ступені ад натуральных рэсурсаў і ад гэтак званых экасістэмных паслуг, такіх як земляробства, рыбалоўства і лясныя рэсурсы. Яны не могуць утрымлівацца за кошт іншых рэсурсаў, якія дазволілі б ім прыстасавацца да зменаў клімату ці супрацьстаяння катастрафічным сітуацыям. Яны не маюць таксама доступу да сацыяльнай апекі. Напрыклад, змены клімату вядуць да міграцыі звяроў і раслін, якія не заўсёды могуць адаптавацца, а гэта ў сваю чаргу ўплывае на рэсурсы найбяднейшых асобаў, якія таксама прымушаны мігp. з вялікай няўпэўненасцю ў сваім будучым і будучым іх дзяцей. Трагічным з'яўляецца павелічэнне лічбы мігрантаў, якія ўцякаюць ад бяды, выкліканай дэградацыяй асяроддзя, якія ў міжнародных канвенцыях не прызнаюцца бежанцамі. Яны нясуць цяжар свайго жыцця, пакінутыя самім сабе, без якіх-небудзь норм, якія б іх абаранялі. На жаль, існуе паўсюдная абыякавасць да гэтых трагедый, якія сёння існуюць у розных частках свету. Адсутнасць рэакцыі на гэтыя драмы нашых братоў і сясцёр сведчаць пра страту пачуцця адказнасці за нашых бліжніх, на якое абапіраецца кожная грамадзянская супольнасць.

26. Многія з тых, хто мае больш сродкаў, а таксама больш эканамічнай і палітычнай улады, засяроджваюцца галоўным чынам на маскіроўцы праблемаў або ўкрыванню сімптомаў, імкнучыся толькі абмежаваць негатыўныя вынікі кліматычных зменаў. Аднак многія сімптомы ўказваюць, што гэтыя вынікі могуць пагаршацца, калі мы будзем працягваць наяўныя мадэлі вытворчасці і спажывецтва. Таму стала тэрміновым і неабходным вядзенне такой палітыкі, каб у наступных гадах выкіды вуглякіслага газу і іншых газаў, якія забруджваюць, былі

значна зменшаны шляхам замены, напрыклад, выкапнёвага паліва і развіцця аднаўляемых крыніц энергіі. У свеце існуе невялікі ўзровень доступу да чыстай і аднаўляемай энергіі. Яшчэ трэба развіваць адпаведныя тэхналогіі назапашвання энергіі. Тым не менш некаторыя краіны дасягнулі значнага прагрэсу, хоць ён яшчэ не дастаткова перадавы. Зроблены таксама інвестыцыі ў энергазберагальныя тэхналогіі вытворчасці і траспарту, а таксама ў спосаб узвядзення ці рэканструкцыі будынкаў, якія спрыя-юць змяншэнню выкарыстання энергіі і сыравіны. Але гэтыя добрыя практыкі далёка не паўсюдныя.

## II. Пытанне вады

27. Іншыя паказчыкі бягучай сітуацыі звязаны з вычарпальнасцю прыродных рэсурсаў. Мы добра ведаем, што немагчыма стрымаць наяўны ўзровень спажывальніцтва ў найбольш развітых краінах і больш багатых пластах насельніцтва, дзе звычай выкарыстання і выкідвання дасягае нечуваных памераў. Пераўзыдзены пэўныя максімальныя межы эксплуатацыі планеты, хоць праблема ўбоства засталася невырашанай.

28. Чыстая пітная вада вельмі важная справа, бо яна вельмі неабходная для жыцця чалавека і для падтрымкі зямных і водных экасістэм. Крыніцы прэснай вады забяспечваюць земляробства, жывёлагадоўлю, а таксама прамысловасць, яе якасць уплывае на нашае здароўе. Вада, якая знаходзіцца ў нашым распараджэнні, доўгі час заставалася на ўзроўні адноснай раўнавагі, але цяпер у многіх месцах попыт пераўзыходзіць устойлівае забеспячэнне, з сур’ёзнымі вынікамі за кароткі ці больш доўгі перыяд. Вялікія гарады, якія залежаць ад аб’ёму вадасховішчаў, адчуваюць перыяды недахопу рэсурсаў, якія ў крытычныя моманты не заўсёды выкарыстоўваюцца адказна і непрадузята. З недахопам вады сутыкаемся асабліва ў Афрыцы, дзе вялікая частка насельніцтва не мае доступу да чыс-тай пітной вады або церпіць з прычыны засухі, якая ўскладняе вытворчасць ежы. У некаторых краінах існуюць рэгіёны з багатымі воднымі рэсурсамі, у той час як іншыя церпяць з прычыны яе сур’ёзнага недахопу.

29. Асабліва сур’ёзнай праблемай з’яўляецца якасць даступнай вады для ўбогіх, што выклікае кожны дзень смерць многіх асобаў. Сярод убогіх распаўсю-джанымі з’яўляюцца хваробы, звязаныя з вадой, і ў тым ліку выкліканыя мікраарганізмамі і хімічнымі субстанцыямі. Дызентэрыя і халера, звязаныя з недахопам водных рэсурсаў і іх санітарным станам, з’яўляюцца важнымі прычынамі захворванняў і смяротнасці немаўлят. Водныя пласты ў многіх месцах знаходзяцца пад пагрозай забруджвання з прычыны пэўнай горназдабыўчай дзейнасці, земляробства і вытворчасці, асабліва ў краінах, дзе няма адпаведнага рэгулявання і кантролю. Маем тут на ўвазе не толькі фабрычныя сцёкі. Мыйныя сродкі і хімічныя рэчывы, якімі карыс-таюцца жыхары ў многіх частках свету, сплываюць у рэкі, азёры і моры.

30. У той час, як пастаянна пагаршаецца якасць вады, што знаходзіцца ў нашым распараджэнні, у некаторых месцах развіваецца схільнасць да прыватызацыі гэтых невялікіх рэсурсаў, якія становяцца таварам, падпарадкаваным законам рынку. На самай справе ’ , , ’ . Гэты свет мае сур’ёзны грамадскі доўг адносна ўбогіх, якія не маюць доступу да пітной вады, бо гэта , ’. Гэты доўг часткова выплачваецца праз большую фінансавую дапамогу, каб запэўніць чыстую ваду і каналізацыйныя паслугі найбяднейшым людзям. Аднак мы маем справу з марнатраўствам вады не толькі ў развітых краінах, але таксама ў менш развітых, якія маюць вялікія запасы. Гэта паказвае, што праблема вады з’яўляецца ў пэўнай ступені пытаннем выхавання і культуры, бо няма ўсведамлення важнасці належных паводзінаў у кантэксце вялікай няроўнасці.

31. Узрастанне дэфіцыту вады вядзе да росту коштаў на прадукты харчавання і іншыя прадукты, якія патрабуюць яе выкарыстання. Некаторыя даследаванні паказалі небяспеку вострага недахопу вады праз некалькі дзесяцігоддзяў, калі не будуць прынятыя неабходныя меры. Уздзеянне на навакольнае асяроддзе можа паўплываць на мільярд людзей, таму можна таксама чакаць, што кантроль над вадой вялікімі сусветнымі карпарацыямі стане галоўнай крыніцай канфліктаў гэтага стагоддзя [23] .

## III. Знішчэнне біялагічнай разнастайнасці

32. Зямельныя рэсурсы таксама рабуюцца з пры-чыны блізарукага разумення эканомікі і гандлёвай дзейнасці, а таксама вытворчасці. Страта пушчаў і лясоў вядзе адначасова да страты відаў, якія маглі б у будучыні складаць незвычайна важныя рэсурсы не толькі ежы, але таксама лячэння хваробаў і многіх паслуг. Розныя віды маюць гены, якія могуць быць ключом да заспакаення ў будучыні пэўных чалавечых патрэбаў або для рэгулявання некаторых экалагічных праблем.

33. Аднак недастаткова думаць пра розныя віды як пра магчымыя «рэсурсы», якія можна было б выкарыстоўваць, забываючы, што яны маюць каштоўнасць самі ў сабе. Штогод знікаюць тысячы відаў раслін і жывёл, якіх мы ўжо не зможам пазнаць, якіх ужо не змогуць убачыць нашя дзеці, бо яны страчаны назаўсёды. Большая колькасць гіне з прычыны пэўных людскіх дзеянняў. З-за нас тысячы відаў не будуць хваліць Бога сваім існаваннем і не будуць перадаваць нам сваю інфармацыю. Мы не маем на гэта права.

34. Напэўна непакояць нас паведамленні пра знікненне канкрэтнага віду млекакормячых або птушак, бо яны больш заўважныя. Але для правільнага функцыянавання экасістэм неабходны таксама грыбы, багавінне, насякомыя, рэптыліі і незлічонае мноства мікраарганізмаў. Некаторыя з менш шматлікіх відаў, якія звычайна з’яўляюцца незаўважнымі, выконва-юць галоўную ролю ў стабілізацыі раўнавагі дадзенага месца. Гэта

праўда, што чалавек павінен рэагаваць, калі геасістэма трапляе ў крытычны стан, але сёння ўзровень чалавечага ўмяшання ў такую складаную рэчаіснасць як прырода настолькі вялікае, што катаклізмы, выкліканыя чалавекам, вядуць да новага ўмяшання з усімі наступнымі рызыкамі. У выніку паўстае зам-кнёнае кола, дзе ўмяшанне чалавека дзеля вырашэння цяжкасцяў часта яшчэ больш пагаршае сітуацыю. Напрыклад, многія птушкі і насякомыя, якія зніклі з прычыны выкарыстання ў земляробчых тэхналогіях атрутных пестыцыдаў, былі карыснымі для сельскай гаспадаркі. Іх знікненне трэба кампенсаваць іншым тэхналагічным умяшаннем, якое, напэўна, прывядзе да новых шкодных вынікаў. Годнымі прызнання, а часам захаплення з'яўляюцца намаганні навукоўцаў і тэхнікаў, якія імкнуцца вырашыць праблемы, створаныя чалавекам. Аднак, назіраючы за светам, мы заўважаем, што гэты ўзровень умяшання чалавека, якое часта служыць інтарэсам фінансавых асяродкаў і спажывецтву, фактычна прычыняецца да таго, што зямля, на якой мы жывем, становіцца менш багатай і прыгожай, і штораз больш абмежаванай і шэрай, у той час як развіццё тэхналогій і прапаноў спажывання няспынна і нястрымана ідзе наперад. Таму нам здаецца, што мы можам замяніць прыгажосць – незамянімую і незваротную – іншай прыгажосцю, створанай намі.

35. Калі аналізуем уздзеянне нейкай гаспадарчай ініцыятывы на навакольнае асяроддзе, то зазвычай разважаем пра яго ўплыў на глебу, ваду і паветра, але не заўсёды спалучаецца гэта са старанным вывучэннем уплыву на біялагічную разнастайнасць, нібы страта пэўных відаў або груп жывёлаў і раслін не мае вялікага значэння. Дарогі, новыя культуры, агароджы, водныя рэзервуары дзеляць участкі такім чынам, што папуляцыі жывёлаў не могуць ужо міграваць або свабодна перамяшчацца, што вядзе да пагрозы вымірання некаторых відаў. Існуюць альтэрнатывы, якія, прынамсі, лагодзяць вынікі гэтых дзеянняў, як, напрыклад, стварэнне біялагічных калідораў, аднак мы сутыкаемся з такім клопатам і ўважлівасцю ў не-шматлікіх краінах. Калі некаторыя віды выкарыстоў-ваюцца ў камерцыйных мэтах, то не заўсёды вывучаецца іх спосаб развіцця з мэтаю пазбегнуць іх празмернага змяншэння, а таксама парушэння раўнавагі экасістэмы, якое з гэтага вынікае.

36. Клопат пра экасістэмы патрабуе выйсця па-за тое, што кароткачасовае, бо калі мы імкнемся толькі да хуткага і лёгкага фінансавага прыбытку, то нікога на самай справе не цікавіць іх захаванне. Аднак кошты шкодаў, выкліканых эгаістычным занядбаннем, знач-на большыя, чым магчымыя эканамічныя выгады. У выпадку страты або сур'ёзных шкодаў, прычыненых некаторым відам, мы кажам пра каштоўнасці, якія значна пераўзыходзяць усялякі прыбытак. Таму мы можам быць маўклівымі сведкамі сур'ёзнай несправядлівасці пры спробе атрымаць істотныя выгады, загадваючы плаціць рэшце чалавецтва, сёння і ў будучым, вялізныя кошты, што вынікаюць з дэградацыі навакольнага асяроддзя.

37. Некаторыя краіны дасягнулі прагрэсу ў эфектыўнай абароне канкрэтных месц і тэрыторый, на сушы і ў акіяне, дзе забаронена ўсялякае ўмяшанне чалавека, якое б магло змяніць іх выгляд або мадыфі-каваць іх арыгінальную структуру. Клапоцячыся пра

біялагічную разнастайнасць, эксперты падкрэсліва-юць неабходнасць звярнуць асаблівую ўвагу на найбагацейшыя на розныя віды тэрыторыі, на эндэмічныя віды, якія недастаткова ахоўваюцца. Існуюць месцы, якія патрабуюць асаблівага клопату з увагі на іх вялікае значэнне для глабальнай экасістэмы, багатыя на розныя формы жыцця, дзе знаходзяцца значныя запасы вады.

38. Згадаем, напрыклад, якімі лёгкімі планеты, поўнымі біялагічнай разнастайнасці, з’яўляецца Амазонія, басейн Конга ці вялікія ваданосныя жылы і леднікі. Нам добра вядомае значэнне гэтых месц для ўсёй планеты і для будучага чалавецтва. Экасістэмы трапічных лясоў маюць складаную біяразнастайнасць, амаль недаступную для поўнага пазнання, але, калі гэтыя лясы выпальваюцца і карчуюцца дзеля павелічэння ворных зямель, то на працягу некалькіх гадоў гіне шмат відаў. Тое самае дзеецца тады, калі гэтыя землі ператвараюцца ў бясплодныя пустыні. Несумненна, калі мы кажам пра гэтыя месцы, неабходна вялікая раўнавага, бо нельга ігнараваць вялізныя міжнарод--ныя гаспадарчыя інтарэсы, якія пад выглядам клопату пра гэтыя абшары могуць пагражаць нацыянальнай незалежнасці. Існуюць «прапановы інтэрнацыяналізацыі Амазоніі, якія служаць толькі гаспадарчым інта-рэсам наднацыянальных карпарацый» [24] . Заслугоўвае пахвалы высілак міжнародных і грамадскіх арганізацый, якія звяртаюць увагу жыхароў, што карыстаюцца таксама механізмамі ўздзеяння, дазволенымі законам, каб кожны ўрад выконваў свой неад’емны абавязак абароны навакольнага асяроддзя і натуральных рэсурсаў сваёй краіны, не ідучы за ілжывымі мясцовымі ці міжнароднымі інтарэсамі.

39. Не з’яўляецца таксама прадметам адпаведнага аналізу замена дзікай флоры ляснымі насаджэннямі, якія звычайна ўтвараюць монакультуры. На самай справе гэты працэс можа прынесці шкоду біялагічнай разнастайнасці, якая знікае. Таксама водна-балотныя абшары, якія ператвараюцца ў сельскагаспадарчыя землі, губляюць існуючую там раней вялізную біяразнастайнасць. У некаторых прыбярэжных раёнах непакоіць тое, што знікаюць экасістэмы, якімі з’яўляюцца мангравыя зараснікі.

40. Акеаны змяшчаюць не толькі большасць вады нашай планеты, але таксама большасць разнастайных жывых істот, многіх з якіх мы яшчэ не ведаем і якія з розных прычын знаходзяцца пад пагрозай. З другога боку, жыццё ў рэках, азёрах, марах і акеанах, якія даюць ежу многім людзям на свеце, парушае некан-траляваная здабыча рыбы, што выклікае рэзкае скарачэнне некаторых відаў. Надалей развіваюцца селектыўныя метады промыслу, якія марнуюць шмат сабраных відаў. Асаблівай рызыцы падвяргаюцца марскія арганізмы, якія не бяруцца пад увагу, як, напрыклад, некаторыя формы , які з’яўляецца вельмі важным элементам марскога харчовага ланцуга і ад якога залежаць у выніку віды, што выкарыстоўваюцца для харчавання людзей.

41. У сваю чаргу ў трапічных і субтрапічных морах сустракаем каралавыя рыфы, якія з’яўляюцца адпаведнікамі вялікіх мацерыковых лясоў, таму што змяшчаюць каля мільёна

відаў, у тым ліку рыб, крабаў, малюскаў, губак, багавіння і інш. Многія каралавыя рыфы на свеце сёння ўжо бясплодныя або іх стан пастаянна пагаршаецца: «Хто ж ператварыў цудоўны свет мораў у падводныя могілкі, пазбаўленыя колераў і жыцця?» [25] . Гэтая з’ява ў вялікай ступені выклікана забруджваннем, якое дасягае мора ў выніку абязлесення, сельскагаспадарчых монакультур, прамысловых выкідаў і дэструктыўных метадаў промыслу, асабліва з выкарыстаннем цыяніду і дынаміту. Узмацняе шкоду таксама ўзрастанне тэмпературы акеанаў. Усё гэта дазваляе нам заўважыць, як розныя формы дзейнасці ў прыродзе могуць мець вынікі, якіх мы не бачым няўзброеным вокам, а таксама, што некторыя формы эксплуатацыі рэсурсаў выклікаюць дэградацыю, якая ў выніку даходзіць да дна акеанаў.

42. Мы павінны значна больш інвеставаць у даследаванні, каб лепш зразумець захаванне экасістэм і адпаведна аналізаваць розныя працэсы, якія ўплываюць на істотныя змены ў навакольным асяроддзі. Паколькі ўсе стварэнні ўзаемазвязаны, кожнае з іх павінна ацэньвацца з любоўю і захапленнем, бо мы ўсе, створаныя істоты, патрэбныя адно аднаму. Кожная краіна адказвае за клопат аб гэтай сям’і, таму павінна здзей-сніць дакладную інвентарызацыю існуючых відаў з мэтаю апрацавання праграм і стратэгій абароны, асабліва аб тых, якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення.

## IV. Пагаршэнне якасці жыцця і сацыяльны калапс

43. Калі возьмем пад увагу тое, што чалавек з’яўляецца стварэннем, якое мае права на жыццё і шчасце ў гэтым свеце, які адораны таксама асаблівай годнасцю, то нельга не браць пад увагу вынікаў дэградацыі навакольнага асяроддзя, актуальнай мадэлі развіцця і культуры адмаўлення ў жыцці асобаў.

44. Сёння мы заўважаем, напрыклад, безкантрольны і празмерны рост многіх гарадоў, у якіх жыццё стала нездаровым не толькі з прычыны забруджвання таксічнымі выкідамі, але і з прычыны гарадскога хаосу, транспартных праблем, а таксама візуальнага і шумавога ўздзеяння. Многія гарады — гэта вялікія неэфектыўныя структуры, якія спажываюць занадта шмат энергіі і вады. Існуюць раёны, якія, хоць і былі нядаўна пабудаваныя, засмечваюцца і становяцца няўтульнымі без дастатковых зялёных зон. Гэта няправільна, што жыхары нашай планеты жывуць, усё больш прыгнечаныя бетонам, асфальтам, шклом і металам, пазбаўленыя фізічнага кантакту з прыродай.

45. У некаторых вясковых і гарадскіх ваколіцах прыватызацыя прасторы ўскладняе доступ грама-дзянаў да абшараў з асаблівай прыгажосцю, а дзесьці створаны «экалагічныя» мікрараёны для выбраных, куды забараняецца ўваход іншым, каб яны не парушалі штучнага спакою. Часта сустракаем прыгожыя зялёныя насаджэнні ў добра дагледжаных і

ахоўваемых раёнах, але радзей — у месцах, дзе жывуць адкінутыя грамадствам людзі.

46. Да сацыяльных вынікаў глабальных пераменаў адносяцца наступствы некаторых тэхналагічных інавацый для рынку працы, сацыяльная ізаляцыя, няроўнасць у доступе і карыстанні энергіяй, а таксама іншыя паслугі, сацыяльныя адрозненні, узрост насілля і з’яўленне новых формаў сацыяльнай агрэсіі, гандаль наркотыкамі і іх пашырэнне сярод моладзі, а таксама страта ідэнтычнасці. Гэта знакі, якія між іншым паказваюць, што развіццё на працягу апошніх двух стагоддзяў не азначае ўсебаковага сапраўднага інтэгральнага прагрэсу і паляпшэння якасці жыцця. Некаторыя з гэтых рысаў з’яўляюцца адначасова праявамі сапраўднай сацыяльнай дэградацыі, маўклівага разрыву інтэграцыйных сувязяў і сацыяльнай еднасці.

47. Да гэтага далучаецца дынаміка СМІ і лічбавага свету, калі яна становіцца ўсюдыіснай і не спрыяе развіццю здольнасцяў да мудрага жыцця, глыбокага мыслення, велікадушнай любові. Вялікім мудрацам мінулага пагражала б у гэтым кантэксце тое, што яны стануць сведкамі таго, як іх мудрасць прыглушаецца інфармацыйным шумам, які адцягвае ўвагу. Неабход-ны высілакператварыць гэтыя сродкі ў імпульс новага культурнага развіцця чалавецтва, а не дэградацыяй яго найглыбейшага багацця. Сапраўднай мудрасці, плёну разважання, дыялогу і велікадушных сустрэч паміж людзьмі нельга дасягнуць толькі шляхам збірання дадзеных, бо вядзе гэта да перанасычэння і разгубленасці ў выглядзе псіхічных парушэнняў. Адначасова існуе тэндэнцыя замены рэальных адносінаў з іншымі і з усімі звязанымі з імі праблемамі пэўным тыпам камунікацыі праз Інтэрнэт. Гэта дазваляе выбраць або спыніць адносіны паводле нашага меркавання. Такім чынам нараджаецца новы тып штучных эмоцый, якія маюць больш агульнага з прыладамі і экранамі, чым з асобамі і прыродай. Сённяшнія сродкі дазваляюць нам мець зносіны, каб абменьвацца ведамі і пачуццямі. Але часам яны перашкаджаюць нам непасрэдна адчуць неспакой, шок, радасць бліжняга, а таксама складанасць яго асабістага досведу. Таму не павінна нас здзіўляць, што пад ціскам гэтых прадуктаў узрастае глыбокая меланхолія і незадаволенасць у міжасабо-вых адносінах, або таксама небяспечная ізаляцыя.

## V. Глабальная несправядлівасць

48. Працэсы дэградацыі асяроддзя пражывання чалавека і прыроднага асяроддзя адбываюцца адначасова, і мы не зможам з імі справіцца, калі не звернем увагу на прычыны, звязаныя з дэградацыяй чалавека і грамадства. Па сутнасці дэградацыя навакольнага асяроддзя і дэградацыя грамадства наносяць асаблівую шкоду найслабейшым жыхарам планеты: «як супольны досвед штодзённага жыцця, так і навуковыя даследванні паказваюць, што самыя сур’ёзныя вынікі ўсіх злачынстваў супраць навакольнага асяроддзя зазнаюць найбяднейшыя людзі» [26] . Напрыклад, змяншэнне рыбных запасаў прыносіць

шкоду асабліва тым, хто ўтрымліваецца за кошт традыцыйнага рыбалоўства, хто не мае іншых сродкаў для існавання. Забруджванне вады асабліва закранае найбяднейшых, якія не могуць дазволіць сабе купляць пітную ваду ў бутэльках. Павышэнне ўзроўню мора шкодзіць галоўным чынам збяднеламу насельніцтву, што жыве на беразе мора, якое не мае куды перасяліцца. Сённяшняя несправядлівасць найбольш бачная ў заўчаснай смерці многіх бедных, у канфліктах, выкліканых недахопам рэсурсаў, і ў многіх іншых праблемах, якім не адводзіцца дастаткова месца ў праграмах сусветных інстытутаў [27] .

49. Хацеў бы падкрэсліць, што часта няма выразнага ўсведамлення прабем, якія асабліва ўздзейнічаюць на людзей адкінутых. А гэта большасць жыхароў планеты, гэта мільярды людзей. Сёння згадваюць пра іх у міжнародных палітычных і гаспадарчых дэбатах, аднак усё часцей здаецца, што іх праблемы разглядаюцца як дадатаковае пытанне, якое закранаецца амаль з абавязку або ўскосна, калі ўвогуле гэтыя праблемы не ацэньваюцца як звычайны «негатыўны пабочны эфект». На самай справе, калі даходзіць да канкрэтных дзеянняў, яны часта застаюцца на апошнім месцы. Часткова гэта вынікае з таго, што розныя спецыялісты, лідэры грамадскай думкі, сродкі масавай інфармацыі і асяродкі ўлады знаходзяцца далёка ад іх, у ізаляваных гарадскіх раёнах, не маючы непасрэднага кантакту з іх праблемамі. Яны жывуць і думаюць у выгодных умовах, недаступных для большай часткі жыхароў свету. Гэты недахоп фізічнага кантакту і спаткання, якому часам спадарожнічае дэзінтэграцыя нашых гарадоў, знячуленне сумлення і ігнараванне часткі рэчаіснасці ў прадузятым аналізаванні. Часам гэта суіснуе з экалагічнай рыторыкай. Аднак сёння мы не можам пагадзіцца з тым, што , які прадугледжвае справядлівасць у дыскусіях пра навакольнае асярод--дзе, каб пачуць , .

50. Замест таго, каб вырашаць праблемы ўбогіх і думаць пра іншы свет, некаторыя жадаюць толькі прапанаваць абмежаванне нараджальнасці. Існуе таксама міжнародны ціск на краіны, якія развіваюцца, праз залежнасць эканамічнай дапамогі ад выкарыстання канкрэтнай палітыкі «рэпрадуктыўнага здароўя». Але, «калі праўда, што нераўнамернае размяшчэнне насельніцтва і даступных рэсурсаў стварае перашкоду для развіцця і адпаведнага выкарыстання навакольнага асяроддзя, то трэба прызнаць, што дэмаграфічны рост цалкам сумяшчальны з інтэгральным і салідарным развіццём» [28] . Абвінавачванні дэмаграфічнага росту, а не празмернага і селектыў-нага спажывецтва, – гэта ўцёкі ад вырашэння праблем. Такім чынам імкнуцца апраўдаць існуючую мадэль размеркавання дабротаў, у якой меншасць лічыць, што мае права спажываць у такой прапорцыі, якой нельга было б распаўсюджваць, бо планета не была б нават у стане змясціць адходаў такога спажывання. Мы ведаем таксама, што марнуецца амаль траціна вырабаў прадуктаў харчавання, а «ежа, якая выкідваецца, з’яўляецца ў нейкай ступені ежай, скрадзенай са стала ўбогіх» [29] . Аднак няма сумнення, што мы павінны звярнуць увагу на адсутнасць раўнавагі ў размеркаванні насельніцтва на пэўнай тэрыторыі, як на нацыянальным узроўні, так і на сусветным, бо рост спажывання можа прывесці да складанай рэгіянальнай сітуацыі з увагі на сукупнасць праблем, звязаных з забруджваннем навакольнага асяроддзя, транспартам, перапрацоўкай

адходаў, са стратай сыравіны ці якасцю жыцця.

51. Няроўнасць уплывае не толькі на адзінкі, але таксама на цэлыя краіны і змушае думаць пра этыку міжнародных адносінаў. Бо існуе сапраўдны «экалагічны доўг», асабліва паміж Поўначчу і Поўднем, звязаны з наступствамі ў галіне экалогіі – дысбалансам гандлю, а таксама з непрапарцыянальным выкарыстаннем натуральных рэсурсаў, што мела месца ў гісторыі некаторых краін. Экспарт некаторых відаў сыравіны для задавальнення прамысловага рынку Поўначы выклі-каў такія лакальныя шкоды, як забруджванне ртуццю пры здабычы золата або дыяксіду серы ў медных рудніках. Вельмі важна падлічыць экалагічную прастору на ўсёй планеце, якую займаюць газавыя выкіды, назапашаныя на працягу двух стагоддзяў, што стварыла сітуацыю, якая сёння ўплывае на ўсе краіны свету. Пацяпленне, выкліканае велізарным спажываннем некаторых багатых краінаў, мае свае наступствы ў самых бедных месцах зямлі, асабліва ў Афрыцы, дзе павышэнне тэмпературы ў спалучэнні з засухай мае катастрафічныя наступствы для ўраджайнасці. Да-лучаюцца да гэтага шкоды, выкліканыя экспартам у краіны, якія развіваюцца, таксічных цвёрдых і вадкіх адходаў, а таксама забруджвальная дзейнасць фірм, якія ў менш развітых краінах робяць тое, чаго не могуць рабіць у краінах, ад якіх залежыць іх капітал: «Мы сцвярджаем, што фірмы, якія часта так робяць, маюць шматнацыянальны характар, таму робяць тут тое, чаго ім нельга рабіць у развітых краінах або ў гэтак званым Першым Свеце. Звычайна, калі яны спыняюць сваю дзейнасць, то пакідаюць пасля сябе вялікую экалагічную шкоду і шкоду для чалавека: беспрацоўе, мёртвыя вёскі, вычарпаныя некаторыя прыродныя рэсурсы, абязлесенне, збядненне мясцовай сельскай гаспадаркі, кар'еры, спустошаныя пагоркі, забруджаныя рэкі і грамадскія працы, якіх немагчыма ўжо больш падтрымліваць» [30] .

52. Знешняя запазычанасць бедных краін стала інструментам кантролю над імі, але яна не звязваецца з экалагічным доўгам. Розным чынам краіны, якія развіваюцца і ў якіх знаходзяцца найбольш важныя біясферныя запаведнікі, працягваюць развіваць найбагацейшыя краіны за кошт сваёй сучаснасці і будучыні. Зямля бедных Поўдня багатая і амаль несапсаваная, але яны не маюць доступу да дабротаў і рэсурсаў, каб задаволіць свае асноўных патрэбы з прычыны структурна нягоднай сістэмы гандлёвых адносінаў і ўласнасці. Неабходна, каб развітыя краіны прычыніліся да ўрэгулявання гэтага доўгу, значна абмяжоўваючы выкарыстанне неўзнаўляльнай энергіі і прадстаўляючы сродкі найбольш патрабуючым краінам, каб спрыяць пашырэнню мерапрыемстваў і праграм дзеля ўстойлівага развіцця. Найбяднейшыя рэгіёны і краіны маюць меншыя мгчымасці ў прыняц-ці новых мадэляў змяншэння ўздзеяння на навакольнае асяроддзе, бо ім не хапае адпаведнай падрыхтоўкі ў выпрацоўцы неабходных працэдур і яны не могуць пакрыць свае выдаткі. Таму трэба дакладана разумець, што ў пытанні змены клімату мы маем справу , і як сказалі біскупы ЗША, было б мэтазгодным засяродзіць увагу «асабліва на патрэбах бедных, слабых і безабаронных, у дыскусіях, дзе дамінуюць магутныя інтарэсы» [31] . Мы павінны добра ўсведамляць, што з'яўляемся адной чалавечай сям'ёй. Няма ні палітычных, ні сацыяльных бар'ераў, якія даз-валяюць нам ізалявацца, і менавіта таму няма месца для глабальнай

абыякавасці.

## VI. Слабасць рэакцыі

53. Такія сітуацыі выклікаюць стогны сястрыцы-зямлі, якія лучацца са стогнамі адкінутых светам, са скаргай, якая патрабуе ад нас іншага шляху. Мы ніколі так дрэнна не адносіліся і так не калечылі нашага супольнага дому, як гэта было зроблена пра працягу апошніх двух стагоддзяў. А мы пакліканы быць прыладамі Бога Айца, каб наша планета была такой, як марыў Ён, ствараючы яе, і каб яна адказвала на Яго праект спакою, прыгажосці і паўнаты. Праблема заключаецца ў тым, што мы не маем яшчэ неабходнай культуры, каб справіцца з гэтым крызісам, і неабходна стварэнне лідэрства, якое б паказала шляхі, спрабуючы рэагаваць на патрэбы цяперашніх пакаленняў, разам з усімі, без шкоды для будучых пакаленняў. Таму неабходна стварыць нарматыўную сістэму з непарушнымі абмежаваннямі, якая б гарантавала ахову экасістэм, перш чым новыя формы ўлады, што пахо-дзяць з тэхнічна-эканамічнай парадыгмы, прывядуць да знішчэння не толькі палітыкі, але таксама свабоды і справядлівасці.

54. Варта адзначыць слабасць рэакцыі міжнароднай палітыкі. Наколькі моцна палітыка падпарадка--вана тэхналогіі і фінансам бачна ў непаспяховасці сусветных самітаў на тэму навакольнага асяроддзя. Зашмат існуе прыватных інтарэсаў, і вельмі лёгка эканамічныя інтарэсы пераважаюць над агульным дабром праз маніпуляцыю інфармацыяй, каб не пацярпелі ўласныя праекты. Згодна з  патрабуецца, каб «у зменах, што датычаць прыродных рэсурсаў, не пераважалі інтарэсы эканамічных груп, якія ірацыянальна спусташаюць крыніцы жыцця» [32] . Саюз паміж эканомікай і тэхнало-гіяй вядзе да адасаблення ад усяго, што не нале-жыць да іх непасрэдных інтарэсаў. Гэтым абумоўлена не-шматлікасць павярхоўных ініцыятыў, паасобных да-бра-чынных дзеянняў, а нават высілкаў, каб паказаць увагу да навакольнага асяроддзя, хоць на самай справе ўсялякія спробы грамадскіх арганізацый змяніць стан рэчаў будуць разглядацца як неспакой, які выклікаюць рамантычныя летуценнікі, або як перашкода, якую трэба абысці.

55. Часткова некаторыя краіны могуць прадэман-страваць значны прагрэс, развіццё больш эфектыўнага кантролю і больш шчырую барацьбу з карупцыяй. Існуе вялікая экалагічная зацікаўленасць насельніцтва, але яе недастаткова для таго, каб змяніць шкодныя звычкі спажывецтва, якія, здаецца, не ўступаюць, але актывізуюцца і развіваюцца. У якасці простага прыкладу можна прывесці павелічэнне выкарыстання і інтэнсіўнасці кандыцыянераў. Рынкі, імкнучыся да хуткага прыбытку, яшчэ больш стымулююць попыт. Калі б хтосьці глядзеў звонку на глабальнае грамадства, то здзівіўся б такім паводзінам, якія часам здаюцца самагубствам.

56. У той жа час, буйныя гаспадарчыя дзяржавы надалей апраўдваюць цяперашнюю сусветную сістэ-му, у якой пераважаюць спекуляцыя і імкненне да фінансавай выгады, гатовыя ігнараваць усялякі кантэкст, а таксама наступствы для чалавечай годнасці і для навакольнага асяроддзя. Такім чынам дэградацыя прыроднага і чалавечага асяроддзя, а таксама этычная дэградацыя цесна звязаны паміж сабою. Многія скажуць, што не маюць намеру рабіць маральна дрэнныя дзеянні, бо пастаяннае разбурэнне адымае ў нас адвагу зразумець рэчаіснасць абмежаванага і неўзнаўляльнага свету. Таму сёння «ўсё крохкае, як, напрыклад, прыроднае асяроддзе, застаецца безабаронным перад інтарэсамі абагаўлёнага рынку, якія становяцца адзіным правілам» [33] .

57. Можна прадбачыць, што выпадкі вычарпання некаторых рэсурсаў могуць стаць апраўданнем новых войнаў, замаскіраваных высакароднымі памкненнямі. Вайна заўсёды прыносіць сур’ёзную шкоду прыроднаму асяроддзю і культурнаму багаццю народаў, і па-гроза ўзрастае, калі згадаем пра ядзерную энергію і біялагічную зброю. Бо «нягледзячы на міжнардныя пагадненні, якія забараняюць хімічную, бактэрыялагічную і біялагічную зброю, у лабараторыях трываюць працы па даследаванні новых відаў зброі, якія могуць парушыць натуральны баланс» [34] . Ад палітыкі патрабуецца больш намаганняў для прадухілення і ліквідацыі прычын, якія могуць прывесці да новых канфліктаў. Аднак гэтым дзеяннем найбольш супраціўляецца менавіта ўлада, звязаная з фінансамі, а палітычныя праекты часта недальнабачныя. Чаму сёння намагаюцца захаваць уладу, якая не была ў стане ўмяшацца, калі гэта было тэрміновым і неабходным?

58. У некаторых краінах існуюць станоўчыя прыклады паляпшэння стану навакольнага асяроддзя: ачышчэнне рэк, якія забруджваліся дзесяцігоддзямі; рэкультывацыя родных лясоў; упрыгожванне краявідаў праз ачышчэнне навакольнага асяроддзя ці будаўнічыя праекты з высокай эстэтычнай каштоўнасцю; выкарыстанне ў вытворчасці чыстай энергіі; удасканаленне грамадскага транспарту. Гэтыя дзеянні не вырашаюць глабальных праблем, але пацвярджаюць тое, што чалавек усё яшчэ ў стане аказ-ваць станоўчы ўплыў. Чалавек створаны для любові, са сваімі абмежаваннямі, заўсёды здольны да жэстаў велікадушнасці, салідарнасці і клопату.

59. Адначасова развіваецца павярхоўная, або ўяўная, экалогія, якая ўмацоўвае пэўную пасіўнасць і бяздумную безадказнасць. Як гэта часта здараецца ў часы глыбокага крызісу, які патрабуе цяжкага выбару, мы схільныя думаць, што тое, што адбываецца, не з’яўляецца настолькі сур’ёзным. Калі глядзім павярхоўна, ігнаруючы некаторыя бачныя прыкметы забруджвання і дэградацыі, то здаецца, што сітуацыя не настолькі сур’ёзная і што планета магла б на пра-цягу доўгага часу трываць у дадзеных умовах. Такія хітрыя паводзіны дапамагаюць нам захоўваць наш стыль жыцця, вытворчасці і спажывання. Гэта спосаб, праз які чалавек дапамагае сабе захоўваць усе недахопы самаразбурэння: стараецца іх не бачыць, змагаецца, каб іх не прызнаць, адкладаючы важныя рашэнні, робячы выгляд, што нічога не сталася.

## VII. Разнастайнасць меркаванняў

60. Урэшце, мы прызнаем, што паўсталі розныя бачанні і спосабы мыслення аб сітуацыі і магчымых вырашэннях. З аднаго боку, некаторыя любым коштам падтрымліваюць міф аб прагрэсе і сцвярджаюць, што праблемы навакольнага асяроддзя проста вырашацца ў выніку прымянення новых тэхнік без этычных разважанняў і глыбокіх зменаў. З другога боку, іншыя сцвярджаюць, што чалавецтва, з усімі яго ўмяшаннямі, можа ствараць толькі пагрозу і шкоду глабальнай экасістэме, таму трэба абмежаваць яго прысутнасць на планеце і стрымаць яго ад якога-небудзь умяшання. Дыскусія паміж гэтымі скрайнасцямі павінна вызначыць будучы сцэнарый, бо няма адзінага шляху вырашэння праблем. Гэта стварыла б прастору для розных ініцыятыў, якія праз дыялог маглі б даць комплексных адказаў.

61. Па многіх канкрэтных пытаннях Касцёл не мае падстаў прапаноўваць канчатковае рашэнне і разумее, што павінен слухаць і садзейнічаць справядлівым дэбатам сярод навукоўцаў, паважаючы плюралізм меркаванняў. Аднак дастаткова сумленна паглядзець на рэчаіснасць, каб убачыць, што мае месца вялікая дэградацыя нашага супольнага дому. Надзея заахвочвае нас прызнаць, што заўсёды ёсць выйсце, што заўсёды мы можам змяніць курс, што заўсёды можам штосьці зрабіць для вырашэння праблемаў. Тым не менш, ёсць бачныя прыкметы вяртання да зваротнай кропкі з увагі на хуткасць зменаў і дэградацыю, якія выяўляюцца як у рэгіянальных стыхійных бедствах, так і ў грамадскім крызісе, а нават фінансавым, улічваючы тое, што праблемы свету нельга аналізаваць і тлумачыць адасоблена. Існуюць рэгіёны, якія ўжо падвяргаюцца асаблівай рызыцы, і, нават не беручы пад увагу ўсялякія катастрафічныя прагнозы, няма сумнення, што цяперашняя сусветная сістэма з featuresзнага пункту гледжання непрымальная таму, што мы перасталі думаць аб мэце дзейнасці чалавека: «Калі прыгледзімся да розных рэгіёнаў нашай планеты, зразумеем, што чалавецтва не апраўдала чаканняў Бога» [35] .

# РАЗДЗЕЛ ДРУГІ

# ЕВАНГЕЛЛЕ СТВАРЭННЯ

62. Чаму ў гэтым дакуменце, скіраваным да ўсіх людзей добрай волі, ёсць раздзел аб перакананнях вернікаў? Я разумею, што ў сферы палітыкі і мыслення некаторыя рашуча не прымаюць ідэю Стварыцеля або лічаць яе неістотнай настолькі, што як ірацыянальнае расцэньваюць багацце, якое рэлігіі могуць прыўнесці на карысць інтэгральнай экалогіі, а

таксама на ка-рысць цэласнага развіцця чалавецтва. У іншых выпадках мяркуецца, што яны ствараюць субкультуру, якая проста павінна талеравацца. Аднак навука і рэлігія, якія маюць розны падыход да рэчаіснасці, могуць весці інтэнсіўны дыялог, плённы для абодвух бакоў.

## I. Святло, якое дае вера

63. Зважаючы на складанасць экалагічнага крызісу і яго многія прычыны, мы павінны прызнаць, што нейкі адзін толькі спосаб інтэрпрэтацыі і перамянення рэчаіснасці не прыносіць вырашэння. Неабходны таксама зварот да разнастайнага культурнага багацця народаў, да мастацтва і паэзіі, да ўнутранага жыцця і духоўнасці. Калі мы сапраўды хочам будаваць экалогію, якая дазволіць нам выправіць усё, што мы знішчылі, то нельга абмінуць аніякую вобласць навукі і мудрасці, у тым ліку рэлігійнай, з яе спецыфічнай мовай. Больш за тое, Каталіцкі Касцёл адкрыты на дыялог з філасофскай думкай, а гэта дазваляе яму ствараць адметны сінтэз веры і розуму. Адносна сацыяльных пытанняў можна заўважыць гэта ў развіцці сацыяльнага вучэння Касцёла, якое, у адказ на новыя выклікі, павінна штораз больш узбагачацца.

64. Больш за тое, хоць гэтая энцыкліка ў пошуку шляхоў вызвалення адкрытая на дыялог з усімі, хачу паказаць з самага пачатку, якім чынам перакананні веры даюць хрысціянам, а таксакма і іншым веруючым людзям выдатныя матывацыі для клопату аб прыродзе і аб самых слабых братах і сёстрах. Калі сам факт быцця чалавекам абуджае людзей да аховы навакольнага асяроддзя, часткай якога яны з’яўляюцца, то «хрысціяне лічаць сваю адказнасць унутраным ладам стварэння, а свае абавязкі адносна прыроды і Стварыцеля элементам сваёй веры» [36] . Таму тое, што мы, веруючыя людзі, лепш распазнаём абавязацельствы адносна прыроднага асяроддзя, якія вынікаюць з нашых перакананяў, з’яўляецца дабром для чалавецтва і для свету.

## II. Мудрасць біблійных апісанняў

65. Не паўтараючы тут усёй тэалогіі аб стварэнні, мы задаем пытанне: што вялікія біблійныя апісанні кажуць нам пра адносіны паміж чалавекам і светам. У першым апісанні стварэння ў кнізе Быцця Божы план ахоплівае стварэнне чалавецтва. Пасля стварэння мужчыны і жанчыны гаворыцца, што «ўбачыў Бог усё, што Ён стварыў; і было яно вельмі добрым» ( 1, 31). Біблія вучыць, што кожны чалавек створаны з любові, учынены на вобраз і падабенства Божае (пар.  1, 26). Гэтае сцвярджэнне паказвае нам вялізную годнасць кожнай чалавечай асобы, якая «не з’яўляецца толькі чымсьці, але кімсьці. Яна здольная пазнаваць сябе, панаваць над сабою, дабравольна прысвячаць сябе, а таксама ствараць супольнасць з

іншымі асобамі»[37]. Святы Ян Павел II нагадаў, што асаблівая любоў Стварыцеля да кожнай чалавечай істоты «адорвае яе бясконцай годнасцю»[38]. Тыя, хто ўдзельнічае ў абароне годнасці асобаў, могуць знайсці ў хрысціянскай веры глыбокія матывы для сваёй дзейнасці. Якім выдатным ёсць перакананне, што жыццё кожнай асобы не губляецца ў безнадзейным хаосе, у свеце, кірава-ным чыстай выпадковасцю або ў паўтарэнні бессэнсоўных цыклаў! Стварыцель можа сказаць кожнаму з нас: «Раней, чым сфармаваў цябе ва ўлонні, Я пазнаў цябе» ( 1, 5). Мы былі зачатыя ў сэрцы Бога, і таму «кожны з нас з’яўляецца плёнам Божай думкі. Кожны з нас жаданы, кожны каханы, кожны патрэбны»[39].

66. Апісанні стварэння ў кнізе Быцця маюць у сваёй сімвалічнай і наратыўнай мове глыбокае вучэнне пра чалавечае існаванне і яго гістарычную рэчаіс-насць. Яны кажуць, што чалавечая экзістэнцыя грунтуецца на трох асноўных тыпах адносінаў, звязаных паміж сабою: на адносінах з Богам, з іншымі людзьмі і з зямлёй. Паводле Бібліі гэтыя тры істотныя тыпы адносінаў былі разарваныя не толькі знешне, але таксама ў нас саміх. Прычына гэтага разрыву — грэх. Гармонія паміж Стварыцелем, чалавецтвам і ўсім стварэннем была знішчана, бо чалавек хацеў заняць месца Бога, не жадаючы прызнаць сябе абмежаваным стварэннем. Гэты факт сказіў таксама сутнасць наказу валодання зямлёй (пар. 1, 28), а таксама наказу працаваць на ёй і даглядаць яе (пар. 2, 15). У выніку першасная гармонія адносінаў чалавека і прыроды ператварылася ў канфлікт (пар. 3, 17-19). Такім чынам, важна адзначыць, што гармонія святога Францішка Асізскага з усім стварэннем разумелася як выпраўленне гэтага разрыву. Святы Банавентура сказаў, што «праз паўсюднае паяднанне з усім стварэннем» Францішак пэўным чынам «вярнуўся да стану нявіннасці»[40]. Паколькі нам далёка да гэтага ўзору, грэх выяўляецца сёння ва ўсёй сваёй знішчальнай моцы ў войнах, розных формах насілля і здзекаў, у занядбанні самых слабых і ў знішчэнні прыроды.

67. Мы не з’яўляемся Богам. Зямля існавала раней за нас і была дадзена нам. Гэта дазваляе даць адказ на абвінавачванні ў адрас юдэахрысціянскай думкі: гаворыцца, што паколькі апісанне кнігі Быцця заахвочвае нас «валодаць» зямлёй ( 1, 28), то гэта азначае бязлітасную эксплуатацыю прыроды і прадстаўляе вобраз чалавека, які дамінуе і разбурае. Гэтая памылковая інтэрпрэтацыя Бібліі супярэчыць таму, як разумее яе Касцёл. Хоць гэта і праўда, што часам хрысціяне памылкова інтэрпрэтавалі Святое Пісанне, сёння мы павінны рашуча сцвердзіць, што, будучы створанымі на Божы вобраз і маючы наказ валодання зямлёй, мы не можам казаць пра абсалютнае панаванне над іншымі стварэннямі. Важна разумець біблійныя тэксты ў іх кантэксце, паводле правільнай герменэўтыкі, і памятаць, што яны заахвочваюць нас працаваць у садзе свету і даглядаць яго (пар. 2, 15). Пры гэтым выраз «працаваць» азначае ўзворванне і культывацыю, а выраз «даглядаць» азначае абарону, ахову, захаванне, беражлівыя адносіны і чуванне. Гэта вядзе да адносін узаемнай адказнасці чалавека і прыроды. Кожная супольнасць можа ўзяць з дабротаў зямлі тое, што неабходна для існавання, але мае таксама абавязак ахоўваць яе і клапаціцца, каб яна заставалася плоднай для будучых пакаленняў. Бо ў канчатковым рахунку «Пану належыць

зямля» (пар. 24, 1), Яму належыць «зямля і ўсё, што на ёй» ( 10, 14). Таму Бог адкідвае ўсялякія прэтэнзіі чалавека на абсалютную ўласнасць: «Нельга назаўсёды прадаваць зямлю, бо зямля належыць Мне, а вы – Мае чужынцы і прыхадні» ( 25, 23).

68. Гэтая адказнасць за зямлю, якая належыць Богу, азначае, што чалавек, адораны розумам, павінен шанаваць правы прыроды і далікатную раўнавагу паміж істотамі ў гэтым свеце, «бо Ён загадаў, – і яны былі створаны; паставіў іх назаўсёды і навекі і даў ім закон, які не праміне» ( 148, 5b-6). З гэтага вынікае, што біблійнае заканадаўства рашуча прапануе чалавеку розныя прадпісанні, што датычаць не толькі іншых людзей, але таксама іншых жывых істот: «Калі ўбачыш, што асёл брата твайго або вол упаў у дарозе — не адварочвайся ад іх, але разам з ім падымі іх […]. Калі сутыкнешся наперадзе на дарозе, на дрэве або на зямлі з гняздом птушкі з птушнятамі або яйкамі, што выседжвае матка, не забірай маткі з птушанятамі» ( 22, 4.6). Таксама адпачынак на сёмы дзень прапанаваны не толькі людзям, але і для таго, «каб адпачылі твой вол і асёл» ( 23,12). Бачым, што Біблія не дае падстаў для дэспатычнага антрапацэнтрызму, абыякавага да іншых стварэнняў.

69. Маючы магчымасць адказна карыстацца рэчамі, мы таксама павінны прызнаць, што іншыя жывыя істоты маюць належную ім вартасць у вачах Бога, а таксама «самім сваім існаваннем благаслаўляюць Яго і аддаюць Яму хвалу» [41] , бо «радуецца Пан справам сваім» (пар. 104, 31). Менавіта з увагі на сваю выключную годнасць і факт адорвання розумам, чалавек пакліканы шанаваць стварэнне разам з законамі, якія кіруюць ім: «Пан умацаваў зямлю праз мудрасць» ( 3, 19). Касцёл не кажа сёння, спрошчваючы, што іншыя стварэнні падпарадкаваны дабру чалавека, быццам бы яны не маюць каштоўнасці самі ў сабе і быццам бы мы можам распараджацца імі як захочам. Таму нямецкія біскупы патлумачылі, што «адносна іншых стварэнняў можна казаць пра прыярытэт , чым » [42] . аспрэчвае вельмі непасрэдна і рашуча тое, што было сапсавана антрапацэнтрызмам: «Кожнае стварэнне мае сваю ўласную вартасць і дасканаласць [...] Розныя стварэнні, [...] у сваім існаванні, адлюстроўваюць, кожнае па-свойму, пэўны промень бясконцай мудрасці і дабрыні Бога. Таму чалавек павінен шанаваць вартасць кожнага стварэння, каб пазбегнуць неўпарадкаванага выкарыстання рэчаў» [43] .

70. У апавяданні пра Каіна і Абэля бачым, што зайздрасць штурхнула Каіна да здзяйснення найбольшай несправядлівасці ў дачыненні да свайго брата. Гэта выклікала ў сваю чаргу разрыў адносінаў паміж Каінам і Богам, а таксама паміж Каінам і зямлёй, з якой ён быў выгнаны. Гэты фрагмент падсумоўвае драматычная размова Бога з Каінам. Бог пытаецца: «Дзе Абэль, брат твой?». Каін адказвае, што не ведае, а Бог настойвае: «Што зрабіў ты? Голас крыві твайго брата ўсклікае да Мяне з зямлі! Цяпер ты пракляты на зямлі» ( 4, 9-11). Занядбанне намаганняў культывавання і захавання належных адносінаў з бліжнім, пра якога я маю абавязак клапаціцца і абараняць яго, разбурае ўнутраную сувязь з самім сабою, з Богам, з іншымі і з зямлёй. Калі ўсе гэтыя адносіны занядбоўваюцца, калі на зямлі ўжо няма справядлівасці, то, як кажа Біблія, пад пагрозаю знаходзіцца ўсё жыццё. Менавіта гэтаму

вучыць нас гісторыя Ноя, калі Бог пагражае чалавецтву знішчэннем за ўпартую няздольнасць да жыцця згодна з патрабаваннямі справядлівасці і спакою: «Я вырашыў спыніць існаванне ўсіх людзей, бо зямля напоўнілася злачынствамі супраць Мяне» ( 6, 13). У гэтых старажытных апавяданнях, поўных глыбокай сімволікі, ужо было змешчана перакананне, адчувальнае і сёння, што ўсё паміж сабою звязана і што сапраўдны клопат пра нашае жыццё і нашыя адносіны з прыродай непарыўна звязаны з вымярэннем справядлівасці і братэрства, а таксама вернасці адносна іншых.

71. Хоць было «вялікае зло людзей на зямлі» ( 6, 5), і «пашкадаваў Пан, што стварыў чалавека на зямлі» ( 6, 6), аднак праз Ноя, які надалей трымаўся сумленнасці і справядлівасці, Ён пастанавіў адкрыць шлях збаўлення. Такім чынам даў чалавецтву магчымасць новага пачатку. Дастаткова добрага чалавека, каб з'явілася надзея! Біблійная традыцыя выразна кажа, што гэтае аднаўленне звязана з паўторным адкрыццём і шанаваннем рытмаў, якія рука Стварыцеля напісала ў прыродзе. Бачна гэта, напрыклад, у законе шабату. На сёмы дзень Бог адпачыў ад усіх сваіх спраў. Ён загадаў Ізраэлю, каб кожны сёмы дзень быў днём адпачынку,  ( 2, 2-3;  16, 23; 20, 10). Больш за тое, устанавіў таксама для Ізраэля і яго зямлі кожныя сем гадоў год шабату (пар.  25, 1-4), падчас якога трэба было даць зямлі абсалютны адпачынак, не сеяць, а збіраць толькі тое, што неабходна, каб выжыць і аказаць гасціннасць прыхадням (пар.  25, 4-6). Урэшце, пасля сямі тыдняў гадоў, гэта значыць пасля сарака дзевяці гадоў, адзначалі юбілейны год, год паўсюднага прабачэння і «вызвалення ў краіне для ўсіх яе жыхароў» ( 25, 10). Мэтаю развіцця гэтага заканадаўства было забеспячэнне гармоніі і роўнасці ў адносінах чалавека з іншымі, а таксама з зямлёй, на якой ён жыў і працаваў. Але ў той жа час, яно пацвярджала, што дар зямлі і яе плёны належаць усім людзям. Тыя, хто працаваў на зямлі і аберагаў яе, павінны былі дзяліцца яе плёнам асабліва з убогімі, удовамі, сіротамі і чужынцамі: «Калі будзеце жаць збожжа зямлі вашай, не жніце аж да самага краю поля і не збірайце каласоў, што застаюцца на полі. Не пакідайце ваш вінаграднік голым і не збірайце таго, што ўпала на зямлю ў вінаградніку. Пакіньце гэта для ўбогага і прыхадня» ( 19, 9-10).

72. Псальмы часта заахвочваюць чалавека пра-слаўляць Бога Стварыцеля, «які ўмацаваў над водамі зямлю, бо навекі Яго міласэрнасць» ( 136, 6). Але заахвочваюць таксама да праслаўлення іншыя ства-рэнні: «Хваліце Яго, сонца і месяц, хваліце Яго, усе ясныя зоры. Хваліце Яго, нябёсы нябёсаў і воды, якія па-над нябёсамі. Няхай хваляць імя Пана, бо Ён загадаў, і яны былі створаны» ( 148, 3-5). Мы існуем не толькі дзякуючы моцы Бога, але таксама перад Ім і з Ім. Таму славім Яго.

73. Пісанні прарокаў заахвочваюць шукаць сілы ў цяжкія хвіліны ў сузіранні магутнага Бога, які стварыў сусвет. Бясконцая Божая моц не змушае нас забыць пра Яго айцоўскую пяшчоту, бо ў Ім лучацца любоў і моц. Па сутнасці ўся здаровая духоўнасць азначае адначасова прыняцце Божай любові і даверлівае праслаўленне Пана за Яго бясконцую моц. У Бібліі Бог, які вызваляе і збаўляе, з'яўляецца тым самым Богам, які стварыў сусвет, а

гэтыя два спосабы Божай дзейнасці цесна і непарыўна злучаны паміж сабою: «Ах, Пане Божа, вось Ты стварыў неба і зямлю сваёй вялікаю моцаю і выцягнутым плячом. Няма нічога немагчымага для Цябе [...]. Ты вывеў народ свой, Ізраэль, з зямлі егіпецкай сярод знакаў і цудаў» ( 32, 17.21). «Пан — Бог вечны, Ён стварыў межы зямлі. Ён не стамляецца, не знясільваецца, і розум Ягоны неспазнаны. Ён дае стомленаму сілу, Ён умацоўвае знямоглага» ( 40, 28b-29).

74. Досвед бабілёнскай няволі выклікаў духоўны крызіс, які прывёў да паглыблення веры ў Бога, пад-крэсліваючы Яго творчую ўсемагутнасць, каб заклі-каць народ да адшукання надзеі ў няшчасці. Праз некалькі стагоддзяў, у іншы час выпрабаванняў і пераследу, калі Рымская Імперыя імкнулася навязаць сваё абсалютнае панаванне, вернікі зноў знаходзі-лі суцяшэнне і надзею, умацоўваючы свой давер да Усемагутнага Бога, і спявалі: «Вялікія і цудоўныя справы Твае, Пане Божа ўсемагутны. Справядлівыя і праўдзівыя шляхі Твае» ( 15, 3). Калі Бог змог стварыць з нічога сусвет, то можа таксама ўмешвацца ў гэты свет і перамагаць усялякія формы зла. Таму несправядлівасць не з’яўляецца непераможнай.

75. Мы не можам падтрымліваць духоўнасць, якая адкідвае ўсемагутнага Бога і Стварыцеля. Так мы прыйшлі б да ўшанавання іншых сілаў свету ці да змяшчэння сябе на месцы Пана, аж да жадання без канца таптаць створаную Ім рэчаіснасць. Найлепшы спосаб вярнуць чалавека на яго месца і спыніць яго імкненні быць абсалютным уладаром зямлі — гэта зноў нагадаць пра постаць Айца Стварыцеля і адзінага Пана сусвету, бо ў адваротным выпадку чалавек будзе няспынна жадаць зноў навязаць рэчаіснасці свае законы і ўласныя інтарэсы.

## III. Таямніца Сусвету

76. У юдэахрысціянскай традыцыі «стварэнне» — гэта штосьці значна большае за прыроду, бо яно звязана з Божым планам любові, дзе кожная істота мае каштоўнасць і значэнне. Прырода часта разглядаецца як сістэма пазнавання, аналізавання і кіравання, у той час як стварэнне можа разумецца як дар, што пахо-дзіць з адкрытай далоні нашага Айца, як асветленая любоўю рэчаіснасць, якая заклікае нас да паўсюднай еднасці.

77. «Словам Пана створаны нябёсы» ( 33,6). Гэта паказвае нам, што свет з’яўляецца творам рашэння, а не хаосу ці выпадку, што ўзвышае яго яшчэ больш. У стваральным слове выяўляецца свабоднае рашэнне. Сусвет не ўзнік па адвольнай усемагутнасці як маніфестацыя сілы ці волі самасцвярджэння. Стварэнне належыць парадку любові. Любоў Бога з’яўляецца асноўнай прычынай усяго стварэння: «Бо любіш Ты ўсё, што існуе, і нічым, што стварыў, не грэбуеш; бо, калі б нешта ненавідзеў, гэтага б Ты не стварыў» ( 11, 24). Таму кожнае стварэнне з’яўляецца прадметам пяшчоты Айца, які вызначае яму месца ў

свеце. Нават жыццё найбольш эфемернай істоты, самай нязначнай, з’яўляецца прадметам Яго любові, і на працягу некалькіх секунд існавання Ён атачае яе сваёй любоўю. Святы Базыль сказаў, што Стварыцель з’яўляецца таксама «бязмежнай дабрынёй» [44] , а Дантэ Аліг’еры казаў пра «любоў, што рухае сонцам і зоркамі» [45] . Таму праз справы стварэння можна дайсці да «поўнай любові вернасці Бога» [46] .

78. У той жа час юдэахрысціянская думка дэміфалагізавала прыроду. Не перастаючы захапляцца яе прыгажосцю і веліччу, яна ўжо не прыпісвае ёй боскіх рысаў. Праз гэта яшчэ больш падкрэсліваюцца нашыя абавязкі перад ёй. Зварот да прыроды не можа адбывацца за кошт свабоды і адказнасці чалавека, які з’яўляецца часткай свету і мае абавязак развіваць свае здольнасці дзеля аховы свету і развіцця свайго патэнцыялу. Калі прызнаем каштоўнасць і крохкасць прыроды і адначасова здольнасці, якія даў нам Стварыцель, то сёння можам пакласці канец сучаснаму міфу пра неабмежаваны матэрыяльны прагрэс. Крохкі свет, разам з чалавекам, якому Бог даручыў апеку над ім, з’яўляецца выклікам для нашага інтэлекту ў распазнаванні таго, як мы павінны накіроўваць, фарміраваць і абмяжоўваць нашую ўладу.

79. У гэтым сусвеце, які складаецца з адкрытых сістэм, з’яднаных паміж сабою, мы можам адкрыць незлічоныя формы адносінаў і ўдзелу. Гэта прыводзіць нас да думкі пра ўвесь сусвет, адкрыты на трансцэн-дэнцыю Бога, у межах якой развіваецца свет. Вера дазваляе нам інтэрпрэтаваць значэнне і таямнічую прыгажосць таго, што адбываецца. Свабода чалавека можа ўнесці свой разумны ўклад у пазітыўнае развіццё, але можа таксама дадаць новае зло, новыя прычыны цярпення і сапраўднага рэгрэсу. Гэта вядзе да захапляльнай і драматычнай гісторыі чалавецтва, здольнай распачаць вызваленне, развіццё, збаўленне і любоў або працэсы заняпаду і ўзаемнага знішчэння. Таму Касцёл у сваёй дзейнасці імкнецца памятаць не толькі пра абавязак клопату аб прыродзе, але таксама пра абарону «чалавека ад самазнішчэння» [47] .

81. Чалавек, хоць таксама падлягае эвалюцыйным працэсам, нясе ў сабе некаторую адметнасць, якую немагчыма растлумачыць эвалюцыяй і іншымі адкрытымі сістэмамі. Кожны з нас мае нейкую асабістую тоеснасць, здольную распачаць дыялог з іншымі і з самім Богам. Здольнасць думаць, разважаць, быць творчым, умець інтэрпрэтаваць, мастацкая творчасць і іншыя арыгінальныя магчымасці паказваюць некаторую выключнасць, якая выходзіць па-за фізічную і біялагічную сферу. Якасную адметнасць, якая азначае ўзнікненне асабовага быту ў межах матэрыяльнага сусвету, прадугледжвае непасрэднае дзеянне Бога, своеасаблівае пакліканне да жыцця і да адносінаў аднаго «Ты» з іншым «ты». На падставе Бібліі мы лічым асобу суб’ектам, які ніколі не можа быць зведзены да катэгорыі аб’екта.

82. Памылковым было б думаць, што іншыя жывыя істоты павінны разглядацца як звычайныя прадметы, якія падлягаюць адвольнаму панаванню чалавека. Калі прапануецца бачанне прыроды толькі як прадмету выгады і інтарэсу, гэта цягне за сабой таксама

сур'ёзныя наступствы для грамадства. Бачанне, якое ўмацоўвае самавольства наймацнейшых, прывяло да велізарнай няроўнасці, несправядлівасці і насілля ў адносінах да большасці чалавецтва, бо рэсурсы становяцца ўласнасцю таго, хто прыбыў першым, ці таго, хто мае больш улады: пераможца забірае ўсё. Ідэал гармоніі, справядлівасці, братэрства і спакою, які прапануе Езус, з'яўляецца супрацьлегласцю такой мадэлі. Ён выказаў гэта адносна багацеяў свайго часу: «Кіраўнікі народаў пануюць над імі, і вяльможы маюць уладу над імі. Але не так няхай будзе сярод вас: хто хоча быць большым сярод вас, няхай будзе вам слугою» ( 20, 25-26).

83. Мэта шляху сусвету – гэта Божая паўната, якой ужо дасягнуў ўваскрослы Хрыстус, які з'яўляецца фундаментам паўсюднага сталення [53] . Такім чынам дадаем яшчэ адзін аргумент, каб адкінуць усялякае дэспатычнае і неадказнае панаванне чалавека над іншымі стварэннямі. Мы самі не з'яўляемся канчатковай мэтай усіх іншых стварэнняў. Усе з намі і праз нас ідуць да канчатковай мэты, якой ёсць Бог у трансцэндэнтнай паўнаце, дзе ўваскрослы Хрыстус усё ахоплівае і асвятляе. Паколькі чалавек, адораны розумам і любоўю, прыцягваецца паўнатой Хрыста, ён пакліканы прывесці ўсе стварэнні да іх Стварыцеля.

IV. Пасланне кожнай істоты ў гармоніі ўсяго стварэння

84. Калі мы падкрэсліваем, што чалавек з'яўляецца вобразам Бога, то не павінны забываць, што кожнае стварэнне мае вызначаную функцыю і кожнае з'яўляецца патрэбным. Увесь матэрыяльны сусвет — гэта мова любові Бога, Яго бязмежнай любові да нас. Зямля, вада, горы — усё з'яўляецца выражэннем пяшчоты Бога. Гісторыя сяброўства з Богам заўсёды мае месца ў геаграфічнай прасторы, якая становіцца вельмі асабістым знакам, а кожны з нас трымае ў памяці месцы, дзе сустрэў шмат добрага. Хто рос сярод гораў або ў дзяцінстве сядзеў каля крыніцы, каб з яе напіцца, або забаўляўся на плошчы ў сваім раёне, калі вяртаецца ў гэтыя месцы, адчувае ў сабе заклік да аднаўлення сваёй тоеснасці.

85. Бог напісаў цудоўную кнігу, «літарамі якой з'яўляюцца шматлікія стварэнні, прысутныя ў су-свеце» [54] . Правільна сказалі біскупы Канады, што ніводнае стварэнне не выходзіць па-за межы Божага Аб'яўлення: «Ад самых шырокіх панарам да найменшых формаў жыцця прырода з'яўляецца невычар-пальнай крыніцай захаплення і павагі. Яна — пастаяннае аб'яўленне боскасці» [55] . Японскія біскупы са свайго боку сказалі штосьці вельмі важнае: «Успрыманне ўсялякага стварэння, спеў гімну ў гонар існавання — гэта радаснае жыццё ў любові Бога і ў надзеі» [56] . Такое сузіранне стварэння дазваляе нам адкрыць у кожнай рэчы пэўную навуку, якую імкнецца пераказаць нам Бог, бо «для веруючага чалавека сузіранне стварэння — гэта таксама прыслухоўванне да зместу паслання, гэта слуханне яго таямнічага і нячутнага голасу» [57] . Можна сказаць, што «побач з Аб'яўленнем у сціслым сэнсе гэтага слова, змешчаным у Святым Пісанні, Божым аб'яўленнем з'яўляецца для нас

ззянне сон-ца і надыход ночы»[58]. Звяртаючы ўвагу на гэтае аб’яў-ленне, чалавек вучыцца распазнаваць самога сябе ў адносінах з іншымі стварэннямі: «Выражаючы свет, я выражаю сябе; адкрываю маю сакральнасць, „намагаючыся” расшыфраваць сакральнасць свету»[59].

86. Увесь сусвет, з яго разнастайнымі адносінамі, найлепш паказвае невычарпальнае багацце Бога. Святы Тамаш з Аквіну мудра сцвярджаў, што шматлікасць і разнастайнасць — «гэта справа намеру першага Творцы — Бога», які хацеў, каб тое, «чаго не хапае аднаму для прадстаўлення Божай дабрыні, можна было б дапоўніць з іншага»[60], бо Яго дабрыня «не можа ўсебакова быць прадстаўлена адным стварэннем»[61]. Таму мы павінны ўхапіць разнастайнасць рэчаў у іх шматлікіх адносінах[62]. Мы тады лепш разумеем значэнне і сэнс кожнага стварэння, калі захапляемся імі ў паўнаце Божага плану. Вучыць гэтаму : «Узаемазалежнасць стварэнняў пажаданая Богам. Сонца і месяц, кедр і маленькая кветка, арол і верабей: велізарная разнастайнасць і разнароднасць стварэнняў азначае, што ніводнае з іх не з’яўляецца самадастатковым. Яны існуюць толькі ва ўзаемнай залежнасці, каб дапаўняцца праз служэнне адно аднаму»[63].

87. Калі мы заўважаем адлюстраванне Бога ва ўсім, што існуе, то сэрца напаўняецца жаданнем праслаў-ляць Пана ва ўсіх Яго стварэннях і разам з імі, як сведчыць пра гэта прыгожы гімн святога Францішка Асізскага:

«Будзь праслаўлены, Пане,

З усімі сваімі стварэннямі,
А найбольш з нашым братам сонцам,
Якое дае дзень, а Ты свеціш праз яго.
Яно прыгожае і прамяністае,
А бляск яго
Нагадвае Цябе, о Найвышэйшы!
Будзь праслаўлены, Пане,

Братам нашым месяцам
І нашымі сёстрамі зоркамі,
Створанымі Табою ў небе,
Яркімі, каштоўнымі і прыгожымі.
Будзь праслаўлены, Пане,

Братам нашым ветрам,
Паветрам і аблокамі,

Надвор’ем і рознымі порамі часу,
Якімі Ты корміш сваё стварэнне.
Будзь праслаўлены, Пане,

Нашай сястрыцай вадой,
Вельмі карыснай,
Пакорнай, каштоўнай і чыстай.
Будзь праслаўлены, Пане,

Братам нашым агнём,
Якім Ты асвятляеш ноч,
А ён — прыгожы і радасны,
Палкі і моцны» [64] .

88. Біскупы Бразіліі падкрэслілі, што ўся прырода не толькі аб’яўляе Бога, але з’яўляецца месцам Яго прысутнасці. У кожным стварэнні жыве Яго жыццядайны Дух, які заклікае нас да адносінаў з Ім [65] . Адкрыццё гэтай прысутнасці абуджае ў нас развіццё «экалагічных цнотаў» [66] . Калі мы кажам гэта, то не забываем, аднак, што існуе таксама бясконцая адлегласць, што рэчы гэтага свету не маюць паўнаты Бога. У адваротным выпадку мы не зрабілі б нічога добрага стварэнням, бо не распазналі б іх правільнага і праўдзівага месца, што прывяло б да празмернага патрабавання ад іх таго, чаго ў сваёй мізэрнасці яны даць нам не могуць.

## V. Паўсюдная еднасць

89. Стварэнні гэтага свету нельга разглядаць як даброты, якія не маюць уладальніка: «Яно Тваё, о Пане, які любіш жыццё» ( 11, 26). Гэта вядзе да пераканання, што ўсе стварэнні сусвету, створаныя адным Айцом і з’яднаныя нябачнымі повязямі, ствараюць нешта накшталт універсальнай сям’і, цудоўнай еднасці, якая абуджае да святой, сардэчнай і пакорнай па-вагі. Я хацеў бы нагадаць, што «Бог так цесна злучыў нас з навакольным светам, што знішчэнне і атручван-не зямлі з’яўляецца хваробай, якая закранае нас усіх, і мы можам смуткаваць над выміраннем нейкага віду як над нейкім знявечаннем» [67] .

90. Гэта не азначае зраўноўвання ўсіх жывых істот і пазбаўлення чалавечай істоты той асаблівай каштоўнасці, якая спалучана адначасова з велізарнай адказнасцю. Гэта не абагаўленне зямлі, што пазбавіла б нас права супрацоўнічаць з ёй і аберагаць яе крохкасць. Такія канцэпцыі прывялі б да стварэння новых дыс-прапорцый, спрабуючы ўцячы ад рэальнасці, якая ставіць перад намі выклікі [68] . Часам мы заўважаем апантанасць у адмаўленні асобе чалавека ўсялякага першынства, бо вядзецца барацьба за іншыя віды,

але няма змагання за роўную годнасць людзей. Гэта праўда, што мы павінны клапаціцца, каб адносіны да іншых жывых істот былі адказныя, але перад усім нас павінны абураць існуючыя паміж намі няроўнас-ці, бо мы надалей церпім тое, што некаторыя людзі лічацца больш годнымі за іншых. Мы не заўважаем, што некаторыя людзі трапляюць у абразлівую галечу без рэальных магчымасцяў змены, у той час як іншыя нават не ведаюць, што зрабіць з тым, што яны маюць, са славалюбствам кажуць пра сваю перавагу і пакідаюць пасля сябе такі ўзровень адходаў, што пашырэнне гэтай з'явы пагражала б знішчэннем планеты. Надалей мы практычна згаджаемся з тым, што некаторыя адчуваюць сябе людзьмі ў большай ступені, быццам бы яны нарадзіліся з большымі правамі.

91. Умоваю праўдзівага адчування ўнутранага з'яднання з іншымі стварэннямі прыроды з'яўляецца адначасова пяшчота, спачуванне і клопат пра чалавека. Бачна супярэчлівая пастава тых, хто змагаецца з гандлем відамі жывёлаў, якім пагражае знікненне, але застаецца цалкам абыякавымі да гандлю людзьмі, да лёсу ўбогіх, а таксама жадаюць знішчыць іншага чалавека, якога не любяць. Гэта нявечыць сэнс барацьбы за прыроднае асяроддзе. Таму невыпадкова, што ў спеве, якім святы Францішак праслаўляе Бога за стварэнне, ён дадае: «Пане, будзь праслаўлены тымі, хто прабачае ворагам дзеля Тваёй любові». Усё звязана паміж сабою. Таму неабходна спалучаць клопат пра навакольнае асяроддзе са шчырай любоўю да чалавека і з пастаяннай актыўнай пазіцыяй у дачыненні да праблем грамадства.

92. З іншага боку, калі сэрца сапраўды адкрытае на паўсюдную еднасць, то нішто і ніхто не выключаны з гэтага братэрства. Таму праўдай ёсць тое, што абыякавасць ці жорсткасць у адносінах да іншых стварэнняў гэтага свету, заўсёды нейкім чынам адбіваецца на адносінах з іншымі людзьмі. Адно ёсць сэрца і тая самая мізэрнасць, якая вядзе да здзекаў над жывёламі, у хуткім часе выявіцца ў адносінах з іншымі асобамі. Кожная жорсткасць да якога-небудзь стварэння «супярэчыць годнасці чалавека» [69] . Мы не можам лічыць сябе сапраўды любячымі, калі выключаем з нашай зацікаўленасці нейкую частку рэчаіснасці: «Спакой, справядлівасць і абарона стварэння — гэта тры пытанні, цесна звязаныя паміж сабою, якіх нельга аддзяліць ад сябе так, каб яны разглядаліся асобна, бо гэта магло б зноў прывесці да рэдукцыянізму» [70] . Усё звязана паміж сабою і мы, усе людзі, з'яднаныя як браты і сёстры ў цудоўнай пілігрымцы, злучаныя любоўю, якой Бог адорвае кожнае стварэнне і якая лучыць нас з братам Сонцам, Месяцам, сястрой ракой і маці Зямлёй.

## VI. Паўсюднае прызначэнне дабротаў

93. Сёння як веруючыя, так і няверуючыя згодныя, што зямля — гэта супольная спадчына, плён якой павінен служыць усім. Для веруючых людзей гэта стано-віцца пытаннем вернасці Стварыцелю, бо Бог стварыў свет для ўсіх. Таму кожны экалагіны праект павінен уключаць

грамадскую перспектыву, якая прадугледжвае асноўныя правы асобаў найбольш сацыяльна неабароненых. Прынцып падпарадкавання прыватнай уласнасці паўсюднаму размеркаванню дабротаў з'яўляецца ўніверсальным правам яе выкарыстання, гэта «залатое правіла» грамадскіх паводзінаў, а таксама «першакрыніца ўсяго сацыяльна-этычнага ладу» [71] . Хрысціянская традыцыя ніколі не прызнавала права на прыватную ўласнасць абсалютнай і непарушаль-най і падкрэслівала грамадскую функцыю ўсялякай формы прыватнай уласнасці. Святы Ян Павел II рашуча нагадаў пра гэтую дактрыну, кажучы, што «Бог даў зямлю ўсяму чалавецтву, каб яна ўтрымлівала ўсіх яго членаў » [72] . Гэта моцныя і ўзнёслыя словы. Ён падкрэсліў, што «такая мадэль развіцця, якая не шануе і не падтрымлівае чалавечыя правы, асабістыя і грамадскія, эканамічныя і палітычныя, уключна з правамі народаў і нацый, не з'яўляецца годнай чалавека» [73] . Выразна сцвердзіў, што «Касцёл, безумоўна, абараняе слушныя правы на прыватную ўласнасць, але таксама не менш выразна вучыць, што кожная ўласнасць заўсёды падлягае грамадскай гіпатэцы, каб даброты маглі служыць агульнаму прызначэнню, нададзенаму Богам» [74] . Таму сцвярджае, што «Божаму плану супярэчыць распараджэнне гэтым дарам так, каб яго плёнам карысталіся толькі некаторыя» [75] . Гэта сур'ёзна аспрэчвае несправядлівыя звычкі часткі чалавецтва [76] .

94. Багатыя і ўбогія маюць аднолькавую годнасць, бо «Пан – Стварыцель усіх» ( 22, 2), «бо Ён стварыў малога і вялікага» ( 6, 7) і «загадвае сонцу свайму ўзыходзіць над дрэннымі і добрымі» ( 5, 45). Гэта вядзе да практычных вынікаў, як сказалі пра гэта парагвайскія біскупы: «Кожны земляроб мае натуральнае права на тое, каб мець належны надзел зямлі, дзе мог бы пабудаваць свой дом, працаваць, каб утрымліваць сям'ю і мець бяспечнае жыццё. Гэтае права павінна быць гарантаванае так, каб яго рэалізацыя не была ілюзорнай, але рэальнай. Гэта азначае, што апрача акту ўласнасці, земляроб павінен мець тэхнічныя сродкі, крэдыты, страхавыя гарантыі і доступ да рынку» [77] .

95. Навакольнае асяроддзе – гэта агульнае дабро, маёмасць усяго чалавецтва, і ўсе адказваюць за яго. Той, хто мае яго частку, мае яго толькі для таго, каб распараджацца ім дзеля дабра ўсіх. Калі мы гэтага не робім, то маем на сваім сумленні аспрэчванне існавання іншых. Таму біскупы Новай Зеландыі разважалі над тым, што азначае запаведзь «не забівай», калі «дваццаць працэнтаў жыхароў свету выкарыстоўвае рэсурсы так, што абкрадваюць бедныя краіны, а таксама будучыя пакаленні з таго, чаго яны патрабуюць для існавання» [78] .

## VII. Погляд Езуса

96. Езус кажа пра біблійную веру ў Бога Ствары-целя (пар. 11, 25) і падкрэслівае асноўнае: Бог — гэта Айцец. Езус, размаўляючы са сваімі вучнямі, заахвочвае іх распазнаваць

айцоўскія адносіны Бога з усімі стварэннямі і нагадвае з вялікай пяшчотаю, што кожнае з іх з'яўляецца важным у Яго вачах: «Ці ж не пяць вераб'ёў прадаецца за два асы? І ніводзін з іх не забыты перад Богам» ( 12, 6); «Паглядзіце на птушак нябесных: яны ні сеюць, ні жнуць, ні збіраюць у засекі, і Айцец ваш Нябесны корміць іх» ( 6, 26).

97. Пан мог заахвочваць іншых да адчування прыгажосці, якая існуе ў свеце, бо сам быў у пастаянным кантакце з прыродай і звяртаў на яе асаблівую ўвагу, поўную любові і захаплення. Калі праходзіў кожны кавалачак сваёй Айчыны, затрымліваўся, каб захапляцца прыгажосцю, створанай Айцом, заахвочваючы сваіх вучняў распазнаваць у Божых рэчах заклік: «Падыміце вочы вашыя і паглядзіце на нівы, як пабялелі яны ўжо для жніва» ( 4, 35). «Валадарства Нябеснае падобнае да гарчычнага зерня, якое ўзяў чалавек і пасеяў на полі сваім. Хоць яно меншае за ўсялякае насенне, калі вырасце, бывае вышэйшым за іншыя расліны» ( 13, 31-32).

98. Езус жыў у поўнай згодзе са стварэннем, а іншыя здзіўляліся: «Хто Ён такі, што і вятры, і мора слухаюцца Яго?» ( 8, 27). Не прыходзіць як нейкі аскет, ізаляваны ад свету, ці вораг прыемных у жыцці рэчаў. Пра самога сябе сказаў: «Прыйшоў Сын Чалавечы, які есць і п'е, і кажуць: „Гэты чалавек абжора і п'яніца, прыяцель мытнікаў і грэшнікаў”» ( 11, 19). Ён быў далёкі ад філасофіі, якая пагарджае целам, матэрыяй і рэчамі гэтага свету. Несумненна, што гэтыя шкодныя дуалізмы мелі істотны ўплыў на некаторых хрысціянскіх мысліцеляў розных часоў і сказілі сэнс Евангелля. Езус фізічна працаваў, маючы штодзённы кантакт са створанай Богам матэрыяй, каб сфарма--ваць яе сваім рамесніцкім уменнем. Варта заўважыць, што большасць жыцця Ён прысвяціў гэтаму заданню, якое рэалізаваў у простым жыцці, якое не абуджала ніякага здзіўлення: «Ці ж гэта не цясляр, сын Марыі?» ( 6, 3). Праз гэта Ён асвяціў працу і надаў ёй асаблівую каштоўнасць дзеля нашага сталення. Святы Ян Павел II вучыў, што «праз цяжар працы ў еднасці з укрыжаваным за нас Хрыстом, чалавек супрацоўнічае пэўным чынам з Божым Сынам у справе адкуплення чалавецтва» [79] .

99. Паводле хрысціянскага разумення рэчаіснасці лёс усяго стварэння ўпісваецца ў таямніцу Хрыста, які прысутнічае ў пачатку ўсіх рэчаў: «Усё праз Яго і для Яго было створана» ( 1, 16) [80] . Пралог Евангелля паводле святога Яна (1, 1-18) паказвае стваральную дзейнасць Хрыста як Божага Слова (*Logos*). Але гэты пралог здзіўляе сцвярджэннем, што гэтае Слова «сталася целам» ( 1, 14). Адна з Асобаў Святой Тройцы ўвайшла ў створаны сусвет, злучаючы з ім свой лёс аж да крыжа. Ад пачатку свету, але асабліва ад уцелаўлення, таямніца Хрыста таямніча дзейнічае ва ўсёй прыроднай рэчаіснасці, не абмяжоўваючы, аднак, яе аўтаномію.

100. Новы Запавет кажа нам не толькі пра Езуса, які жыў на зямлі, і пра Яго вельмі канкрэтныя і сардэчныя адносіны са светам. Паказвае нам Яго таксама як уваскрослага і ўслаўленага, прысутнага і паўсюдна пануючага над усім стварэннем. «Бо спадабалася [Богу], каб праз Яго прымірыць з сабою ўсё, і зямное, і нябеснае, усталяваўшы спакой праз

кроў Ягонага крыжа» ( 1, 19-20). Гэта пераносіць нас у канец часоў, калі Сын перадасць Айцу ўсе рэчы, а «Бог будзе ўсім ва ўсіх» (1  15, 28). Так стварэнні гэтага свету паўстаюць перад намі ўжо не як выключна натуральная рэчаіс-насць, бо Уваскрослы таямніча акружае яе і накіроўвае да паўнаты. Тыя самыя дзікія кветкі і птушкі, якімі Ён захапляўся сваімі чалавечымі вачыма, і сёння напоўнены Яго яснеючай прысутнасцю.

## РАЗДЗЕЛ ТРЭЦІ

## ЧАЛАВЕЧЫ ФАКТАР ЭКАЛАГІЧНАГА КРЫЗІСУ

101. Нічым не дапаможа апісанне праяў экалагічнага крызісу, калі мы не распазнаем яго людскога фактару. Існуе такі скажоны спосаб разумення жыцця і чалавечай дзейнасці, які супярэчыць рэчаіснасці, аж да яе знішчэння. Чаму мы павінны заўсёды над гэтым задумвацца? Я прапаную затрымацца на пануючай тэхнакратычнай парадыгме і задумацца над месцам, якое займае ў ёй чалавек і яго дзейнасць у свеце.

### I. Тэхналогія: крэатыўнасць і ўлада

102. Чалавецтва ўвайшло ў новую эру, у якой сіла тэхналогіі ставіць нас на раздарожжы. Мы з'яўляемся спадкаемцамі двух стагоддзяў вялізнай хвалі зменаў: паравы рухавік, чыгунка, тэлеграф, электрычнасць, аўтамабіль, самалёт, хімічная прамысловасць, сучасная медыцына, інфарматыка, а ў апошні час лічбавая рэвалюцыя, робататэхніка, бія- і нанатэхналогіі. Трэба радавацца гэтым дасягненням і захапляцца шырокімі магчымасцямі, якія адкрываюць нам гэтыя няспынныя навінкі, бо «навука і тэхналогія з'яўляюцца цудоўным прадуктам творчасці чалавека, якая з'яўляецца дарам Бога» [81] . Пераўтварэнне прыроды дзеля яе выкарыстання з'яўляецца рысаю чалавецтва з самага пачатку яго гісторыі, таму тэхніка «выражае схільнасць чалавека да паступовага пераадолення пэўных матэрыяльных абумоўленасцяў» [82] . Тэхналогія прынесла прэвентыўныя сродкі ад незлічоных няшчасцяў, якія мучылі і абмяжоўвалі чалавека. Мы не можам недаацэньваць дасягненні і не дзякаваць за іх, асабліва ў медыцыне, інжынерыі і камунікацыі. І ці ж мы можам не прызнаць намаганняў многіх навукоўцаў і тэхнікаў, якія выпрацавалі альтэрнатывы на карысць устойлівага развіцця?

103. Адпаведна накіраваная тэхнічная навука здольная не толькі ствараць сапраўды вартасныя рэчы дзеля паляпшэння якасці жыцця чалавека, пачынаючы ад патрэбных прадметаў хатняй гаспадаркі да цудоўных сродкаў транспарту, мастоў, будынкаў, грамадскіх аб’ектаў. Яна здольная ства-раць прыгажосць і пераносіць чалавека, зануранага ў матэрыяльным свеце, да сферы прыгожага. Ці можна аспрэчыць прыгажосць самалёту або некаторых хмарачосаў? Існуюць каштоўныя скульптурныя ці музычныя творы, якія з’явіліся з дапамогаю новых тэхнічных сродкаў. Такім чынам, у жаданні прыга-жосці стваральнікаў тэхналогій, у тым, хто захапляецца гэтай прыгажосцю, адбываецца пераход да нейкай паўнаты, уласцівай чалавеку.

104. Аднак мы не можам ігнараваць таго, што ядзер-ная энергія, біятэхналогія, інфарматыка, веданне нашай ДНК і іншыя атрыманыя магчымасці прапану-юць нам страшэнную моц. Больш за тое, даюць магчы-масць тым, хто мае веды — а перадусім эканамічную ўладу, каб іх выкарыстоўваць — незвычайнае панаванне над усім чалавецтвам і над усім светам. Чалавецтва ніколі не мела такой улады над сабою і не мае гарантыі, што добра яе выкарыстае, асабліва беручы пад увагу спосаб яе выкарыстання. Дастаткова прыгадаць атамныя бомбы, скінутыя ў сярэдзіне XX стагоддзя, а таксама ўвесь багаж тэхналогій, якія выкарыстоўваў нацызм, камунізм і іншыя рэжымы, якія служылі знішчэнню мільёнаў людзей. Не будзем таксама забываць, што вайна мае сёння ў распараджэнні штораз больш смертаносную зброю. У чыіх руках знаходзіцца і ў якія рукі можа трапіць такая вялікая ўлада? Жахліва грозным з’яўляецца яе сканцэнтраванасць у руках малой часткі чалавецтва.

105. Мы схільныя верыць, «што рост моцы — гэта проста „прагрэс”, што гэты рост дае большую бяспеку, выгаду, дабрабыт, больш жыццёвых сілаў, паўнату годнасці» [83] , як быццам бы рэчаіснасць, дабро і праў-да спантанна вынікаюць з самой моцы тэхналогіі і эканомікі. Гэта праўда, што «сучасны чалавек не быў выхаваны так, каб умець адпаведна карыстацца сваёй моцаю» [84] , бо вялізнаму тэхналагічнаму росту не сапутнічала развіццё чалавечай істоты ў сферы адказнасці, вартасці і сумлення. Кожная эпоха імкнецца развіваць абмежаваную самасвядомасць сваіх абмежаванняў. Таму сёння чалавецтва не заўважае сур’ёзнасці выклікаў, якія паўстаюць перад ім, і «няспынна ўзрастае магчымасць таго, што чалавек будзе дрэнна выкарыстоўваць сваю моц», калі яна не будзе «падпарадкавана абавязковым нормам, якія рэгулююць свабоду, а толькі ўяўна неабходным нормам, а менавіта выгадзе і забеспячэнню заўтра» [85] . Чалавек не з’яўляецца цалкам незалежным. Яго свабода скажаецца, калі даручаецца сляпым сілам падсвядомасці, зямным патрэбам, эгаізму і жахліваму насіллю. У гэтым сэнсе свабода чалавека знаходзіцца ў небяспецы і з’яўляецца без-абароннай перад сваёй уласнай моцаю, якая няспынна расце, не маючы адпаведных прыладаў кантролю. Можа мець у распараджэнні знешнія механізмы, аднак трэба сцвердзіць, што не хапае ёй сёння адпаведнай грунтоўнай этыкі, культуры і духоўнасці, якія б сапраўды яе абмяжоўвалі і ўтаймоўвалі.

## II. Глабалізацыя тэхнакратычнай парадыгмы

106. Галоўная праблема іншая, больш глыбокая: маецца на ўвазе спосаб фактычнага прыняцця чалавецтвам тэхналогіі і яе развіцця разам з . У такой парадыгме вылучаецца канцэпцыя суб'екта, які паступова, у лагічна-рацыянальным працэсе, пазнае, а затым набывае рэч, якая знаходзіцца звонку. Такі суб'ект выяўляецца праз стварэнне навуковага метаду, спалучанага з эксперыментаваннем, якое з'яўляецца ўжо выразна тэхнікай валодання, панавання і пераўтварэння. Гэта як быццам бы суб'ект меў дачыненне з абсалютна бясформеннай рэчаіснасцю, цалкам даступнай для яго маніпуляцыі. Умяшанне чалавека ў прыроду было заўсёды, але на працягу доўгага часу характарызавалася спадарожніцтвам, дастасаваннем да магчымасцяў, якія даюць самі рэчы. Гэта было прыняццем таго, што прапанавала сама прыродная рэчаіснасць, быццам бы выцягваючы рукі ў жэсце запрашэння. З іншага боку, сёння ўлічваецца эксплуатацыя рэчаў ва ўсім, што толькі магчыма, праз прыўлашчванне, якое вынікае з няведання чалавека або з забыцця пра саму сутнасць таго, што знаходзіцца перад ім. Таму чалавек і рэчы перасталі падаваць сабе сяброўскую далонь, пераходзячы да ўзаемнай канфрантацыі. Так лёгка можна перайсці да ідэі бясконцага ці неабмежаванага росту, якая так моцна захапіла эканамістаў, тэарэтыкаў фінансаў і тэарэтыкаў тэхналогіі. Яна прадугледжвае фальшывае перакананне пра бясконцую даступнасць дабротаў нашай планеты, што вядзе да іх «выціскання» аж да апошніх межаў, а нават значна больш. Маецца на ўвазе памылковы погляд, «што ў прыродзе існуе неабмежаваная колькасць энергіі і рэсурсаў для выкарыстання, што магчыма іх хуткае абнаўленне і што адмоўныя вынікі маніпуляцыі прыродным парадкам могуць быць лёгка выпраўлены» [86] .

107. Таму мы можам сцвярджаць, што крыніцаю многіх праблем сённяшняга свету з'яўляецца перад усім тэндэнцыя, якая не заўсёды ўсведамляецца, — гэта стварэнне метадалогіі і мэтаў тэхнічных навук паводле парадыгмы разважання, якая абумоўлівае жыццё людзей і функцыянаванне грамадства. Вы-ні-кі прымянення гэтай мадэлі да ўсёй рэчаіснасці, чалавечай і грамадскай, можна назіраць у дэградацыі навакольнага асяроддзя, якая з'яўляецца толькі сімп-томам рэдукцыянізму, які пагражае жыццю чалавека і грамадству ва ўсіх іхніх вымярэннях. Трэба пры-знаць, што прадметы, як вынік вытворчасці тэхнікі, не з'яўляюцца нейтральнымі, бо ўплываюць на стыль жыцця і накіроўваюць грамадскія магчымасці згодна з інтарэсамі пэўных груп улады. Некаторыя рашэнні, якія здаюцца толькі інструментальнымі, з'яўляюцца па сутнасці выбарам, што датычыць тыпу грамадскага жыцця, які намерваюцца развіваць.

108. Цяжка сабе ўявіць, што можна трымацца ін-шай культурнай парадыгмы, а таксама карыстацца тэхнікай толькі як звычайнай прыладай, бо сёння тэхнакратычная парадыгма стала настолькі дамінуючай, што вельмі цяжка не выкарыстаць яе патэнцыял, а яшчэ цяжэй

не паддацца яе логіцы. Антыкультурным стаў лічыцца выбар такога стылю жыцця, мэта якога хоць бы нават часткова магла б быць незалежнай ад тэхнікі, яе коштаў, а таксама яе глабальнай і масавай улады. Па сутнасці тэхніка імкнецца да таго, каб нішто не заставалася па-за яе жалезнай логікай, а «сучасны чалавек добра ведае, што ў тэхніцы не маецца на ўвазе канчаткова ні выгада, ні дабрабыт, а маецца на ўвазе толькі ўлада, крайне зразуметае панаванне ў новай структуры свету» [87] . Таму ён «хоча завалодаць элементамі прыроды і чалавечага існавання» [88] . Такім чынам змяншаецца магчымасць прыняцця рашэнняў, найбольш праўдзівай свабоды і прасторы для альтэрнатыўнай творчасці адзінак.

109. Тэхнакратычная парадыгма імкнецца ахапіць таксама эканоміку і палітыку. Эканоміка разглядае кожны тэхналагічны прагрэс у залежнасці ад прыбытку, не звяртаючы ўвагі на якія-небудзь магчымыя негатыўныя вынікі для чалавека. Фінансы прыгнятаюць рэальную эканоміку. Мы не зрабілі высноў з глабальнага фінансавага крызісу і вельмі павольна вучымся на прыкладзе дэградацыі прыроднага асяроддзя. Некаторыя лічаць, што сённяшняя эканоміка і тэхналогія вырашаць усе праблемы, звязаныя з навакольным асяроддзем, як сцвярджаецца ў ненавуковай мове, што праблемы голаду і галечы на свеце можна вырашыць проста праз само развіццё рынку. Гэта не пытанне эканамічных тэорый, якія сёння ніхто, напэўна, не асмеліцца бараніць, але іх закараненне ў фактычным развіцці эканомікі. Тыя, хто ўголас пра гэта не кажа, пацвярджаюць гэта фактамі, калі вы-казваюць уяўную бестурботнасць адносна адпаведнай колькасці прадукцыі, лепшага размеркавання дабротаў, адказнага клопату пра навакольнае асяроддзе або правоў будучых пакаленняў. Сваёй паставай сведчаць, што ім хапае імкнення да максімальнага прыбытку. Сам рынак не запэўнівае інтэгральнага чалавечага развіцця і сацыяльнай інтэграцыі [89] . У той час, калі «некаторыя групы цешацца ў пэўнай ступені раскошным і спажывецкім звышразвіццём, якое непрымальна кантрастуе з працяглымі сітуацыямі нечалавечай галечы» [90] , не ствараюцца аператыўна эканамічныя інстытуцыі і сацыяльныя праграмы, якія дазволяць найбяднейшым карыстацца асноўнымі рэсурсамі. Мы да канца не разумеем таго, якімі ёсць найглыбейшыя карані сённяшніх парушэнняў, звязаных з напрамкам, мэтамі, сэнсам і грамадскім кантэкстам тэхналагіч-нага і гаспадарчага развіцця.

110. Спецыялізацыя, уласцівая тэхналогіі, цягне за сабой вялікія праблемы з разуменнем цэласнасці. Фрагментарызацыя ведаў выконвае сваю функцыю, калі канкрэтна выкарыстоўваецца, але часта вядзе да страты сэнсу цэласнасці, повязяў, якія існуюць паміж рэчамі, шырокай перспектывы, сэнсу, які губляе значэнне. Тое самае перашкаджае знайсці адпаведныя спосабы вырашэння найбольш складаных праблем сучаснага свету, асабліва праблем навакольнага ася-роддзя і ўбогіх, да якіх нельга падыходзіць толькі з аднаго пункту гледжання або кіруючыся аднабаковымі інтарэсамі. Навука, якая прэтэндуе на вырашэнне важных пытанняў, абавязкова павінна ўлічваць усё тое, што нарадзіла чалавечае пазнанне ў іншых сферах ведаў, уключна з філасофіяй і сацыяльнай этыкай. Аднак сёння гэты спосаб дзеяння цяжка развіваць. З гэтай прычыны нельга нават распазнаць праўдівых этычных гарызонтаў, якія з’яўляюцца пунктам аднясення. Жыццё пачынае зводзіцца да

падпарадкавання ака-лічнасцям, абумоўленым тэхнікай, якая лічыцца галоўнай крыніцай інтэрпрэтацыі існавання. У гэтай канкрэтнай рэчаіснасці, якая кідае нам выклік, з’яўляюцца розныя сімптомы, што паказваюць памылко-васць, як напр.: дэградацыя навакольнага асяроддзя, неспакой, страта сэнсу жыцця і грамадскага суіснавання. Гэта ў чарговы раз паказвае, што «рэчаіснасць больш важная за ідэю» [91] .

111. Экалагічную культуру нельга зводзіць да серыі выпадковых і аднабаковых адказаў на праблемы, якія ўзнікаюць у сувязі з дэградацыяй навакольнага асяроддзя, вычарпаннем натуральных рэсурсаў і забруджваннем. Яна павінна быць іншым поглядам, мысленнем, палітыкай, адукацыйнай праграмай, стылем жыцця і духоўнасці, якія б надавалі форму супраціву экспансіі тэхнакратычнай парадыгмы. У адваротным выпадку нават найлепшыя экалагічныя ініцыятывы могуць канчаткова апынуцца ў межах той самай глабальнай логікі. Шуканне толькі тэхнічных прэвентыўных сродкаў на кожную праблему аховы навакольнага асяроддзя, якая толькі з’явіцца, азначае ізаляцыю спраў, якія на самай справе звязаны паміж сабою, а таксама ўкрыванне праўдзівых і глыбокіх праблемаў сусветнай сістэмы.

112. Аднак можна зноў пашырыць погляды, а чалавечая свабода здольная абмежаваць тэхніку, накіраваць яе, а таксама ўключыць у служэнне іншаму віду прагрэсу, больш здароваму і больш інтэгральнаму. Вызваленне з фактычна пануючай тэхнакратычнай парадыгмы мае часам месца ў некаторых сітуацыях. Напрыклад, калі супольнасць малых вытворцаў выбірае менш шкодныя сістэмы вытворчасці, падтрымліваючы некансумпцыйную мадэль жыцця, задавальнення і суіснавання; або, калі тэхніка накіравана перадусім на вырашэнне канкрэтных праблем чалавека, з абавязкам дапамагаць іншым, каб яны жылі з боль-шай годнасцю і менш цярпелі; або, калі творчыя пошукі прыгажосці і яе сузіранне змогуць перамяніць уладу прадметнасці ў нейкі від ацалення, якое адбываецца ў прыгажосці і ў асобе, якая ёю захапляецца. Праўдзівы гуманізм, які заахвочвае да новага сінтэзу, існуе сярод тэхналагічнай цывілізацыі амаль незаўважальна, як святло, якое пранікае пад замкнёныя дзверы. Ці будзе гэта няспынным абяцаннем, якое нягледзячы на ўсё нараджаецца як паслядоўны пратэст з боку таго, што з’яўляецца праўдзівым?

113. З другога боку, людзі, здаецца, ужо не вераць у шчаслівую будучыню, не спадзяюцца слепа на лепшае заўтра, бачучы сённяшні стан свету і цяперашнія магчымасці тэхнікі. Разумеюць, што поступ навукі і тэхнікі не раўназначны поступу чалавецтва і гісторыі, і можна заўважыць, што існуюць іншыя асноўныя шляхі да шчаслівай будучыні. Аднак мы не можам сабе ўявіць адмовы ад магчымасцяў, якія прапануе тэхналогія. Чалавецтва значна змянілася, а няспынная пагоня за навізной асвячае пэўную мімалётнасць, якая вядзе нас у адным напрамку – да павярхоўнасці. Нам цяжка затрымацца, каб адшукаць глыбіню жыцця. Калі архітэктура адлюстроўвае дух эпохі, то мегаструктуры і серыйныя дамы выяўляюць дух глабалізацыі тэхнікі, у якой няспынная навізна прадуктаў злучана з гнятучай нудою. Не будзем згаджацца з гэтым і не будзем адмаўляцца ад задавання сабе пытанняў наконт сэнсу і мэты ўсіх рэчаў. У адваротным выпадку мы апраўдаем фактычны стан рэчаў і будзем

патрабаваць больш замяніцеляў, каб вытрываць у гэтай пустцы.

114. Тое, што адбываецца, ставіць нас перад аблiччам рашучай неабходнасці распачаць смелую культурную рэвалюцыю. Навука і тэхналогія не з'яўляюцца нейтральнымі, але могуць пацягнуць за сабой ад пачатку да канца працэсу розныя інтэнцыі і магчымасці, а таксама могуць быць акрэслены розным чынам. Ніхто не жадае вярнуцца ў каменны век, але неабходна запаволіць крок, каб назіраць за рэчаіснасцю іншым чынам, збіраць станоўчыя і ўраўнаважаныя дасягненні і адначасова вярнуць каштоўнасці і вялікія мэты, знішчаныя неўтаймаванай маніяй велічы.

## III. Крызіс і вынікі сучаснага антрапацэнтрызму

115. Сучасны антрапацэнтрызм парадаксальна прывёў да таго, што тэхнічныя элементы сталі вышэй за рэчаіснасць, бо чалавек не заўважае ўжо прыроды «як пастаянна абавязковай нормы, і тым больш як жыццёвага прыбежышча. Ён глядзіць на яе без ніякіх гатовых канцэпцый, прадметна, як на месца і матэрыял сваёй творчасці, якой усё прысвячае, не думаючы аб тым, што будзе яе вынікам» [92] . Так малее каштоўнасць, якую свет мае сам у сабе. Аднак, калі чалавек не адкрывае свайго праўдзівага месца, то не можа правільна разумець самога сябе і прыходзіць да аспрэчвання ўласнай натуры. «Не толькі зямля дадзена чалавеку Богам, каб ён карыстаўся ёю, шануючы першапачаткова задуманае дабро, дзеля якога яна была дадзена яму, але таксама чалавек сам для сябе з'яўляецца дарам, атрыманым ад Бога, і таму павінен прымаць натуральную і маральную структуру, якой быў адораны» [93] .

116. У наш час наступіў значны рост антрапацэнтрызму, які ў новай форме надалей пагражае ўсялякаму разуменню чагосьці агульнага і ўсялякім спробам умацавання сацыяльных повязяў. Таму настала пара зноў звярнуць увагу на рэчаіснасць з абмежаваннямі, якія яна навязвае, якія ў сваю чаргу даюць магчымасці больш здаровага і плённага чалавечага і грамадскага развіцця. Неадпаведная прэзентацыя хрысціянскай атрапалогіі прывяла да распаўсюджвання памылковага пераканання адносна адносін чалавека са светам. Шматразова прадстаўлялася Праметэева мара панаваць над светам, якая стварала ўражанне, што клопат аб прыродзе — гэта справа слабых людзей. Між тым, правільная канцэпцыя чалавека як «гаспадара» Сусве-ту разумеецца ў сэнсе «адказнага распарадчыка» [94] .

117. Недахоп клопату аб абмежаванні шкодаў, учыненых прыродзе, а таксама экалагічныя вынікі рашэнняў з'яўляюцца толькі бачным адлюстраваннем недахопу зацікаўленасці ў прыняцці закліку, які ўпісаны ў структуры прыроды. Калі не прызнаецца ў самой сутнасці значэнне ўбогага чалавека, чалавечага эмбрыёну, інваліда — для прыкладу — цяжка будзе

пачуць заклік самой прыроды. Усё спалучана паміж сабою. Калі чалавек аб’яўляе сябе незалежным ад рэчаіснасці і становіцца абсалютным валадаром, рушыцца сама падстава яго існавання, бо «замест таго, каб выконваць ролю супрацоўніка Бога ў справе стварэння, чалавек займае Яго месца і ўрэшце выклі--кае бунт прыроды» [95] .

118. Гэтая сітуацыя вядзе нас да няспыннай шызафрэніі, што вынікае з тэхнакратычнай экзальтацыі, якая не прыпісвае іншым істотам адпаведнай ім каштоўнасці, аж да адмаўлення якой-небудзь асаблівай каштоўнасці чалавечай істоце. Аднак нельга не зважаць на чалавечнасць. Нельга стварыць новых адносінаў з прыродай без адноўленага чалавека. Няма экалогіі без адпаведнай антрапалогіі. Калі асоба чалавека ўспрымаецца толькі як нейкае чарговае існаванне сярод іншых, якое паходзіць з гульні лёсу або фізічнага дэтэрмінізму, «паўстае пагроза, што ўсведамленне адказнасці аслабне ў сумленні» [96] . Скажоны антрапацэнтрызм не павінен саступаць месца нейкаму «біяцэнтрызму», бо гэта азначала б памна-жэнне новага бязладдзя, якое не толькі не вырашыць праблемаў, але створыць новыя. Нельга патрабаваць ад чалавека актыўнасці ў свеце, калі не прызнаюцца і не падкрэсліваюцца адначасова яго асаблівыя здольнасці пазнавання, воля, свабода і адказнасць.

119. Крытыка скажонага антрапацэнтрызму не павінна таксама ставіць на другі план каштоўнасць міжчалавечых адносінаў. Калі экалагічны крызіс з’яўляецца выяўленнем або знешнім праяўленнем этычнага, культурнага і духоўнага крызісу сучаснасці, то не можам чакаць аздараўлення нашых адносінаў з прыродай і навакольным асяроддзем без аздараўлення ўсіх асноўных міжчалавечых адносінаў. Калі хрысціянская думка падкрэслівае асаблівую каштоўнасць чалавека па-над іншымі стварэннямі, то дае падставы, каб дацаніць кожную чалавечую асобу, а праз гэта заахвочвае да прызнання іншых. Адкрытасць на «ты», здольнае да пазнання, умілавання і дыялогу, надалей з’яўляецца праяўленнем высакароднасці чалавека. Таму адпаведныя адносіны са створанай рэчаіснасцю не патрабуюць аслаблення грамадскага вымярэння чалавечай істоты, а таксама яе трансэндэнтнага вымярэння, яе адкрытасці на Божае «Ты». Бо нельга прапанаваць адносінаў са светам без адносінаў з іншымі людзьмі. Гэта быў бы рамантычны індывідуалізм, схаваны пад маскай экалагічнай прыгажосці і ўдушлівай замкнёнасці ў іманэнцыі.

120. Паколькі ўсё паміж сабою звязана, немагчыма спалучыць ахову прыроды з апраўданнем абортаў. Працэс выхавання на карысць прыняцця слабых асобаў, якія жывуць вакол нас, якія часам з’яўляюцца дакучлівымі і дастаўляюць нам шмат клопату, немагчыма ажыццявіць, калі не акружаюць апекай чалавечы эмбрыён нягледзячы на тое, што яго з’яўленне можа быць прычынаю цяжкасцяў і праблем: «Калі губляецца асабістая і грамадская ўражлівасць да прыняцця новага жыцця, іншыя формы прыняцця, карысныя для грамадскага жыцця, таксама становяцца бясплённымі» [97] .

121. Мы чакаем выпрацоўкі новага сінтэзу, які пераможа фальшывую дыялектыку мінулых стагоддзяў. Хрысціянства, застаючыся верным сваёй тоеснасці і атрыманаму ад Езуса Хрыста скарбу праўды, няспынна нанова фарміруе сваю думку і бясконца выказва-ецца нанова ў дыялогу з новымі гістарычнымі сітуацыямі, дазваляючы, каб нанова квітнела яго спрадвечная навізна [98] .

Практычны рэлятывізм

122. Скажоны антрапацэнтрызм стварае прастору для скажонага стылю жыцця. У адгартацыі *Evangelii gaudium* я звярнуўся да практычнага рэлятывізму, характэрнага для нашай эпохі, сцвярджаючы, што ён «яшчэ больш небяспечны за дактрынальны рэлятывізм» [99] . Калі чалавек ставіць сябе ў цэнтры, то ў выніку аддасць прыярытэт таму, што з’яўляецца выгадным, а ўся рэшта становіцца ўмоўнай. Таму трэба звярнуць нашую ўвагу на тое, што разам з распаўсюджваннем тэхнакратычнай парадыгмы і праслаўленнем бясконцай чалавечай улады ў людзях развіваецца рэлятывізм, і ўсё, што не служыць іх уласным непасрэдным інтарэсам, губляе значэнне. У гэтым ёсць пэўная логіка, якая дазваляе нам зразумець, як узаемна ўзмацняюцца розныя паставы, якія выклікаюць адначасова дэградацыю навакольнага і грамадскага асяроддзя.

123. Культура рэлятывізму з’яўляецца той самай паталогіяй, якая абуджае дадзеную асобу выкарыстоўваць іншых і лічыць іх толькі прадметам, змушаючы да прымусовай працы або аддаючы ў няволю за даўгі. Гэта тая самая логіка, якая вядзе да адкідвання старэйшых асобаў, якія не служаць нашым інтарэсам, ці да сексуальнага выкарыстання дзяцей. Гэта таксама логіка тых, хто кажа: «Дазволім нябачным сілам рынку рэгуляваць эканоміку, бо іх шкодны ўплыў на грамадства і прыроду непазбежны». Калі няма ніякіх аб’ектыўных праўдаў, ні сталых прынцыпаў па-за заспакаеннем уласных надзей і зямных патрэбаў, якія абмежаванні могуць мець гандаль людзьмі, злачынныя арганізацыі, гандаль наркотыкамі, гандаль «крывавымі дыяментамі» ці скурамі рэдкіх жывёлаў? Ці ж не тая самая логіка рэлятывізму апраўдвае гандаль органамі людзей бедных, каб іх прадаць ці выкарыстаць для даследаванняў, або адкідванне дзяцей, бо яны не апраўдалі спадзяванняў сваіх бацькоў? Гаворка ідзе пра тую самую логіку «скарыстай і выкіні», якая вядзе да шматлікіх адходаў толькі з прычыны неўпарадкаванага жадання спажываць больш, чым трэба. Таму мы не можам думаць, што дастаткова палітычнай праграмы або моцы закону для прадухілення паводзінаў, якія наносяць шкоду навакольнаму асяроддзю, бо калі выключаецца культура і не прызнаюцца ўжо ніякія аб’ектыўныя праўды ці паўсюдна прынятыя прынцыпы, юрыдычныя законы будуць разумецца толькі як навязаныя гвалтоўна звонку і як перашкоды, якіх трэба пазбегнуць.

Неабходнасць абароны працы

124. У любой сферы інтэгральнай экалогіі, якая не выключае чалавечай істоты, неабходна браць пад увагу каштоўнасць працы, што было вельмі мудра прадстаўлена святым Янам Паўлам II у энцыкліцы *Laborem exercens*. Нагадаем, што згодна з біблійным апісаннем стварэння свету Бог змясціў чалавека ў толькі што створаным садзе (пар. 2, 15) не толькі для таго, каб ён клапаціўся аб тым, што існуе (даглядаў гэта), але каб у ім працаваў (апрацоўваў яго), каб ён прыносіў плады. Такім чынам работнікі і рамеснікі «падтрымліваюць спрадвечнае стварэнне» ( 38, 34). Па сутнасці ўмяшанне чалавека, якое запэўнівае разумнае развіццё стварэння, з'яўляецца найбольш адэкватнай формай клопату аб ім, бо прадугледжвае прыняцце паставы прылады Бога, каб дапамагаць у вызваленні патэнцыялу, які Ён сам упісаў у рэчы: «Пан стварыў з зямлі лекі, а мудры чалавек не будзе імі пагарджаць» ( 38, 4).

125. Калі мы задумваемся над адпаведнымі адносінамі чалавека з навакольным светам, то неабходна правільная канцэпцыя працы. Калі мы кажам пра адносіны чалавека да рэчаў, то паўстае пытанне пра сэнс і мэту чалавечай дзейнасці адносна рэчаіснасці. Мы кажам не толькі пра фізічную працу або працу на зямлі, але пра кожнае дзеянне, якое цягне за сабой пэўныя пераўтварэнні таго, што існуе, ад выпрацавання грамадскай навукі аж да плану тэхналагічнага развіцця. Кожная форма працы прадугледжвае пэўную ідэю адносінаў, якія чалавек можа і павінен устанаўліваць з тым, што з'яўляецца адрозным ад яго. Хрысціянская духоўнасць разам з кантэмпляцыйным захапленнем стварэннем, якое знаходзім у святога Францішка Асізскага, развіла таксама багатае і адпаведнае разуменне працы, як гэта бачна, напрыклад, у жыцці благаслаўлёнага Караля дэ Фуко і яго вучняў.

126. Нагадаем таксама некаторы досвед старажытнай манаскай традыцыі. На пачатку яна спрыяла пэўнаму спосабу ўцёкаў ад свету, ад гарадской дэкадэнцыі. Таму манахі шукалі пустыні, будучы перакана-нымі, што гэта адпаведнае месца для распазнання прысутнасці Бога. Пазней святы Бэнэдыкт з Нурсіі хацеў, каб яго манахі жылі ў супольнасцях, спалучаючы малітву і навуку з фізічнай працай (*Ora et labora*). Такое прадстаўленне фізічнай працы, напоўненай духоўным сэнсам, аказалася рэвалюцыйным. Вучыліся шукаць сталасці і асвячэння ва ўзаемным пранікненні працы і засяроджанасці. Гэты спосаб перажывання працы робіць нас здольнымі клапаціцца і шанаваць навакольнае асяроддзе, а таксама напаўняе здаровай мераю нашыя адносіны са светам.

127. Мы сказалі, што «чалавек — гэта творца, цэнтр і мэта ўсяго грамадска-эканамічнага жыцця» [100] . Аднак, калі чалавек губляе здольнасць сузірання і шанавання, узнікаюць умовы, у якіх сэнс працы скажаецца [101] . Трэба заўсёды нагадваць, што чалавек здольны «ў зямной сферы паляпшаць сваю долю, ісці шляхам маральнага ўдасканалення, развіваць духоўныя каштоўнасці» [102] . Праца павінна быць месцам гэтага шматграннага развіцця асобы, калі ўлічваюцца многія аспекты жыцця: крэатыўнасць, прагназаванне будучыні,

развіццё здольнасцяў, рэалізацыя каштоўнасцяў, камунікацыя з іншымі, пастава праслаўлення Бога. Таму глабальныя грамадскія рэаліі сучаснага свету па-за вузкімі інтарэсамі бізнесу і сумніўнай эканамічнай рацыянальнасці патрабуюць, «каб надалей было імкненне дасягнуць — — , ’ » [103] .

128. Мы пакліканы да працы з хвіліны нашага стварэння. Не трэба імкнуцца да таго, каб тэхналагічны прагрэс замяняў штораз больш чалавечую працу, праз што чалавецтва пашкодзіла б сабе. Праца — гэта неабходнасць, частка сэнсу жыцця на гэтай зямлі, спосаб сталення, чалавечага развіцця і асабістай рэалізацыі. Таму фінансавая дапамога ўбогім заўсёды павінна быць безадкладным вырашэннем, каб задаволіць пільныя патрэбы. Праўдзівай мэтаю павінна быць заўсёды забяспечванне ім магчымасці годнага жыцця дзякуючы працы. Аднак арыентацыя эканомікі прывяла да пэўных тэхналагічных паляпшэнняў, якія маюць на мэце зніжэнне коштаў прадукцыі праз змяншэнне колькасці працоўных месцаў і замену лю-дзей машынамі. Гэта чарговы спосаб, праз які дзеянні чалавека могуць звярнуцца супраць яго. Рэдукцыя працаўладкавання «мае таксама негатыўны ўплыў у эканамічнай сферы з-за ўзрастаючай эрозіі «грамадскага капіталу», г.зн. усёй сукупнасці адносінаў даверу, верагоднасці і шанавання норм, неадʼемных для кожнага грамадзянскага суіснавання» [104] . Канчаткова « ’ , а дрэннае функцыяна-ванне эканомікі цягне за сабой таксама чалавечыя страты» [105] . Спыненне інвестыцый у чалавека дзеля атрымання большага вельмі хуткага прыбытку — гэта найгоршы інтарэс для грамадства.

129. Каб надалей было магчымым прапанаванне працы, неабходна падтрымка гаспадаркі, якая спрыяе разнастайнасці прадукцыі і крэатыўнасці вытвор-час-ці. Напрыклад, існуе шмат розных малых вясковых хар-човых сістэм, якія надалей кормяць большасць насельніцтва свету, выкарыстоўваючы невялікую частку зямлі і вады, а таксама пакідаючы менш адходаў, ведучы гаспадарку на малых арэалах, у садах, займаючыся лоўляй, зборам лясных прадуктаў ці рыбалоўствам. Вялікія гаспадаркі, асабліва ў земляроб-стве, прымушаюць дробных земляробаў прадаваць сваю зямлю або пакідаць традыцыйныя віды земляробства. Спробы некаторых з іх перайсці да іншых, больш разнастайных формаў вытворчасці, аказваюцца ў выніку марнымі з прычыны цяжкага доступу да рэгіянальнага і глабальнага рынку або таму, што інфраструктура продажу і транспарту служыць вялікім прадпрыемствам. Улады маюць права і абавя--зак выразна і рашуча падтрымліваць дробных вытворцаў, а таксама дыверсіфікаваць прадукцыю. Для таго, каб існавала эканамічная свабода, якой бы фактычна карысталіся ўсе, часам неабходна абмежаваць тых, хто мае найбольшыя рэсурсы і фінансавыя магчымасці. Само абвяшчэнне эканамічнай свабоды, калі, аднак, рэальныя ўмовы даюць магчымасць доступу да яе многім і калі абмежаваны доступ да працы, становіцца дыскурсам, поўным супярэчнасцяў, які кампрамітуе палітыку. Вытворчасць — высакароднае пакліканне, якое імкнецца да стварэння дабротаў і ўдасканалення свету для ўсіх, можа быць вельмі плённым спосабам падтрымкі рэгіёну, у якім лакалізавана яе дзейнасць, асабліва, калі згаджаемся з тым, што стварэнне месцаў працы зʼяўляецца неадʼемнай часткай яе служэння на карысць агульнага

дабра.

Біялагічныя інавацыі,
што вынікаюць з навуковых даследаванняў

130. У філасофскай і тэалагічнай візіі чалавека і ства-рэння, якую я стараўся прапанаваць, выразна бачна, што чалавечая асоба, якая мае спецыяльныя дары розуму і ведаў, не з’яўляецца знешнім элементам, які павінен быць цалкам выключаны. Хоць чалавек можа ўмешвацца ў свет раслін і жывёлаў, а таксама карыстацца ім, калі гэта неабходна для яго жыцця, вучыць, што эксперыменты на жывёлах апраўданы толькі тады, калі «змяшчаюцца ў разумных межах і служаць лячэнню і ратаванню чалавечага жыцця» [106] . становўча нагадвае, што ўлада чалавека мае свае межы і што «годнасці чалавека супярэчыць непатрэбнае прычыненне цярпення жывёлам або іх забіццё» [107] . Усялякія эксперыменты або выкарыстанне стварэння «патрабуе рэлігійнага шанавання інтэгральнасці стварэння» [108] .

131. Я хацеў бы згадаць ураўнаважаную пазіцыю святога Яна Паўла II, які падкрэсліваў карысць навуковага і тэхнічнага прагрэсу, якая з’яўляецца «доказам шляхетнасці паклікання чалавека да адказнага ўдзелу ў стваральнай дзейнасці Бога ў свеце», і адначасова нагадваў, што «кожную дзейнасць у адной сферы экасістэмы трэба звязваць з яе ўплывам на іншыя сферы» [109] . Ён казаў, што Касцёл дацэньвае ўклад «даследаванняў і прымянення малекулярнай біялогіі, дапоўненых іншымі дысцыплінамі, такімі як генетыка і яе тэхналагічнае прымяненне ў земляробстве і вытворчасці» [110] , хоць таксама сцвердзіў, што гэта не можа весці да «ніякай бескантрольнай генетычнай маніпуляцыі» [111] , якая ігнаруе негатыўныя вынікі гэтых дзеянняў. Нельга стрымаць крэатыўнасці чалавека. Калі нельга забараніць артысту выяўляць свае творчыя здольнасці, то нельга таксама абмежаваць тых, хто мае асаблівыя дары для развіцця навукі і тэхнікі, і ўменні якіх былі дадзены Богам дзеля служэння іншым. Адначасова нельга абысціся без паўторнага разважання над мэтамі, вынікамі, кантэкстам, а таксама этычнымі абмежаваннямі гэтай чалавечай дзейнасці, якая ёсць формай улады і звязана з сур’ёзнай рызыкай.

132. У гэтым кантэксце трэба ўсебакова аналіза-ваць чалавечае ўмяшанне ў свет раслін і жывёлаў, якое цягне за сабой генерыраваныя біятэхналогіяй генетычныя мутацыі з мэтаю выкарыстання патэнцыялу матэрыяльнай рэчаіснасці. Пашана, якой вера адорвае розум, патрабуе звяртаць увагу на тое, што самі веды ў сферы біялагічных навук, здабытыя незалежна ад эканамічных інтарэсаў, могуць паказаць адносна біялагічных структур, а таксама іх магчымасцяў і мутацыі. У любым выпадку, абгрунтаванае ўмяшанне — гэта такое ўмяшанне ў прыроду, якое адбываецца, «каб дапамагчы ёй у адпаведным развіцці стварэння, якога жадаў Бог» [112] .

133. Цяжка выказаць пэўнае меркаванне на тэму развіцця генетычна мадыфікаваных арганізмаў (ГМА), раслінных і жывёльных, для медыцынскіх мэтаў або земляробства, бо яны могуць значна адрозніваецца паміж сабою і патрабуюць асобнай ацэнкі. З другога боку, пагрозы не заўсёды выкліка)ны ўласна тэхналогіяй, але яе неадказным або празмерным выкарыстаннем. Па сутнасці, генетычныя мутацыі былі і часта ствараюцца самой прыродай. Аднак тыя, што выклі-каны чалавекам, з’яўляюцца інавацыйнымі. Можна браць пад увагу ў гэтых разважаннях прыручэнне жывёлаў, скрыжаванне відаў і іншыя паўсюдна прынятыя практыкі. Трэба памятаць, што назіранне за бактэрыямі, якія натуральным чынам прывялі да зменаў у геноме расліны, дало пачатак даследаванням над генетычна мадыфікаваным збожжам. Аднак у прыродзе гэтыя працэсы маюць павольны тэмп, непараўнальны з хуткасцю, навязанай сучаснымі тэхналагічнымі працэсамі, нават, калі гэты прагрэс мае свае падставы ў шматвяковым развіцці навукі.

134. Нягледзячы на тое, што мы не маем канчатковых доказаў на тэму шкоды, якую магло б выклікаць у людзей трансгеннае збожжа, а ў некаторых рэгіёнах яго выкарыстанне прывяло б да эканамічнага развіцця, якое б вырашыла існуючыя праблемы, аднак існуюць сур’ёзныя цяжкасці, якіх нельга ігнараваць. На розных абшарах у выніку ўвядзення гэтых сартоў бачым большую канцэнтрацыю сельскагаспадарчых зямель у руках нямногіх, што вядзе да «паступовага знікнення дробных вытворцаў, якія ў выніку страты апрацаваных зямель былі вымушаны адмовіцца ад непасрэднай вытворчасці» [113] . Самыя слабыя з іх становяцца працаўнікамі ў няпэўнай прафесійнай сітуацыі, а многія сельскагаспадарчыя працаўнікі эмігруюць у бедныя гарадскія раёны. Пашырэнне такой апра--цоўкі зямлі знішчае складанае спляценне экасістэм, змяншае разнастайнасць прадукцыі і ўплывае на су-часнасць і будучыню рэгіянальных гаспадарак. У розных краінах мы назіраем тэндэнцыю развіцця алігаполіі ў вытворчасці насення і іншых прадуктаў, неабходных для вырошчвання, а залежнасць паглыбляецца, калі возьмем пад увагу вытворчасць стэрыльнага насення, што змушае земляробаў купляць іх у вытворцаў.

135. Няма сумненняў, што неабходна пастаянная ўвага, якая б вяла да аналізавання звязаных з гэтым усіх этычных аспектаў. Таму неабходны навуковыя і грамадскія дэбаты, адказныя і шырокія, здольныя ахапіць усю даступную інфармацыю і назваць рэчы па імені. Часам уся наяўная інфармацыя не раскрываецца, а адбіраецца паводле ўласных палітычных, эканамічных ці ідэалагічных інтарэсаў. Гэта ўскладняе фарміраванне меркавання, збалансаванага і разважлівага рашэння па розных пытаннях з улікам усіх датычных гэтага фактараў. Трэба падрыхтаваць платформу для дэбатаў, у якіх усе ўдзельнікі нейкім чынам непасрэдна або апасродкавана (земляробы, спажыўцы, улада, навукоўцы, вытворцы насення, насельніцтва, якое жыве каля палёў, дзе адбываецца знішчэнне шкоднікаў хімічнымі субстанцыямі і інш.) маглі б прадставіць свае праблемы або атрымаць доступ да шырокай і праўдзівай інфармацыі, каб пры-няць рашэнне на карысць агульнага дабра, цяперашняга і будучага. Справа ГМА — гэта складанае экалагічнае пытанне, якое патрабуе разгляду ўсіх яго аспектаў. Гэта патрабавала б прынамсі большых

намаганняў з мэтаю завяршэння розных незалежных і міждысцыплінарных даследаў, здольных унесці новае святло.

136. З іншага боку непакоіць факт, што калі некаторыя экалагічныя рухі бароняць інтэгральнасць навакольнага асяроддзя і справядліва патрабуюць абмежавання навуковых даследаў, то часам не прымяняюць гэтых жа прынцыпаў да жыцця чалавека. Калі робяцца эксперыменты на жывых чалавечых эмбрыёнах, то часта апраўдваецца парушэнне ўсялякіх межаў, забываючы, што неад’емная каштоўнасць чалавечай істоты значна выходзіць па-за ступень яе развіцця. Таксама, калі тэхніка не прызнае вялікіх этычных прынцыпаў, усялякае дзеянне лічыцца апраўданым. Як мы бачылі ў гэтым раздзеле, тэхніцы, аддзеленай ад этыкі, цяжка будзе абмежаваць сваю ўладу.

## РАЗДЗЕЛ ЧАЦВЁРТЫ

## ІНТЭГРАЛЬНАЯ ЭКАЛОГІЯ

137. Паколькі ўсё цесна звязана паміж сабою, а сён-няшнія праблемы патрабуюць разгляду ўсіх праяў глабальнага крызісу, я прапаную затрымацца цяпер над рознымі аспектамі інтэгральнай экалогіі, якая ахоп-лівала б выразнае чалавечае і грамадскае вымярэнне.

### I. Экалогія навакольнага асяроддзя, эканамічная і грамадская

138. Экалогія вывучае адносіны паміж жывымі арганізмамі і навакольным асяроддзем, у якім яны развіваюцца. Яна патрабуе разважанняў і дыскусіі на тэму ўмоў жыцця і існавання грамадства, праўдзівага аналізу мадэлі развіцця, вытворчасці і спажывання. Няма патрэбы зноў падкрэсліваць, што ўсё паміж сабою звязана. Час і прастора не з’яўляюцца незалежнымі, нават атамы і субатамныя часціцы не могуць разглядацца асобна. Так, як звязаны паміж сабою розныя элементы планеты — фізічна, хімічна і біялагічна — таксама жывыя віды ствараюць пэўную сетку, якую мы няспынна распазнаём і вучымся яе разумець. Значную частку нашай генетычнай інфармацыі мы падзяляем з многімі жывымі істотамі. Таму фрагментарныя і ізаляваныя веды могуць стаць формай няведання, калі не лучацца з больш шырокім бачаннем рэчаіснасці.

139. Кажучы пра «прыроднае асяроддзе», мы звяр-таемся таксама да асаблівых адносінаў паміж прыродай і чалавецтвам, якое жыве ў ёй. Гэта не перашкаджае разумець прыроду як

штосьці адрознае ад нас або як малазначную аправу нашага жыцця. Мы ўключаны ў яе, з’яўляемся яе часткай і аказваем узаемны ўплыў. Прычыны, па якіх нейкае месца аказваецца забруджаным, патрабуюць аналізу функцыянавання грамадства, яго гаспадаркі, паводзінаў і спосабу разумення рэчаіснасці. Беручы пад увагу шырокую скалу зменаў, немагчыма знайсці належны адказ на кожную канкрэтную праблему. Фундаментальнае значэнне мае пошук інтэгральных рашэнняў, якія зважаюць на інтэракцыю прыродных сістэм паміж сабою, а таксама з грамадскімі сістэмамі. Няма двух розных крызісаў: аднаго, звязанага з навакольным асяроддзем, а другога — з грамадствам, але існуе адзін складаны грамадска-экалагічны крызіс. Метады яго вырашэння патрабуюць інтэгральнага падыходу да барацьбы з убоствам, каб вярнуць годнасць адкінутым і адначасова паклапаціцца аб прыродзе.

140. З увагі на колькасць і разнастайнасць элементаў, якія трэба ўзяць пад увагу пры акрэсліванні ўплыву на асяроддзе канкрэтнай эканамічнай дзейнасці, неад’емным з’яўляецца прызнанне ролі навукоўцаў і аблягчэнне ім супрацоўніцтва з шырокім шанаваннем акадэмічнай свабоды. Гэты няспынны пошук вырашэнняў павінен таксама дазволіць распаз-наць, у якіх адносінах існуюць адрозныя арганізмы, утвараючы большыя адзінкі, якія сёння мы называем «экасістэмамі». Мы бяром іх пад увагу не толькі для таго, каб акрэсліць, якім павінна быць іх рацыянальнае выкарыстанне, але таму, што яны маюць унутраную каштоўнасць, незалежна ад выкарыстання. Як кожны арганізм з’яўляецца добрым і годным захаплення сам па сабе, бо з’яўляецца Божым стварэннем, тое ж адбываецца з гарманічнай еднасцю арганізмаў у дадзенай прасторы, якая функцыянуе як сістэма. Нават, калі мы гэтага не разумеем, то залежым ад гэтай цэласнасці, неабходнай для нашага існавання. Трэба памятаць, што экасістэмы ўдзельнічаюць у перамене вуглякіслага газу, у ачышчэнні вады, у пераадольванні хвароб і шкоднікаў, у фарміраванні глебы, у раскладзе адходаў, а таксама ў многіх іншых працэсах, пра якія мы за-бы-ваем або якія ігнаруем. Многія асобы, разумеючы гэта, нанова ўсведамляюць, што мы жывём і дзейнічаем у пэўнай папярэдне дадзенай нам рэчаіснасці, ранейшай за нашыя здольнасці і нашае існаванне. Таму, кажучы пра «збалансаванае выкарыстанне», заўсёды трэба памятаць пра здольнасці кожнай экасістэмы да рэгенерацыі ў яе розных абшарах і аспектах.

141. З другога боку, эканамічнае развіццё мае схільнасць да аўтаматызму і гомагенізацыі ў спрошчванні працэсаў і ў змяншэнні коштаў. Таму неабходна эканамічная экалогія, якая змушае да больш шырокага разумення рэчаіснасці. «Каб дасягнуць устойлівага развіцця, ахова навакольнага асяроддзя павінна быць неад’емнай часткай працэсу развіцця і не можа разглядацца асобна» [114] . Але адначасова пільнай становіцца патрэба гуманізму, які звяртаецца да розных сфер ведаў, у тым ліку да эканомікі, каб выпрацаваць найбольш усебаковае і інтэгральнае бачанне. Сёння аналіз праблем навакольнага асяроддзя непарыўна звязаны з аналізам сітуацыі чалавека, сям’і, працы, урбаністычнага кантэксту, а таксама адносінаў кожнай асобы да сябе, што ўплывае на пэўны спосаб кантакту з іншымі і з навакольным асяроддзем. Існуе інтэракцыя паміж экасістэмамі і светам розных грамадскіх

суаднясенняў, а таму ў чарговы раз аказваецца, што «паўната перавышае частку» [115] .

142. Калі ўсё звязана паміж сабою, то таксама стан інстытуцый грамадства мае ўплыў на навакольнае асяроддзе і якасць жыцця чалавека: «Кожнае парушэнне салідарнасці і грамадзянскага сяброўства нясе экалагічную шкоду» [116] . У гэтым кантэксце грамадская экалогія павінна быць інстытуцыянальнай і паступова ахапіць розныя вымярэнні, пачаўшы ад асноўнай грамадскай групы, ад сям'і, праз мясцовую супольнасць і народ, аж да міжнароднага жыцця. На кожным грамадскім узроўні і паміж імі развіваюцца інстытуцыі, якія рэгулююць міжчалавечыя адносіны. Усё, што прычыняе ім шкоду, цягне за сабою шкодныя вынікі, такія як страта свабоды, несправядлівасць і насілле. У некаторых краінах пануе часовая інстытуцыянальная сістэма за кошт цярпення насельніцтва, а іншыя атрымліваюць карысць з такога стану рэчаў. Як у межах дзяржаўнай адміністрацыі, так і ў разнастайных праявах грамадзянскай супольнасці або ва ўзаемных адносінах паміж жыхарамі мы часта сутыкаемся з нелегальнымі паводзінамі. Законы могуць рэдагавацца ў правільнай форме, але часта застаюцца мёртвай літарай. Таму ці можна мець надзею, што заканадаўства і нормы, звязаныя з навакольным асяроддзем, сапраўды будуць плённымі? Мы, напрыклад, ведаем, што краіны, якія маюць выразна акрэсленае заканадаўства наконт аховы лясоў, надалей з'яўляюц-ца маўклівымі сведкамі парушэння закону. Больш за тое, што адбываецца на адным абшары, непасрэдна або ўскосна ўплывае на іншыя рэгіёны. Таму, напрык-лад, спажыванне наркотыкаў у багатых грамадствах выклікае пастаянны або ўзрастаючы попыт на прадукты, якія паходзяць з бедных рэгіёнаў, дзе з'яўляецца карупцыя, знішчэнне жыцця і ўрэшце дэградацыя прыроднага асяроддзя.

## II. Экалогія культуры

143. Побач з прыроднай спадчынай, пад пагрозай знаходзіцца таксама гістарычная, мастацкая і культурная спадчына. Гэта частка самабытнасці дадзенага месца і падстава будавання горада з выгоднымі ўмовамі жыцця. Не маецца на ўвазе знішчэнне ці стварэнне новых гарадоў, гіпатэтычна больш экалагічных, у якіх не заўсёды хацелася б жыць. Трэба браць пад увагу гісторыю, культуру і архітэктуру пэўнага месца, улічваючы яго арыгінальную тоеснасць. Таму экалогія прадугледжвае таксама клопат пра культурныя багацці чалавецтва ў самым шырокім значэнні гэтага слова. Непасрэдна патрабуецца, каб пры разглядзе пытанняў, звязаных з навакольным асяроддзем, звярталася ўвага на мясцовыя культуры, распачынаючы дыялог паміж мовай навукова-тэхнічнай і бытавой. Гэта не тая культура, якая звяртаецца толькі да помнікаў мінулага, але перадусім жывая культура, дынамічная, якая заахвочвае да ўдзелу, і нельга забываць пра гэта тады, калі мы задумваемся над адносінамі чалавека з навакольным асяроддзем.

144. Спажывецкая візія чалавека, якая падтрымліваецца машынай сённяшняй

зглабалізаванай эканомікі, імкнецца да гомагенізацыі культуры і аслаблення вялізнай культурнай разнастайнасці, якая з’яўляецца скарбам чалавецтва. З гэтай прычыны прыкладваюцца намаганні вырашыць усе праблемы пры дапамозе адналітых юрыдычных або тэхнічных дзеянняў, што вядзе да ігнаравання складанасці мясцовай праблематыкі, якая патрабуе актыўнага ўдзелу жыхароў. Новыя працэсы, якія ўзнікаюць, не заўсёды могуць адпавя-даць схемам, устаноўленым звонку, але павінны вынікаць з мясцовай культуры. Паколькі жыццё і свет адзначаюцца дынамізмам, спосаб клопату пра свет таксама павінен быць эластычным і дынамічным. Чыста тэхнічным вырашэнням пагражае сканцэнтраванасць на сімптомах, якія не тоесныя найглыбейшым праблемам. Трэба ўзяць пад увагу перспектыву правоў народаў і культур, каб зразумець, што развіццё пэўнай грамадскай групы прадугледжвае гістарычны пра-цэс у вызначаным культурным кантэксце і патрабуе пастаяннага ўдзелу мясцовых суб’ектаў грамадства, . Нельга таксама навяз-ваць паняцця якасці жыцця, але трэба разумець яго ў межах свету сімвалаў і звычаяў, уласцівых кожнай групе людзей.

145. Шмат формаў празмернай эксплуатацыі і дэградацыі навакольнага асяроддзя можа вычэрпваць не толькі мясцовыя крыніцы ўтрымання, але таксама грамадскія рэсурсы, якія забяспечылі б трыванне таго стылю жыцця, які на працягу доўгага часу падтрымліваў культурную тоеснасць, а таксама сэнс існавання і сужыцця. Знікненне пэўнай культуры можа быць таксама або яшчэ больш сур’ёзнай справай за знікненне відаў жывёлаў або звяроў. Навязванне пэўнага гегемоннага стылю жыцця, звязанага з пэўным спосабам вытворчасці, можа быць таксама шкодным, як знішчэнне экасістэмы.

146. У гэтым кантэксце неабходна звярнуць асб-лівую ўвагу на супольнасці карэнных жыхароў з іх культурнымі традыцыямі. Яны не з’яўляюцца звычайнай меншасцю сярод іншых, але наадварот, павінны стаць галоўнымі партнёрамі, асабліва, калі маюцца на ўвазе вялікія праекты, што датычаць іх зямель. Бо для іх зямля не з’яўляецца эканамічным дабром, але дарам Бога і іх продкаў, якія ў ёй спачываюць, гэта святое месца, з якім яны павінны ўзаемадзейнічаць, каб захаваць сваю тоеснасць і каштоўнасць. Калі застаюцца на сваёй тэрыторыі, то менавіта яны могуць найлепш клапаціцца аб ёй. Аднак у розных частках свету іх змушаюць пакінуць свае землі, каб можна было на гэтых землях свабодна развіваць горназдабыўчыя, сельскагаспадарчыя або гандлёвыя праекты, якія не звяртаюць увагу на дэградацыю прыроды і культуры.

## III. Экалогія штодзённага жыцця

147. Каб было магчыма гаварыць пра праўдзівае развіццё, трэба пераканацца, ці адбываецца інтэгральнае паляпшэнне якасці чалавечага жыцця, што звязана з аналізам прасторы, на якой жывуць людзі. Навакольнае асяроддзе, якое нас акружае, уплывае на

наш погляд на жыццё, на спосаб адчування і дзеяння. Адначасова ў нашым пакоі, дома, на месцы працы ці ў мікраараёне мы выкарыстоўваем навакольнае асяроддзе, каб выявіць сваю тоеснасць. Мы стараемся прыстасавацца да атачэння, а калі яно неўпарадкаванае, акустычна ці візуальна хаатычнае, то празмер-насць імпульсаў выпрабоўвае нашыя намаганні ў развіцці інтэгральнай і шчаслівай тоеснасці.

148. Годнай здзіўлення з’яўляецца крэатыўнасць і велікадушша асобаў, а таксама груп, здольных перамагчы абмежаванні свайго асяроддзя праз змену негатыўных вынікаў, што вынікаюць з іх абумоўленасцяў, і тое, што яны вучацца арганізоўваць сваё жыццё ся-род бязладдзя і няпэўнасці. Напрыклад, у некаторых месцах, дзе фасады будынкаў вельмі знішчаныя, ёсць такія людзі, якія з вялікай годнасцю клапоцяцца пра ўнутраны строй сваіх дамоў ці адчуваюць там сябе добра дзякуючы сардэчнасці і сяброўству іншых. Станоўчае грамадскае жыццё жыхароў, якое абапіраецца на здзяйсненне дабра, становіцца святлом у навакольным асяроддзі, у якім на першы погляд немагчыма жыць. Часам заслугоўвае на пахвалу чалавечая экалогія, якую ўдаецца развіваць убогім сярод шматлікіх абмежаванняў. Пачуццю ўдушлівасці ў жылых агламерацыях і на прасторах з вялікай шчыльнасцю насельніцтва можна супрацьстаяць праз развіццё чалавечых адносінаў, напоўненых блізкасцю і сардэчнасцю, калі ствараюцца супольнасці, калі абмежаванні асяроддзя збалансаваны ў кожнай асобе, якая адчувае сваю прыналежнасць і ўключанасць у сетку супольнасці. Такім чынам кожнае месца перастае быць пеклам, а становіцца кантэкстам годнага жыцця.

149. Таксама даказана, што крайняя галеча ў некаторых асяроддзях, дзе не хапае гармоніі, прасторы і магчымасці інтэграцыі, спрыяе з’яўленню нечалавечых паводзінаў, а таксама маніпуляцыі людзьмі злачыннымі арганізацыямі. У выпадку жыхароў часовых мікрараёнаў ускраін штодзённы досвед пераходу ад перанаселенасці да грамадскай ананімнасці, якую адчуваюць у вялікіх гарадах, можа весці да пачуцця выкаранення, якое спрыяе асацыяльным паводзінам і насіллю. Я хацеў бы падкрэсліць, што любоў мацнейшая. Многія асобы ў гэтых умовах змаглі ўсталяваць адносіны прыналежнасці і суіснавання, што перамяняе перанаселенасць у досвед супольнасці, у якім трашчаць муры ўласнага «я» і пераадольваюцца бар’еры эгаізму. Гэты досвед супольнаснага выбаўлення часта абуджае крэатыўныя адносіны, накіраваныя на выпраўленне сітуацыі ў дадзеным будынку ці ў мікрараёне [117] .

150. Беручы пад увагу сувязь, якая існуе паміж гарадской прасторай і чалавечымі паводзінамі, асобы, якія праектуюць будынкі, мікрараёны, публічную прастору і гарады, патрабуюць досведу розных дысцыплін, якія дазваляюць зразумець працэсы, сімволіку і паводзіны людзей. Недастаткова імкнуцца да прыгажосці праектаў, бо яшчэ больш каштоўным з’яўляецца служэнне іншым відам прыгажосці: якасці жыцця людзей, іх гармоніі з навакольным асяроддзем, спатканню і ўзаемнай дапамозе. Таму вельмі важна, каб пункт бачання мясцовых жыхароў заўсёды ўносіў свой уклад ва ўрбаністычнае планаванне.

151. Трэба шанаваць агульную прастору, візуальную перспектыву і гарадскія дамінанты, якія развіваюць нашае пачуццё прыналежнасці, пачуццё закаранення, адчуванне таго, што «мы знаходзімся дома» ў агламе-рацыі, якая нас яднае. Важна, каб розныя часткі горада былі добра зынтэграваныя і каб жыхары мелі бачанне цэласнасці, а не замыкаліся ў сваім мікраараёне і не пазбягалі ўдзелу ў жыцці ўсяго горада як уласнай і агульнай з імі прасторы. Кожнае ўмяшанне ў гарадскі ці вясковы краявід павінна ўлічваць тое, што паасобныя элементы месца ствараюць пэўную цэласнасць, якая ўспрымаецца жыхарамі як вобраз згоды з яго багаццем значэнняў. Такім чынам іншыя перастаюць быць чужымі і могуць успрымацца як «мы», якое мы будуем разам. Па той жа прычыне, як у гарадскім, так і ў вясковым асяроддзі трэба захоўваць прастору, заўсёды абароненую ад умяшанняў чалавека, скіраваных на яе змену.

152. У многіх частках свету існуе адчувальны недахоп жылля, як на вёсцы, так і ў вялікіх гарадах. Адбываецца гэта таму, што дзяржаўны бюджэт зазвычай пакрывае толькі невялікую частку запатрабаванняў. Не толькі бедныя, але вялікая частка грамадства сустракаецца з сур’ёзнымі цяжкасцямі, калі прыходзіцца купляць уласнае жыллё. Яго наяўнасць мае вялікае значэнне для годнасці чалавека і развіцця сям’і. Гэта галоўнае пытанне «чалавечай экалогіі». Калі ў дадзеным месцы развіліся ўжо хаатычныя кангламераты часовых дамоў, то гаворыцца перадусім пра ўрбанізацыю гэтых мікраараёнаў, а не пра вынішчэнне і выгнанне іх жыхароў. Калі бедныя жывуць на забруджаных ускраінах або ў небяспечных кангламератах, то «калі гэтых людзей трэба перасяліць, неабходна загаддзя даць ім праўдзівую інфармацыю і прапанаваць ім альтэрнатыўнае годнае жыллё, каб не памнажаць іх пакутаў. Трэба задзейнічаць у гэтым непасрэдна зацікаўленых людзей» [118] . Адначасова крэатыўнасць павінна весці да інтэграцыі часовых раёнаў у межах гасціннага горада. «Якімі ж прыгожымі з’яўляюцца гарады, якія перамаглі хваравіты недавер і інтэгруюць тых, хто адрозніваецца, робячы з гэтай інтэграцыі новы элемент развіцця! Якімі ж прыгожымі з’яўляюцца гарады, архітэктурныя планы якіх поўныя прасторы, якая лучыць, не пера-шкаджае адносінам, спрыяе прызнанню іншага чалавека!» [119] .

153. Якасць жыцця ў горадзе ў значнай ступені звязана з транспартнымі сродкамі, якія часта становяцца прычынай вялікіх цяжкасцяў для жыхароў. Па гарадах кружыць шмат аўтамабіляў, якімі карыстаецца адна ці дзве асобы, і таму вулічны рух становіцца інтэнсіўным, узрастае ўзровень забруджванняў, выкарыстоўваецца вялізная колькасць неаднаўляемай энергіі, і неабходным становіцца будаванне большай лічбы дарог і паркінгаў, якія знішчаюць гарадскую тканку. Многія спецыялісты згодныя ў тым, што трэба аддаць першынство грамадскаму транспарту. Аднак некаторыя неабходныя дзеянні не будуць спакойна ўспрынятыя грамадствам, калі транспарт не будзе значна палепшаны. У многіх гарадах з-за цісканіны, нязручнасці, нізкай даступнасці паслуг і недахопу бяспекі карыстанне гарадскім транспартам прыніжае годнасць асобаў.

154. Прызнанне асаблівай годнасці чалавека часта кантрастуе з хаатычным жыццём, якое

павінны весці людзі ў нашых гарадах. Не трэба, аднак, забываць пра занядбанне і абыякавасць да некаторых жыхароў вёсак, куды не даходзяць асноўныя паслугі, а працаўнікі становяцца нявольнікамі без правоў і надзеі на больш годнае жыццё.

155. «Чалавечная экалогія» азначае таксама штосьці больш глыбокае: неад’емныя адносіны жыцця чалавека з маральным законам, упісаным у яго прыроду, адносіны, неабходныя для стварэння больш годнага навакольнага асяроддзя. Бэнэдыкт XVI сказаў, што існуе таксама «чалавечая экалогія», бо «таксама чалавек мае прыроду, якую павінен шанаваць і якой нельга маніпуляраваць паводле свайго меркавання» [120] . У сувязі з гэтым мы павінны пагадзіцца, што нашае цела ста-віць нас у непасрэдныя адносіны з атачэннем і іншымі жывымі істотамі. Прыняцце ўласнага цела як дару Бога неабходна для прыняцця ўсяго свету як дару Айца і супольнага дому, але логіка панавання над уласным целам пераменяецца часам у далікатную логіку панавання над стварэннем. Панаванне над уласным целам і прыняцце яго дзеля клопату аб ім і шанаванне яго значэння з’яўляецца асноўным элементам сапраўднай чалавечай экалогіі. Таксама ацэньванне ўлас-нага цела ў яго жаноцкасці і мужнасці неабходна для распазнання сябе ў сустрэчы з іншымі, адрознымі ад сябе. Такім чынам можна з радасцю прыняць спецыфічны дар другога ці другой як справы Бога Стварыцеля і ўзаемна ўзбагаціцца. Таму нездаровай з’яўляецца пастава чалавека, які намагаецца «сцерці адрозненне полу, бо не можа супаставіць сябе з ім» [121] .

## IV. Прынцып агульнага дабра

156. Чалавечная экалогія непарыўна звязана з паняццем агульнага дабра. Гэты прынцып адыгрывае цэнтральную і яднаючую ролю ў грамадскай этыцы. Гэта «сукупнасць умоў грамадскага жыцця, якія дазваляюць супольнасцям ці індывідуумам паўней і лягчэй дасягнуць уласнай дасканаласці» [122] .

157. Агульнае дабро прадугледжвае пашану чалавечай асобы з яе асноўнымі і неад’емнымі правамі, накіраванымі на яе інтэгральнае развіццё. Яно патрабуе таксама механізмаў дабрабыту і сацыяльнай бяспекі, а таксама развіцця розных пасрэдніцкіх груп паводле прынцыпу дапаможнасці. Сярод іх асабліва вылучаецца сям’я як асноўная ячэйка грамадства. Нарэшце, агульнае дабро патрабуе грамадскага спакою, а менавіта — бяспекі і стабільнасці пэўнага ладу. Гэты лад патрабуе звяртання асаблівай увагі на справядлівасць размеркавання, парушэнне чаго заўсёды нараджае насілле. Усё грамадства — а ў ім асаблівым чынам дзяржава — мае абавязак бараніць і прапагандаваць агульнае дабро.

158. У цяперашняй сітуацыі сусветнай супольнасці, у якой існуе шмат няроўнасці, а штораз больш асобаў адкідваецца, пазбаўляецца асноўных правоў, прынцып агульнага дабра, як лагічны і непазбежны вынік, адразу пераменяецца ў заклік аб салідарнасці і

прэферэнцыйнай аптацыі для ўбогіх. Гэтая аптацыя патрабуе высноў з паўсюднага прызначэння зямных даброт аў, як стараўся я выразіць гэта ў адгартацыі *Evangelii gaudium* [123] , патрабуе перадусім памяці пра вялізную годнасць убогага ў святле найглыбейшых перакананняў веры. Дастаткова паназіраць за рэчаіснасцю, каб зразумець, што гэтая аптацыя з’яўляецца сёння асноўным этычным патрабаваннем для плён--най рэалізацыі агульнага дабра.

## V. Справядлівасць паміж пакаленнямі

159. Паняцце агульнага дабра датычыць таксама будучых пакаленняў. Міжнародны эканамічны крызіс жорсткім чынам паказаў шкодныя вынікі, выкліканыя адсутнасцю клопату пра лёс будучых пакаленняў. Нельга казаць пра ўстойлівае развіццё без салідар-насці паміж пакаленнямі. Калі мы думаем пра сітуацыю, у якой перадаём планету будучым пакаленням, уваходзім у іншую логіку, у логіку бескарыслівага дару, які мы атрымліваем і пераказваем далей. Калі зямля дадзена нам, то мы не можам думаць зыходзячы толькі з утылітарнага крытэрыя эфектыўнасці і прадуктыў-насці для індывідуальнай карысці. Мы не кажам тут пра аптацыйную паставу, але пра асноўнае пытанне справядлівасці, бо зямля, якую мы атрымалі, належыць таксама тым, хто прыйдзе пасля нас. Біскупы Партугаліі заклікалі да прыняцця гэтага абавязку справядлівасці: «Навакольнае асяроддзе змяшчаецца ў логіцы пры-няцця. Гэта пазыка, якую кожнае пакаленне атрымлі-вае і павінна перадаваць наступным пакаленням» [124] . Такі шырокі погляд мае інтэгральная экалогія.

160. Які свет мы хочам перадаць тым, хто будзе пасля нас, падрастаючым дзецям? Гэтае пытанне датычыць не толькі навакольнага асяроддзя, бо нельга разглядаць гэтага пытання фрагментарна. У нашых развагах пра свет, які мы хацелі б пакінуць, мы думаем перадусім пра яго агульную прыналежнасць, яго сэнс, яго каштоўнасць. Калі не пульсуе ў іх гэтае асноўнае пытанне, то не думаю, каб нашая экалагічная занепакоенасць магла прывесці да істотных эфектаў. Але калі гэтае пытанне ставіцца адважна, то непазбежна вядзе нас да многіх іншых вельмі канкрэтных пытанняў: Навошта мы жывем у гэтым свеце? Навошта мы нара-дзіліся? Дзеля чаго мы працуем і змагаемся? Навошта мы патрэбныя зямлі? Таму недастаткова сказаць, што мы павінны непакоіцца пра будучыя пакаленні. Трэба разумець, што стаўкай з’яўляецца нашая годнасць. Гэта мы самі, як першыя, зацікаўленыя ў пераказе такой планеты, дзе чалавецтва, якое прыйдзе пасля нас, магло б жыць. Гэта наша драма, бо закранае сэнс нашага існавання на зямлі.

161. Нельга ўжо з пагардай і іроніяй адносіцца да катастрафічных прагнозаў. Мы маглі б пакінуць наступным пакаленням вельмі шмат развалін, пустынь і смецця. Тэмп спажывання, вытворчасць адходаў і змена навакольнага асяроддзя пераўзышлі магчы-масці планеты настолькі, што папярэдні стыль жыцця, які ўжо немагчыма захоўваць, можа закончыцца не

толькі катастрофай, як гэта сапраўды час ад часу адбываецца ў некаторых рэгіёнах. Злагоджванне вынікаў сённяшняй дыспрапорцыі залежыць ад таго, што мы сёння робім, асабліва ў сэнсе адказнасці, якую прыпішуць нам тыя, хто вымушаны будзе спазнаваць найгоршыя вынікі нашых дзеянняў.

162. Цяжкасць у сур'ёзным стаўленні да такога выкліку звязана з этычнай і культурнай дэградацыяй, якая спадарожнічае экалагічнай дэградацыі. Постмадэрністычным мужчынам і жанчынам няспынна пагражае празмерны індывідуалізм, а многія актуальныя грамадскія праблемы трэба звязваць з эга-істычным пошукам хуткага задавальнення, з крызісам сямейных і грамадскіх повязяў, з цяжкасцю ў прызнанні іншых. Шматразова мы маем дачыненне з празмерным і недальнабачным спажывецтвам бацькоў, што прычыняюць шкоду дзецям, якім штораз цяжэй набыць уласнае жыллё і стварыць сям'ю. Больш за тое, гэтая няздольнасць сур'ёзна думаць пра будучыя пакаленні звязана з нашай няздольнасцю да пашырэння перспектывы нашых клопататаў і мыслення пра тых, хто выключаны з развіцця. Не будзем губляцца ва ўяўленнях бедных будучыні, дастаткова, калі будзем памятаць пра бедных сёння, перад якімі няшмат гадоў жыцця на гэтай зямлі і якія не могуць больш чакаць. Таму «апрача патрэбы лаяльнай салідарнасці паміж пакаленнямі трэба падкрэсліць пільную маральную патрэбу новай салідарнасці ўнутры пакаленняў» [125] .

## ПЯТЫ РАЗДЗЕЛ

## ДЫРЭКТЫВЫ І ДЗЕЯННІ

163. Я спрабаваў паразважаць над актуальнай сітуацыяй чалавецтва, назіраючы таксама дэфармацыю ў свеце, у якім мы жывём, а таксама глыбока антрапагенныя прычыны дэградацыі навакольнага асяроддзя. Хоць гэтае разважанне ўжо само па сабе паказвае неабходнасць змены курсу і падказвае пэўныя дзеянні, то цяпер паспрабуем акрэсліць галоўныя шляхі дыялогу, якія дапамогуць нам пазбегнуць самаразбурэння, у якое мы акунаемся.

### I. Дыялог на тэму навакольнага асяроддзя ў міжнароднай палітыцы

164. У сярэдзіне мінулага стагоддзя, пасля пера-адолення шматлікіх цяжкасцяў, з'явілася тэндэнцыя разумення зямлі як айчыны, а чалавецтва як народу, які насяляе супольны дом. У свеце, дзе ўсе паміж сабою сузалежныя, не гаворыцца толькі пра разуменне таго, што негатыўныя вынікі стылю жыцця, вытворчасці і спажывецтва датычаць усіх. Маецца на ўвазе перадусім тое, каб прапанаваныя рашэнні вынікалі з глабальнай перспектывы, а не толькі

баранілі інтарэсы пэўных краін. Сузалежнасць прымушае нас думаць . Але тая самая інтэлігенцыя, якая была выкарыстана для вялізнага тэхналагічнага развіцця, не можа знайсці плённых спосабаў міжнароднага менеджменту, скі-раванага на вырашэнне сур’ёзных праблем навакольнага асяроддзя і грамадства. Каб справіцца з асноў-нымі праблемамі, якіх нельга вырашыць праз дзеянне паасобных краін, неад’емным становіцца глабальнае паразуменне, якое вяло б, напрыклад, да планавання збалансаванай і разнастайнай сельскай гаспадаркі, развіцця аднаўляемых і мала забруджвальных форм энергіі, пашырэння большай энергетычнай эфектыўнасці, развіццё лепшага распараджэнняляснымі і марскімі рэсурсамі, забеспячэння ўсеагульнага доступу да пітной вады.

165. Ведаем, што тэхналогія, заснаваная на спаль-ванні выкапнёвага паліва з высокай забруджвальнасцю, асабліва вугля, а таксама нафты і ў меншай ступені газу, павінна паступова замяняцца. У чаканні разнастайнага развіцця аднаўляемых крыніцаў энергіі, якое павінна ўжо пачацца, слушным з’яўляецца выбар меншага зла або арыентацыя на пераходныя механізмы. Аднак ў міжнароднай супольнасці не дасягнулі адпаведнай дамоўленасці пра адказнасць тых, хто павінен несці больш высокія выдаткі на энергетычную трансфармацыю. У апошнія дзесяцігоддзі пытанне абароны навакольнага асяроддзя выклікала шырокія публічныя дэбаты, якія прывялі да ўзрастання актыўнасці грамадзянскай супольнасці і велікадушнага прысвячэння. Палітыка і прадпрымальніцтва рэагуюць марудна, яны далёкія ад таго, каб справіцца з глабальнымі выклікамі. Таму можна сказаць, што калі чалавецтва постіндустрыяльнага перыяду застанецца ў памяці як адно з найбольш неадказных у гісторыі, то спадзяемся, што чалавецтва пачатку XXI стагоддзя будзе ўспамінацца таму, што велікадушна прыняло на сябе сур’ёзныя абавязкі.

166. Глабальны экалагічны рух прайшоў ужо доўгі шлях, узбагачаны намаганнямі многіх арганізацый грамадзянскай супольнасці. Немагчыма ўсе іх пера-лічыць, а таксама прасачыць гісторыю іх дасягненняў. Тым не менш, дзякуючы гэтаму прысвячэнню пытанні аховы навакольнага асяроддзя штораз часцей публічна абмяркоўвюцца і з’яўляюцца няспынным заклікам да разважанняў больш доўгай перспектывы. Аднак у мінулыя гады сусветныя сустрэчы, прысвечаныя навакольнаму асяроддзю, не споўнілі надзей з прычыны адсутнасці палітычнай волі, не прывялі таксама да сапраўды значных і плённых глабальных паразуменняў у сферы навакольнага асяроддзя.

167. Трэба згадаць Міжнародную Канферэнцыю пра Зямлю, якая адбылася ў 1992 годзе ў Рыа-дэ-Жа-нэйра. Там было абвешчана, што «чалавечая істота знаходзіцца ў цэнтры зацікаўленасці ў працэсе ўстойлівага развіцця» [126] . Разглядаючы некаторыя пункты Стакгольмскай дэкларацыі (1972), было вырашана распачаць міжнароднае супрацоўніцтва ў клопаце пра экасістэму ўсёй зямлі, пра абавязательствы тых, хто забруджвае навакольнае асяроддзе, да нясення любых звязаных з гэтым выдаткаў, пра абавязак ацэнкі ўплыву ўсялякіх прац або праектаў на навакольнае асяроддзе. Прапанавалася ўстанавіць ліміты канцэнтрацыі парніковых газаў у атмасферы з мэтаю прадухілення эфекту глабальнага

пацяплення. Была выпрацавана праграма дзейнасці, а таксама канвенцыя па ахове біялагічнай разнастайнасці, вызначаны прынцыпы ў сферы лясной гаспадаркі. Нягледзячы на тое, што гэтая канферэнцыя была сапраўды наватарскай і прарочай для свайго часу, канчатковыя ўмовы мелі нізкі ўзровень рэалізацыі. Не ўстаноўлена адпаведных механізмаў маніторынгу, перыядычнага перагляду і санкцый у выпадку парушэння пастаноў. Пераліча--ныя прынцыпы надалей патрабуюць эфектыўных і хуткіх шляхоў практычнай рэалізацыі.

168. У якасці станоўчага досведу можна назваць, напрыклад, Базэльскую канвенцыю пра небяспечныя адходы, з сістэмай паведамленняў, стандартаў і кантролю. Трэба згадаць таксама абавязковую канвенцыю пра міжнародны гандаль знікаючымі відамі дзікіх жывёлаў і раслін, якая правярае адпаведнае выкананне нормаў. Здаецца, што дзякуючы рэалізацыі Венскай канвенцыі па ахове азонавага слоя ў адпаведнасці з Манрэальскім пратаколам і яго дапаўненнямі, праблема знясілення гэтага слою ўвайшла ў фазу вырашэння.

169. Што да клопату пра біяразнастайнасць і апустыньванне, тут прагрэс значна меншы. Адносна змен клімату поступ, на жаль, вельмі абмежаваны. Скарачэнне выкідаў парніковых газаў патрабуе сумленнасці, мужнасці і адказнасці асабліва самых магутных краін, якія найбольш забруджваюць. Канферэнцыя Арганізацыі Аб’яднаных Нацый па ўстойліваму развіццю, вядомая як Рыа+20 (Рыа-дэ-Жанэйра, 2012), выдала таксама абшырную, але неэфектыўную заключную дэкларацыю. Міжнародныя перамовы не могуць значна развівацца з прычыны пазіцыі краін, якія ставяць уласныя нацыянальныя інтарэсы вышэй за глабальнае агульнае дабро. Тыя, хто будзе несці адказнасць за наступствы таго, аб чым мы стараемся прамаўчаць, бу-дуць памятаць пра гэты недахоп сумленнасці і адказнасці. Падчас падрыхтоўкі гэтай энцыклікі спрэчкі набралі асаблівую інтэнсіўнасць. Мы, веруючыя людзі, не можам перастаць маліцца да Бога аб пазітыўным развіцці цяперашніх дыскусій, каб будучыя пакаленні не неслі адказнасць за наступствы неразумных затрымак.

170. Некаторыя стратэгіі зніжэння выкідаў парніковых газаў імкнуцца да інтэрнацыяналізацыі экалагічных выдаткаў. Гэта можа прывесці да накладвання на найбольш убогія дзяржавы цяжкіх абавязацельстваў па скарачэнні выкідаў, параўнальных з тымі, якія накладваюцца на прамыслова развітыя краіны. Увядзенне гэтых мер ускладняе сітуацыю краін, якія найбольш патрабуюць развіцця. Такім чынам, пад выглядам клопату пра навакольнае асяроддзе з’яўляецца новая несправядлівасць. Таксама і ў гэтым выпадку няшчасці ідуць адно за адным. Паколькі вынікі кліматычных зменаў будуць адчувальныя доўгі час, нават, калі цяпер будуць прынятыя радыкальныя меры, некаторыя краіны з нізкімі даходамі будуць патрабаваць дапамогі ў прыстасаванні да ўжо ўзнікаючых з’яў, якія нано-сяць шкоду іх эканоміцы. Не выклікае сумненняў тое, што існуе агульная адказнасць, хоць і розная, проста таму, што, як сцвердзілі біскупы Балівіі, «краіны, якія скарысталі з высокай ступені прамысловага развіцця за кошт вялізных выкідаў парніковых газаў, маюць большую адказнасць у вырашэнні праблемаў, якія самі стварылі» [127] .

171. Стратэгія продажу «дазволаў на выкіды» можа прывесці да новай формы спекуляцыі і не будзе спрыяць скарачэнню глабальных выкідаў парніковых газаў. Гэтая сістэма здаецца хуткім і лёгкім вырашэннем, ствараючы выгляд пэўнай актыўнасці ў справе аховы навакольнага асяроддзя, але ніякім чынам не азначае радыкальнай змены, якой патрабуюць абставіны. Гэта можа быць проста адгаворкай, якая робіць магчымым стрыманне празмернага спажывання некаторымі краінамі і рэгіёнамі.

172. Прыярытэтам для бедных краін павінна быць ліквідацыя ўбоства і грамадскае развіццё іх жыхароў. Адначасова таксама яны павінны прааналізаваць скандальны ўзровень спажывецкай актыўнасці некаторых прывілеяваных груп насельніцтва або больш эфектыўна супрацьстаяць карупцыі. Зразумела, па-вінны таксама развівацца больш чыстыя формы вытворчасці энергіі, але ў гэтай сферы яны павінны разлічваць на дапамогу краін, якія развіліся за кошт цяперашняга забруджвання планеты. Непасрэднае выкарыстанне шчодрай сонечнай энергіі патрабуе ўвядзення механізмаў і датацый, каб краіны, што развіваюцца, мелі доступ да трансферу тэхналогіі, тэхнічнай дапамогі і фінансавых сродкаў. Аднак трэба заўсёды звяртаць увагу на спецыфічныя ўмовы, бо «не заўсёды правільна ацэньваецца згоднасць інфра-структур з кантэкстам, для якога яна прызначана» [128] . Кошты былі б нізкія, калі параўнаць іх з рызыкай, звязанай са зменамі клімату. У любым выпадку гэта перш за ўсё этычнае рашэнне, якое грунтуецца на салідарнасці ўсіх народаў.

173. Нам тэрмінова патрэбныя міжнародныя пагадненні, якія, улічваючы слабасць мясцовай улады, былі б паспяхова рэалізаваныя. Адносіны паміж дзяржавамі павінны аберагаць незалежнасць кожнай з іх, але таксама павінны ўстанавіць узгодненыя працэдуры, каб пазбегнуць мясцовых катастроф, якія маглі б прынесці шкоду ўсім. Неабходны глабальныя межы рэгулявання, якія б накладвалі абавязкі і прадухілялі недапушчальныя дзеянні, як напрыклад тое, што дзяржавы змяшчаюць у іншых краінах адходы, а таксама вытворчасць, якая сур’ёзна забруджвае навакольнае асяроддзе.

174. Згадаем таксама пытанне сістэмы  рэсурсамі акеану. Хоць існуюць розныя міжнародныя і рэгіянальныя канвенцыі, да аспрэчвання ўсялякіх намаганняў прыводзіць раздрабненне і адсутнасць суровых механізмаў рэгулявання, кантролю і санк-цый. Надалей асаблівым выклікам з’яўляецца ўзрастаючая праблема марскіх адходаў, а таксама ахова марскіх абшараў, што знаходзяцца па-за межамі паасобных краін. Сцісла кажучы, мы патрабуем паразумення ў справе глабальных сістэмаў  для ўсёй сферы гэтак званых «глабальных агульных дабротаў».

175. Тая самая логіка, якая ўскладняе прыняцце радыкальных дзеянняў з мэтаю прадухілення тэндэнцыі глабальнага пацяплення, не дазваляе ліквідаваць убоства. Мы патрабуем глабальнай рэакцыі, больш адказнай, якая б адначасова супрацьстаяла абмежа-ванню выкідаў і спрыяла развіццю краін і бедных рэгіёнаў. XXI стагоддзе, захоўваючы сістэму , уласцівую мінулым часам, з’яўляецца сведкам аслабення ўлады

нацыянальных дзяржаў перадусім таму, што эканамічна-фінансавыя структуры наднацыянальнага характару імкнуцца панаваць над палітыкай. У гэтым кантэксце неад’емным становіцца сталенне больш моцных і актыўна арганізаваных міжнародных інстытуцый, паўнамоцтвы якіх былі б справядліва размеркаваныя на падставе пагадненняў паміж нацыянальнымі ўрадамі, якія маюць магчы-масць санкцыяніравання. Як сцвярджаў Бэнэдыкт XVI, працягваючы напрамак сацыяльнага вучэння Касцёла, «існуе пільная патрэба праўдзівай палітычнай міжнароднай улады — акрэсленай ужо маім папярэднікам, благаслаўлёным Янам XXIII — для кіравання сусветнай эканомікай; для аздараўлення гаспадарак, закранутых крызісам; для прадухілення паглыблення крызісу і вынікаючых адсюль парушэнняў раўнавагі; для правядзення адпаведнага поўнага раззбраення, а таксама для гарантыі харчовай бяспекі і спакою, для гарантыі аховы навакольнага асяроддзя і рэгулявання міграцыйных рухаў» [129] . У такой перспектыве беспрэцэдэнтнае значэнне атрымлівае дыпламатыя, якая можа прычыніцца да пашырэння міжнародных стратэгій для прадухілення самых сур’ёзных праблем, якія ў выніку прыносяць шкоду ўсім.

## II. Дыялог, скіраваны да новай палітыкі ў агульнанацыянальным і мясцовым вымярэнні

176. Пераможцы і пераможаныя ёсць не толькі паміж дзяржавамі, але таксама ўнутры бедных краін, дзе трэба вызначыць межы адказнасці. Таму праб-ле-мы, звязаныя з аховай навакольнага асяроддзя і эканамічным развіццём ужо нельга фармуліраваць, беручы пад увагу толькі розніцу паміж краінамі, бо яны патрабуюць улічваць нацыянальную і мясцовую палітыку.

177. Сутыкнуўшыся з перспектывай неадказнага выкарыстння здольнасцяў чалавека, кожная дзяржава мае неад’емныя функцыі, як, напрыклад, планаванне, каардынацыя, маніторынг і пакаранне на ўласнай тэрыторыі. Як грамадства арганізуе і ахоўвае сваё развіццё ў сітуацыі няспынных тэхналагічных інавацый? Адным з элементаў, які дзейнічае як эфектыўны мадэратар, ёсць закон, які ўстанаўлівае правілы дазволеных паводзінаў у святле агульнага дабра. Абмежаванні, якія павінна ўстанаўліваць здаровае, сталае і незалежнае грамадства, звязаныя з адпаведна ўрэгуляванымі прагназаваннем і прадбачаннем, чуваннем над захаваннем норм, барацьбой з карупцыяй, аператыўным кантролем непажаданых вынікаў вытворчых працэ-саў, а таксама адпаведнымі захадамі па прадухіленні патэнцыяльнай і неакрэсленай небяспекі. Існуе штораз багацейшае заканадаўства, якое мае на мэце зменшыць вынікі забруджвання навакольнага асяроддзя праз эканамічныя ініцыятывы. Аднак палітычная і інстытуцыянальная структура існуе не толькі для таго, каб пазбегнуць дрэнных практык, але таксама для таго, каб заахвоціць да добрых, каб абудзіць крэатыўнасць у пошуку новых шляхоў спрыяння асабіс--тым і калектыўным ініцыятывам.

178. Драма палітыкі, якая сканцэнтравана на непасрэдных выніках і падтрымліваецца таксама праз спажывецкае насельніцтва, нараджае неабходнасць кароткатэрміновага развіцця. Адказваючы на выбарчыя інтарэсы, урады не так лёгка ідуць на тое, каб дражніць людзей дзеяннямі, якія маглі б парушыць узровень спажывецтва або паставіць пад пагрозу замежныя інвестыцыі. Недальнабачнасць уладных структур замінае ўключэнню перспектыўнай праграмы аховы навакольнага асяроддзя ў грамадскія ўрадавыя праграмы. Такім чынам мы забываем, што «час перавышае прастору» [130] , што нашае дзеянне заўсёды больш плённае, калі мы больш клапоцімся пра развіццё генерацыі, чым пра апанаванне прасторы ўлады. Палітычная веліч выяўляецца тады, калі ў цяж-кія хвіліны мы дзейнічаем згодна з вялікімі прынцыпамі і думаем у перспектыве агульнага дабра. Палітычнай уладзе вельмі цяжка прыняць гэты абавязак у нацыянальным вымярэнні.

179. У некаторых месцах развіваюцца кааператывы дзеля выкарыстання аднаўляемых крыніц энергіі, што дазваляе быць самадастатковымі, а нават прадаваць лішкі. Гэты просты прыклад паказвае, што хоць існуючы парадак свету не ў стане ўзяць на сябе адказнасці, мясцовая арганізацыя можа штосьці змяніць. Бо там можа паўстаць большая адказнасць, моцнае пачуццё супольнасці, асаблівая здольнасць да клопату і больш велікадушная крэатыўнасць, глыбокая любоў да сваёй зямлі. Там думаюць таксама пра тое, што будзе пера-дадзена дзецям і ўнукам. Гэтыя каштоўнасці вельмі моцна закаранёныя ў мясцовым насельніцтве. Беручы пад увагу тое, што часам закон у выніку карупцыі аказваецца бездапаможным, неабходна палітычнае рашэнне, прынятае пад ціскам насельніцтва. Грамадства праз пазаўрадавыя арганізацыі і таварыствы-пасрэднікі павінна прымусіць урад выпрацаваць стандарты, працэдуры і больш строгі кантроль. Калі грамадзяне не кантралююць палітычнай улады — агульнанацыянальнай, рэгіянальнай і мясцовай — то немагчыма таксама ліквідаванне экалагічных шкодаў. З другога боку, нормы самакіравання могуць быць больш плённымі, калі існуюць пагадненні паміж суседнімі групамі насельніцтва дзеля падтрымання той самай палітыкі аховы навакольнага асяроддзя.

180. Нельга думаць пра аднолітыя рэцэпты, бо кожная краіна ці рэгіён мае свае спецыфічныя праблемы і ўласныя абмежаванні. Гэта праўда, што палітычны рэалізм можа патрабаваць сродкаў і пераходных тэхналогій з умоваю, што сапутнічае ім праект і прыняцце прагрэсіўных абавязковых абавязацельстваў. Адначасова, аднак, на нацыянальным і мясцовым узроўні трэба яшчэ многае зрабіць, напрыклад, пашырыць спосабы зберажэння энергіі. Гэта азначае падтрымку формаў прамысловай вытворчасці, якая адзначаецца максімальнай энергетычнай эфектыўнасцю і зніжэннем спажывання сыравіны, выдаленнем з рынку не-эфектыўных з пункту гледжання выкарыстання энергіі вырабаў або тых, якія найбольш атручваюць навакольнае асяроддзе. Мы можам таксама прыгадаць добрае кіраванне транспартам або будаўнічай тэхнікай і мадэрнізацыю будынкаў, што змяншае выкарыстанне энергіі і ўзровень забруджвання. Больш за тое, мясцовыя палітычныя дзеянні могуць быць накіраваныя на мадыфікацыю спажывецтва, развіццё гаспадаркі, якая грунтуецца на перапрацоўцы, што запэўнівае зніжэнне адходаў, ахову

пэўных відаў, а таксама планаванне збалансаванай сельскай гаспадаркі з сяўбазваротам. Можна заахвочваць да паляпшэння сельскай гаспадаркі бедных рэгіёнаў праз інвестыцыі ў вясковую інфраструктуру, арганізацыю мясцовых рынкаў або нацыянальнага рынку праз сістэму абваднення, развіццё збалансаваных тэхнік у сельскай гаспадарцы. Можна аблегчыць спосабы супрацоўніцтва або грамадскай арганізацыі, што будзе спрыяць абароне інтарэсаў дробных вытворцаў і аберагаць мясцовыя экасістэмы ад рабавання. Можна зрабіць многае!

181. Неабходна бесперапыннасць, бо нельга перамяняць прынцыпы, звязаныя са зменамі клімату і ахоўай навакольнага асяроддзя за кожным разам, калі змяняецца ўрад. Дасягненне вынікаў патрабуе шмат часу і неадкладных выдаткаў, але вынікаў нельга прадставіць на працягу аднаго тэрміну ўлады. Таму таксама, без націску жыхароў і ўстаноў, заўсёды будзе неахвота распачаць дзеянні, асабліва калі трэба задаволіць іншыя пільныя патрэбы. Калі які-небудзь палітык бярэ на сябе гэтае заданне, уключна з выдаткамі, якія з гэтым звязаны, то гэта супярэчыць скіраванай на эфектыўнасць і кароткатэрміновыя наступствы логі-цы эканомікі і бягучай палітыкі. Аднак, калі адважыцца гэта зрабіць, то зноў распазнае годнасць, якой адарыў яго Бог як чалавека, і ён пакіне пасля сябе сведчанне сапраўднай адказнасці. Трэба адвесці больш месца здаровай палітыцы, здольнай да рэфармавання інстытуцый, каардынавання іх і запэўнівання ім добрых практык, каб пераадолець ціск і інерцыю. Аднак трэба дадаць, што найлепшыя механізмы ў канчатковым выніку не апраўдваюць сябе, калі не хапае гуманістычнага разумення, вялікіх мэтаў, каштоўнасцяў, здольных надаць кожнаму грамадству шляхетную матывацыю і велікадушша.

## III. Дыялог і празрыстасць у прыняцці рашэнняў

182. Прагназаванне ўплыву ініцыятыў у сферы прадпрымальніцтва і праектаў адносна навакольнага асяроддзя патрабуе празрыстых палітычных рашэнняў і дыялогу, а карупцыя, якая замоўчвае праўдзівы ўплыў дадзенага праекта на навакольнае асяроддзе ўзамен за паслугі, часта вядзе да неадназначных кантрактаў, пазбягаючы абавязку інфармавання і паглыбленага абмеркавання.

183. Вывучэнне ўплыву на навакольнае асяроддзе не павінна быць пазнейшым за распрацоўку вытворчых праектаў ці якой-небудзь палітыкі, плану або праграмы. Яно павінна належаць да такой дзейнасці з самага пачатку і мець празрысты міждысцыплінарны характар, а таксама павінна распрацоўвацца незалежна ад якога-небудзь эканамічнага або палітычнага ціску. Неабходна, каб яно было спалучана з аналізам умоў працы і магчымага ўплыву на фізічнае і псіхічнае здароўе асобаў, на мясцовую эканоміку ці бяспеку. Дзякуючы гэтаму магчыма больш рэалістычнае прагназаванне эканамічных вынікаў з улікам магчымых сцэнарыяў і прадбачанне магчымых патрэбаў у большых інвестыцыях з мэтаю прадухілення

непажаданых эфектаў. Заўсёды трэба дасягнуць кансенсусу паміж рознымі грамадскімі суб'ектамі, якія могуць унесці розныя перспектывы, вырашэнні і альтэрнатывы. Але прывілеяванае месца ў дэбатах павінны мець жыхары дадзенага месца, якія разважаюць над тым, чаго прагнуць для сябе і сваіх дзяцей. Яны таксама могуць улічваць мэты, якія выходзяць па-за зямны эканаміч-ны інтарэс. Мы павінны перастаць думаць пра «умяшанне» ў навакольнае асяроддзе, а імкнуцца да разгледжаных і абмеркаваных усімі зацікаўленымі бакамі дзеянняў. Удзел патрабуе, каб усе былі адпаведна паінфармаваныя пра розныя аспекты, а таксама пра розныя небяспекі і магчымасці. Нельга абмяжоўвацца толькі пачатковымі рашэннямі на тэму дадзенага праекту, бо неабходны таксама пастаянны кантроль дзеянняў і маніторынгу. У навуковых і палітычных дыскусіях патрэбна шчырасць і праўдзівасць, а не толькі разважанні наконт таго, што закон дазваляе ці што забараняе.

184. Калі паўстаюць магчымыя пагрозы для навакольнага асяроддзя, якія датычаць сённяшняга і будучага агульнага дабра, то трэба, каб «рашэнні былі прыняты на падставе параўнання рызыкі і выгады, магчымых у кожным альтэрнатыўным выбары» [131] . Асабліва гэта адносіца да сітуацыі, калі праект можа выклікаць павелічэнне здабычы натуральных рэсурсаў, выкідаў і скідаў, выпрацавання адходаў або істотных зменаў у ландшафце, у месцах ахоўных відаў ці ў публічнай прасторы. Некаторыя праекты, без дакладнага аналізу, могуць глыбока парушыць якасць жыцця ў дадзеным месцы з розных прычын, такіх як непрадбачаныя шумавыя пагрозы, абмежаванне поля бачання, страта культурных каштоўнасцяў, вынікі выкарыстання ядзернай энергіі. Спажывецкая культура, якая аддае перавагу асабістым інтарэсам і таму, што дасягальна цяпер, можа спрыяць празмернай паспешнасці ў дзеянні або дазволіць замоўчваць інфармацыю.

185. У кожнай дыскусіі, якая датычыць ініцыятыў у сферы прадпрымальніцтва, трэба задаць сабе шэраг пытанняў для распазнання, ці прычыніцца да праўдзівага інтэгральнага развіцця: З якой мэтаю? Навошта? Дзе? Калі? Якім чынам? Для каго? Якія ёсць пагрозы? Якім коштам? Хто аплачвае выдаткі і як іх аплачвае? У гэтым аналізе ёсць пытанні, якія павінны быць прыярытэтнымі. Мы ведаем, напрыклад, што вада з'яўляецца недастатковым і неабходным рэсурсам. Больш за тое, доступ да яе з'яўляецца асноўным правам, які абумоўлівае магчымасць карыстання іншымі правамі чалавека. Гэта не падлягае сумненню і выходзіць па-за ўсялякія аналізы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе рэгіёна.

186. У Дэкларацыі з Рыа ў 1992 годзе было сцверджана, што «там, дзе ёсць небяспека сур'ёзных або незваротных зменаў, недахоп абсалютнай навуковай упэўненасці не можа быць прычынай спазнення эфектыўных дзеянняў» [132] , якія прадухілялі б дэградацыю навакольнага асяроддзя. Гэты прынцып асцярожнасці дазваляе абараняць самых слабых, якія маюць невялікія сродкі для абароны і прадстаўлення неабвержных доказаў. Калі аб'ектыўная інфармацыя вядзе да прадбачання сур'ёзнай і непапраўнай шкоды, нават калі б не было яе непасрэднага пацвярджэння, то кожны праект павінен быць спынены або зменены. Таму вага доказу не з'яўляецца істотнай, бо ў гэтых выпадках мы павінны

запэўніць аб’ектыўны і пераканаўчы аргумент, што планаваная дзейнасць не прынясе шкоду прыроднаму асяроддзю ці людзям, якія там жывуць.

187. Гэта не азначае супраціўлення ўсялякім тэхналагічным інавацыям, якія могуць палепшыць якасць жыцця насельніцтва. У любым выпадку павінна быць зразумела, што рэнтабельнасць не можа быць адзіным крытэрыем, які трэба ўлічваць, а таксама, што ў хвіліну з’яўлення новых меркаванняў у сувязі з развіццём інфармацыі, неабходна новая ацэнка з удзелам усіх зацікаўленых бакоў. Вынікам дыскусій можа быць рашэнне не працягваць праект, але мадыфікаваць яго або распрацаваць альтэрнатыўны.

188. Трывае дыскусія, у якой цяжка дасягнуць згоды, на тэму пытанняў, звязаных з прыродным асяроддзем. Яшчэ раз падкрэсліваю, што Касцёл не імкнецца фармуліраваць навуковыя пытанні ці змяніць палітыку, але заахвочвае да шчырых і празрыстых дэбатаў, каб індывідуальныя патрэбы або ідэалогіі не прыносілі шкоду агульнаму дабру.

## IV. Дыялог палітыкі і эканомікі на карысць паўнаты чалавецтва

189. Палітыка не павінна падпарадкоўвацца эканоміцы, а тая ў сваю чаргу не павінна залежыць ад меркавання і эфектыўнасці тэхнакратычнай парадыгмы. Сёння, думаючы перадусім пра агульнае дабро, мы асаб-ліва патрабуем, каб палітыка і эканоміка, трываючы ў дыялогу, рашуча служылі жыццю, асабліва чалавечаму жыццю. Вызратаванне банкаў любым спосабам за кошт грамадства, без дэтэрмінацыі, дзеля рэвізіі і перамены ўсёй сістэмы, пацвярджае абсалютнае панаванне такіх фінансавых сістэм, якія не маюць будучыні і здольныя нараджаць новыя крызісы пасля доўгага, дарагога і ўяўнага лячэння. Фінансавы крызіс 2007–2008 гадоў быў прычынай развіцця новай, больш чулай да этычных прынцыпаў эканомікі, а таксама новага рэгулявання спекулятыўнай фінансавай дзейнасці і віртуальнага багацця. Але на гэта не было рэакцыі, якая б спрыяла разважанню над састарэлымі крытэрыямі, якія надалей кіруюць светам. Прадукцыя не заўсёды з’яўляецца рацыянальнай і часта зале-жыць ад зменлівасці эканомікі, якая надае прадуктам каштоўнасць, што не адпавядае іх рэальнаму кошту. Часты вынік гэтага — перавытворчасць пэўных тавараў, што вядзе да неапраўданых экалагічных стратаў, якія адначасова шкодзяць многім рэгіянальным гаспадаркам [133] . «Фінансавая бурбалка» звычайна з’яўляецца таксама «бурбалкай вытворчасці». Карацей кажучы, няма рашучага супрацьстаяння праблемам рэальнай эканомікі, якая дае магчымасць дыверсіфікацыі і ўдасканалення прадукцыі, каб прадпрыемствы дзейнічалі правільна, каб развіваўся малы і сярэдні бізнес, ствараючы працоўныя месцы і г.д.

190. У гэтым кантэксце мы павінны заўсёды памятаць, што «нельга гарантаваць ахову навакольнага асяроддзя толькі на аснове фінансавага падліку выдаткаў і выгод. Прыроднае

асяроддзе з’яўляецца адной з тых дабротаў, якія рынкавыя механізмы не ў стане адпаведным чынам падтрымліваць і ахоўваць»[134]. У чарговы раз трэба пазбягаць магічнай канцэпцыі рынку, быццам бы праблемы можна вырашыць толькі за кошт павелічэння прыбытку фірм або прыватных асобаў. Ці рэальна чакаць, што той, хто апантаны максімалізацыяй прыбытку, спыніцца, каб падумаць пра знішчэнне прыроднага асяроддзя, якое пакіне будучым пакаленням? У схеме даходаў няма месца думкам пра рытм прыроды, пра перыяды яе дэградацыі і рэгенерацыі ці пра склада-насць экасістэм, якія могуць адчуць сур’ёзныя страты ў выніку ўмяшання чалавека. Больш за тое, калі мы кажам пра біяразнастайнасць, то ў найлепшым выпадку мы думаем пра яе як пра рэзервуар эканамічных рэсурсаў, якія можна было б выкарыстаць, але сур’ёзна не разглядаем рэальных коштаў рэчаў, іх значэнне для людзей і культур, інтарэсаў і патрэбаў бедных.

191. Калі мы закранаем гэтыя пытанні, некаторыя рэагуюць, абвінавачваючы іншых у спробе ірацыянальнага стрымання поступу і развіцця чалавека. Аднак мы павінны быць перакананыя, што запавольванне пэўнага тэмпу вытворчасці і спажывання можа весці да іншага віду поступу і развіцця. Імкненні да збалансаванага выкарыстання прыродных рэсур-саў не з’яўляюцца лішнімі, але перадусім інвестыцыяй, якая можа запэўніць іншыя эканамічныя карысці ў сярэдняй перспектыве. Калі не маем абмежаваных гарызонтаў, то можам адкрыць, што дыверсіфікацыя больш інавацыйнай вытворчасці, пры меншым уз-дзеянні на навакольнае асяроддзе, можа быць вельмі прыбытковай. Маецца на ўвазе адкрыццё новых шляхоў для розных магчымасцяў, якія не стрымліваюць крэатыўнасці чалавека і яго мараў, а ў большасці накіроўваюць гэтую энергію па-новаму.

192. Напрыклад, шлях больш творчага і лепш на-кіраванага развіцця вытворчасці можа карэкціраваць дыспрапорцыі паміж празмернымі тэхналагічнымі інвестыцыямі на карысць спажывання, але замалымі для вырашэння актуальных праблем чалавецтва; можа ствараць разумныя і прыбытковыя формы паўторнага выкарыстання, узнаўлення актыўнасці і перапрацоўкі, можа паправіць энергетычную эфектыўнасць гарадоў і г.д. Дыверсіфікацыя вытворчасці дае чалавечаму інтэлекту вельмі шырокія магчымасці распрацавання і ўвядзення інавацый, а таксама аховы навакольнага асяроддзя і стварэння новых працоўных месцаў. Такая крэатыўнасць можа спрыяць росквіту шляхетнасці чалавека, бо больш годным з’яўляецца смелае і адказнае выкарыстанне інтэлекту ў пошуку спосабаў устойлівага і справядлівага развіцця ў межах больш шырокага разумення якасці жыцця. У адрозненне ад гэтага, менш годным і крэатыўным, а больш павярхоўным з’яўляецца ціск з мэтаю стварэння формаў рабавання прыроды толькі для таго, каб прапанаваць новыя магчымасці хуткага спажывання і прыбытку.

193. Аднак, калі ў некаторых выпадках устойлівае развіццё будзе азначаць новую ступень росту, то ў іншых выпадках ненасытнага і безадказнага развіцця, якое адбывалася на працягу многіх дзесяцігоддзяў, трэба падумаць пра запавольванне кроку, увядзенне пэўных рацыянальных абмежаванняў, а таксама пра спыненне, пакуль яшчэ не позна. Мы ведаем,

што непрымальнымі з'яўляюцца паводзіны тых, хто выкарыстоўвае і знішчае штораз больш, у той час калі іншыя жывуць ніжэй годнасці. Пагэтаму настаў час акцэптацыі пэўнай спадчыны ў некаторых частках свету праз запэўніванне сродкаў для здаровага развіцця дзесьці ў іншых месцах. Бэнэдыкт XVI сказаў, што «грамадствы тэхналагічна перадавых краін павінны быць гатовымі стварыць акалічнасці, якія спрыялі б умеркаваным паводзінам, змяншаючы свае патрэбы ў энергіі і паляпшаючы ўмовы яе выкарыстання» [135] .

194. Каб з'явіліся новыя мадэлі прагрэсу, мы павінны «змяніць мадэль глабальнага развіцця» [136] , што азначае адказнае «разважанне над сэнсам эканомікі і яе мэтамі, даючы магчымасць выправіць сапсаваныя механізмы і скажэнні» [137] . Недастаткова узгадніць шляхам кампрамісу клопат аб прыродзе з фінансавымі даходамі або ахову навакольнага асяроддзя з прагрэсам. У гэ--тым пытанні паўмеры з'яўляюцца толькі малой адтэрміноўкай катастрофы. Гэта проста пераасэнсаванне прагрэсу. Такое тэхналагічнае і эканамічнае развіццё, якое не пакідае пасля сябе лепшага свету і не робіць якасць жыцця інтэгральна вышэйшым, не можа лі-чыцца прагрэсам. З другога боку, часта ў кантэксце росту эканомікі, рэальная якасць жыцця людзей зніжаецца з-за дэградацыі навакольнага асяроддзя, нізкай якасці харчовых прадуктаў або вычарпання некаторых рэсурсаў. У гэтым кантэксце размова пра ўстойлівае развіццё часта служыць не толька адцяг-ванню ўвагі і апраўданню, але таксама прысвойванню каштоўнасцяў экалагічнага дыскурсу ў межах логікі фінансаў і тэхнакратыі. У гэтым выпадку сацыяльная і экалагічная адказнасць прадпрыемстваў часта вядзе да серыі маркетынгавых мерапрыемстваў, якія павінны ствараць станоўчы імідж.

195. Прынцып максімалізацыі прыбыткаў у адрыве ад усіх іншых поглядаў з'яўляецца скрыўленнем паняцця эканомікі: наступае рост валавога ўнутранага прадукту, і нікога не цікавіць тое, што вытворчасць адбываецца за кошт будучых рэсурсаў або навакольнага асяроддзя. Калі высечка лясоў павялічвае валавы ўнутраны прадукт, то ніхто не зважае на такія страты, як апустыньванне тэрыторыі, знішчэнне біяразнастайнасці ці павелічэнне забруджвання. Гэта азначае, што кампаніі атрымліваюць прыбытак, плануючы выплачваць частку выдаткаў. Этычнымі могуць лічыцца толькі тыя паводзіны, калі «эканамічныя і грамадскія кошты, якія вынікаюць з выкарыстання агульных прыродных рэсурсаў, яўна прызнаюцца і прымаюцца тымі, хто імі карыстаецца, а не іншымі людзьмі ці будучымі пакаленнямі» [138] . Інструментальная рацыянальнасць, якая запэўнівае толькі статычны аналіз рэчаіснасці ў катэгорыях бягучых патрэбаў, мае месца таксама тады, калі тым, хто прыносіць шкоду, з'яўляецца рынак, як і тады, калі робіць гэта цэнтралізаваная дзяржава.

196. Якое месца займае палітыка? Мы памятаем пра прынцып дапаможнасці, які гарантуе свабоду развіцця існуючых магчымасцяў на ўсіх узроўнях, але адна-часова патрабуе ад тых, хто мае ўладу, большай адказнасці за агульнае дабро. Гэта праўда, што сёння некаторыя галіны эканомікі маюць большую ўладу, чым сама дзяржава. Аднак нельга апраўдваць эканоміку без палітыкі, няздольнай пашыраць іншую логіку ў кіраванні рознымі аспектамі цяперашняга крызісу. Логіка, якая не пакідае месца шчыраму клопату пра навакольнае

асяроддзе, з’яўляецца той самай логікай, якая не пакідае месца для інтэграцыі больш слабых, бо «ў абавязковай сёння мадэлі „поспеху” і „пры-ватнасці” бессэнсоўнымі здаюцца інвестыцыі, каб тыя, што знаходзяцца ззаду, слабыя ці менш здольныя, маглі знайсці сабе дарогу ў жыцці» [139] .

197. Мы патрабуем палітыкі з шырокім бачаннем, якая развівае новы інтэгральны падыход, спалучаючы ў міждысцыплінарным дыялогу розныя аспекты крызісу. Часта палітыка сама сябе дыскрэдытуе з прычыны карупцыі і адсутнасці разумных мер ў вырашэнні публічных пытанняў. Калі дзяржава не выконвае сваёй ролі ў дадзеным рэгіёне, то некаторыя эканамічныя групы могуць ствараць уражанне дабрачынцаў і выконваць рэальную ўладу. Яны адчуваюць сябе правамоцнымі ў парушэнні пэўных стандартаў, што вядзе да ўзнікнення розных форм , гандлю людзьмі, наркотыкамі і да насілля, што вельмі цяжка выкараніць. Калі палітыка не ў стане скончыць з амаральнай логікай і загразла ў супярэчлівых трактатах, то мы надалей не зможам супрацьстаяць вялікім праблемам чалавецтва. Стратэгія рэальных зменаў патрабуе цэласнага ана-лізу працэсаў. Недастаткова ўключыць павярхоўныя экалагічныя разважанні без аспрэчвання логікі, якая ляжыць у аснове сучаснай культуры. Здаровая палі-ты-ка павінна быць у стане адказаць на гэты выклік.

198. Палітыка і эканоміка маюць схільнасць да ўзаемнага абвінавачвання ў тым, што адносіцца да ўбоства і дэградацыі навакольнага асяроддзя. Аднак чакаецца, што яны прызнаюць свае памылкі і зной-дуць формы супрацоўніцтва, арыентаваныя на агульнае дабро. У той час як некаторыя непакояцца толькі аб фінансавай карысці, а іншыя апантаныя захаваннем або павялічваннем улады, мы маем дачыненне з войнамі або незаконнымі пагадненнямі, дзе тым, што абодва бакі цікавіць найменш, з’яўляецца захаванне прыроднага асяроддзя і абарона найбольш слабых. Таксама і ў гэтым выпадку абавязвае прынцып, што «еднасць мае перавагу над канфліктам» [140] .

## V. Рэлігія ў дыялогу з навукай

199. Нельга сцвярджаць, што эмпірычныя навукі цалкам растлумачваюць жыццё, сутнасць усіх ства-рэнняў і ўсёй рэчаіснасці. Гэта азначала б беспадстаўнае парушэнне іх метадалагічных межаў. Калі мы разважаем у гэтым замкнёным абшары, то знікае эстэтычнае адчуванне, паэзія, а таксама здольнасць інтэлекту заўважаць сэнс і мэту рэчаў [141] . Прагну нагадаць, што «класічныя рэлігійныя тэксты прапануюць сэнс для ўсіх эпох, маюць матывуючую сілу, якая заўсёды адкрывае новыя перспектывы [...] Ці ёсць сэнс і слушнасць у тым, каб адкідаць гэтыя творы толькі таму, што яны ўзніклі ў кантэксце рэлігійных перакананняў?» [142] Па сутнасці наіўным з’яўляецца мерка-ванне, што этычныя прынцыпы можна прадставіць толькі абстрактна, у адрыве ад якога-небудзь кантэк-сту, але

тое, што яны з’яўляюцца ў рэлігійнай мове, ніяк не пазбаўляе іх каштоўнасці ў публічных дэбатах. Этычныя прынцыпы, якія здольны заўважыць розум, заўсёды могуць вяртацца ў розных аспектах і могуць быць выяўлены ў розных мовах, у тым ліку і ў рэлігійнай.

200. З другога боку, кожнае тэхнічнае вырашэнне, якое хацела б унесці навука, будзе бяссільным перад абліччам сур’ёзных праблемаў свету, калі чалавецтва згубіць свой кірунак, калі мы забудзем пра вялікія матывацыі, якія дазваляюць на суіснаванне, прысвя-чэнне, спагаду. У кожным выпадку трэба заклікаць веруючых, каб яны жылі згодна са сваёй верай і не адмаўлялі яе сваімі чынамі. Трэба настойваць, каб яны адкрываліся на Божую ласку і больш глыбока чэрпалі з таго, што паводле іх найглыбейшых перакананняў датычыць любові, справядлівасці і спакою. Калі дрэннае разуменне нашых прынцыпаў вяло нас часам да апраўдання злоўжыванняў у адносінах да прыроды або дэспатычнага панавання чалавека над стварэннем ці таксама войнаў, несправядлівасці і насілля, то як веруючыя людзі мы можам прызнаць, што праз гэта мы былі няверныя скарбу мудрасці, які павінны захоўваць. Часта культурныя абмежаванні розных эпох абумоўлівалі гэтае ўсведамленне ўласнай этычнай і духоўнай спадчыны, але менавіта гэты зварот да крыніцаў дазваляе рэлігіям лепш рэагаваць на надзённыя патрэбы.

201. Большасць жыхароў нашай планеты называе сябе веруючымі, што павінна абуджаць рэлігіі ўсту--паць у дыялог, сканцэнтраваны на клопаце аб прыродзе, на абароне бедных, на будаванні братэрства і пашаны. Неабходным з’яўляецца таксама дыялог паміж самімі навукамі, бо кожная з іх, як правіла, замыкаецца ў межах сваёй мовы, а спецыялізацыя вядзе да ізаляцыі і абсалютызацыі сваіх ведаў. Гэта робіць немагчымым належны падыход да праблемаў навакольнага асяроддзя. Таксама неабходным з’яўляецца адкрыты і сяброўскі дыялог паміж рознымі рухамі па ахове навакольнага асяроддзя, бо ёсць паміж імі ідэалагічныя супярэчнасці. Сур’ёзнасць экалагічнага крызісу патрабуе, каб мы ўсе думалі пра агульнае дабро і крочылі шляхам дыялогу, які патрабуе цярплівасці, аскезы і велікадушнасці. Мы заўсёды павінны памя-таць, што «рэчаіснасць больш важная за ідэю» [143] .

ШОСТЫ РАЗДЗЕЛ

ЭКАЛАГІЧНАЕ выхаванне І ДУХОЎНАСЦЬ

202. Многія справы павінны змяніць свой кірунак, але ў першую чаргу само чалавецтва патрабуе перамены. Не хапае ўсведамлення агульнага паходжання, узаемнай прыналежнасці і агульнай будучыні для ўсіх. Гэтае галоўнае ўсведамленне дазволіць

развівацца новым перакананням, паставам і ладу жыцця. Такім чынам перад намі стаіць вялікі культурны, духоўна-адукацыйны выклік, які азначае доўгія працэсы адраджэння.

## I. Зрабіць стаўку на іншы лад жыцця

203. Паколькі рынак мае тэндэнцыю стварэння імпульсіўнага спажывецкага механізму дзеля раз-мяшчэння сваіх тавараў, людзі ўрэшце ўцягваюцца ў вір пакупак і непатрэбных выдаткаў. Апантанае спажыванне з’яўляецца суб’ектыўным адлюстраваннем тэхнакратычнай парадыгмы. Адбываецца тое, пра што ўжо казаў Рамана Гуардзіні: чалавек «прымае ўсялякія рэчы і формы жыцця, якія яму навязваюцца, а менавіта рацыянальнае планаванне і стандартызаваныя машынныя прадукты; яму зда--ецца, што такая пастава з’яўляецца разумнай і слушнай» [144] . Гэтая парадыгма прычыняецца да таго, што ўсе лічаць сябе свабоднымі, пакуль захоўваюць гэтак званую спажывецкую свабоду. Аднак сапраўды свабоднымі з’яўляюцца тыя, хто належыць да меншасці, якая мае эканамічную і фінансавую ўладу. У гэтай мітусні постмадэрністычнае чалавецтва не адшукала новага зразумення сябе, разумення, якое магло б надаць кірунак, і гэты недахоп тоеснасці перажываецца з сумам. У нас зашмат рэсурсаў для невялікіх і карлікавых памкненняў.

204. Цяперашняя сітуацыя ў свеце «нараджае пачуццё часовасці і няўпэўненасці ў будучым, вынікам якога з’яўляюцца розныя формы калектыўнага эгаізму» [145] . Калі людзі становяцца аўтарэферэнтнымі, то адасабляюцца ў сваёй свядомасці, павялічваюць сваю прагнасць. Чым больш сэрца дадзенай асобы з’яўляецца пустым, тым больш яна патрабуе рэчаў, якія магла б купіць, мець і спажываць. У гэтым кантэксце немагчыма, каб хтосьці прызнаў межы, якія вызначае яму рэчаіснасць. У такой перспектыве няма таксама сапраўднага агульнага дабра. Калі такі від асобаў будзе дамінаваць у грамадстве, то нормы будуць захоўвацца толькі ў такіх межах, у якіх не будуць супярэчыць іх уласным патрэбам. Таму мы думаем не толькі пра магчымасці жахлівых кліматычных з’яў або стыхій-ных бедстваў, але таксама пра катастрофы, якія вы-нікаюць з грамадскага крызісу. Бо апантанасць спажывецкім стылем жыцця, асабліва, калі вельмі нямногія могуць так жыць, можа справакаваць толькі насілле і ўзаемнае знішчэнне.

205. Але не ўсё страчана, бо чалавек, здольны пры-нізіць сябе да крайнасці, можа таксама супрацьстаяць цяжкасцям, вярнуцца і зноў выбраць дабро, адрадзіцца, незалежна ад навязаных яму ўсялякіх псіхічных і грамадскіх абумоўленасцяў. Ён здольны ў праўдзе паглядзець на сябе, раскрыць сваю агіду і распачаць новы шлях да сапраўднай свабоды. Няма сістэм, якія цалкам скампраметавалі б адкрытасць на дабро, праўду і прыгажосць ці таксама здольнасць да рэакцыі, якую Бог няспынна абуджае ў глыбіні нашых сэрцаў. Кожнага чалавека ў гэтым свеце прашу не забываць пра сваю годнасць, якой ніхто не мае права адабраць у яго.

206. Змена ладу жыцця можа аказаць здаровы ўплыў на тых, хто спаўняе палітычную, эканамічную і грамадскую ўладу. Гэта адбываецца, калі спажывец--кім рухам удаецца прычыніцца да таго, каб некаторыя прадукты не набываліся, і праз гэта яны эфектыўна ўплываюць на працу прадпрыемстваў, змушаючы іх разгледзець уздзеянне на прыроднае асяроддзе, а таксама пераасэнсваць мадэлі прадукцыі. Сапраў-ды, калі звычкі грамадства змяншаюць даходы прад-прыемстваў, то яны вымушаны змяніць метады вы-творчасці. Гэта нагадвае нам пра сацыяльную адказнасць спажыўцоў. «Купля заўсёды з’яўляецца маральным чынам, а не толькі эканамічным» [146] . Таму сёння «пытанне дэградацыі навакольнага асяроддзя звязана з патрэбай змены захаванняў кожнага з нас» [147] .

207. Карта Зямлі заахвоціла нас усіх пакінуць гэты этап самаразбурэння і распачаць ўсё нанова, але мы яшчэ не распрацавалі ўніверсальнай свядомасці, якая дазваляе на гэты працэс. Таму асмельваемся прапанаваць паўторныя каштоўныя заклікі гэтага дакумента: «Як ніколі да гэтага ў гісторыі, агульнае прызначэнне прымусіла нас шукаць новы пачатак [...]. Няхай настане час, які запомніцца як абуджэнне новай пашаны да жыцця, моцнага пастанаўлення дасягнуць раўнавагі, як час прыспешвання барацьбы за справядлівасць і спакой, а таксама як час радаснай цэлебрацыі жыцця» [148] .

208. Заўсёды можна развіць новую магчымасць, каб выйсці насустрач іншым. Без гэтага мы не прызнаем каштоўнасці іншых стварэнняў, не будзе нас хваляваць клопат пра патрэбы іншых, мы не зможам паставіць сабе межы, каб пазбегнуць цярпення або дэградацыі таго, што нас атачае. Галоўная пастава аўтатрансцэндэнцыі, якая ламае ізаляцыю і аўтарэферэнтнасць, з’яўляецца крыніцай, якая робіць магчымым кожны клопат пра іншых і пра навакольнае асяроддзе. З’яўляецца таксама тым, што робіць магчымым узнікненне маральнай рэакцыі, неабходнай для ацэнкі выніку кожнага дзеяння і кожнага асабістага рашэння, якое выходзіць па-за нас. Калі мы ў стане перамагчы індывідуалізм, то можна плённа выпрацаваць альтэрнатыўны лад жыцця і сур’ёзная змена ў грамадстве стане магчымай.

## II. Выхаванне да заключэння запавету паміж чалавецтвам і навакольным асяроддзем

209. Усведамленне сур’ёзнасці культурнага і экалагічнага крызісу павінна прывесці да новых звычак. Многія людзі ведаюць, што сённяшняга прагрэсу, а таксама звычайнага назапашвання рэчаў і задавальненняў недастаткова для таго, каб адарыць людскія сэрцы сэнсам і радасцю. Тым не менш, яны не могуць адмовіцца ад таго, што прапануе рынак. У краінах, якія павінны зрабіць найбольшыя змены ў спажывецкіх звычках, маладыя людзі маюць новую экалагічную адчувальнасць і выяўляюць велікадушнасць, а некаторыя з іх выдатна змагаюцца за ахову навакольнага асяроддзя. Аднак яны растуць у асяроддзі з надзвычай высокім спажываннем і дабрабытам, якія ўскладняюць развіццё іншых навыкаў.

Таму мы маем справу з адукацыйным выклікам.

210. Экалагічнае выхаванне пашырыла свае мэты. Калі напачатку яна была вельмі засяроджана на навуковай інфармацыі, на ўсведамленні і прадухіленні пагрозаў для навакольнага асяроддзя, то цяпер стараецца далучыць крытыку «міфаў» сучаснасці, якая абапіраецца на інструментальны розум (індывідуалізм, неабмежаваны прагрэс, канкурэнцыю, спажываль-ніцтва, рынак без правілаў), а таксама вярнуць розныя ўзроўні экалагічнага раўнавагі: унутранай у самім сабе, салідарнай з іншымі, натуральнай з усімі жывымі істотамі, духоўнай з Богам. Экалагічнае выхаванне павінна падрыхтаваць нас, каб мы зрабілі скачок у тую Таямніцу, якая экалагічнай этыцы надае найглыбейшы сэнс. З другога боку існуюць выхаваўцы, якія могуць прадумаць адукацыйныя праграмы экалагічнай этыкі так, каб эфектыўна дапамагчы ва ўзрастанні салідарнасці, адказнасці і клопату на аснове спагады.

211. Аднак гэтае выхаванне, пакліканае абудзіць «грамадзянскую экалагічную актыўнасць», часам абмяжоўваецца інфармаваннем і не збіраецца фарміраваць навыкі. Законаў і нарматыўных актаў на больш доўгую перспектыву недастаткова, каб абмежаваць дрэнныя паводзіны, нават калі існуе эфектыўны кантроль. Калі норма закону павінна выклікаць значныя і трывалыя вынікі, трэба, каб большасць членаў грамадства яе прыняла, зыходзячы з адпаведных матывацый, і распачала асабістую перамену. Дар з сябе ў экалагічнай дзейнасці становіцца магчымы толькі праз удасканальванне цнотаў. Калі дадзеная асоба нягледзячы на тое, што яе матэрыяльныя рэсурсы дазваляюць на большыя выдаткі, звычайна апранаецца цяплей, замест таго, каб уключыць ацяпленне, то значыць, што набыла перакананні і пачуцці, якія спрыяюць ахове навакольнага асяроддзя. Вельмі высакародным з’яўляецца прыняцце абавязку клапаціцца пра навакольнае асяроддзе праз малыя штодзённыя клопаты. Цудоўна і тое, што адукацыя зможа іх матываваць і сфарміраваць пэўны лад жыцця. Выхаванне да адказнасці за прыроднае асяроддзе можа заахвоціць да розных паводзінаў, якія маюць непасрэдны і значны ўплыў на клопат пра навакольнае асяроддзе, такіх, як пазбяганне выкарыстання пластыка і паперы, змяншэнне выкарыстання вады, раздзяленне адходаў, гатаванне ежы толькі тады, калі можна будзе з’есці тое, што прыгатавана, ашчаднае стаўленне да іншых жывых істот, карыстанне грамадскім транспартам або супольнае карыстанне аўтамабілем некалькімі асобамі, пасадка дрэў, выключэнне непатрэбнага святла і г.д. Усё гэта з’яўляецца часткай шчодрай і годнай крэатыўнасці, якая паказвае найлепшае ў чалавеку. Другаснае выкарыстанне чагосьці замест хуткага выкідвання, што вынікае з глыбокай матываванасці, можа быць актам любові, які выяўляе нашую годнасць.

212. Нельга думаць, што гэтыя намаганні і так не зменяць свет. Такія дзеянні кідаюць у грамадстве зерне дабра, якое заўсёды прыносіць плён, незалежна ад таго, што можна свердзіць візуальна. Яны распачынаюць ва ўлонні гэтай зямлі дабро, якое заўсёды мае тэндэнцыю да пашырэння, часам незаўважальна. Больш за тое, практыка гэтых паводзінаў

дае нам пачуццё годнасці, вядзе да дасканалай экзістэнцыянальнай глыбіні, дазваляе нам адчуць вартасць жыцця ў гэтым свеце.

213. Існуюць розныя асяродкі навучання: школа, сям’я, сродкі масавай інфармацыі, катэхеза і інш. Добрая школьная адукацыя ў дзяцінстве і ў маладым узросце кідае зерне, якое можа прынесці плён у жыцці. Аднак хачу падкрэсліць галоўную ролю сям’і, бо яна з’яўляецца «месцам, у якім жыццё, дар Бога, можа адпаведна прымацца і аберагацца ад шматлікіх нападаў, якім яно падвяргаецца, можа таксама развівацца згодна з патрабаваннямі сапраўднага чалавечага ўзрастання. Насуперак гэтак званай культуры смерці, сям’я з’яўляецца асяродкам культуры жыцця» [149] . У сям’і падтрымліваюцца першыя навыкі любові і клопату пра жыццё, такія як належнае карыстанне рэчамі, любоў да парадку і прыбіранне пасля сябе, шанаванне мясцовай экасістэмы і абарона ўсіх стварэнняў. Сям’я з’яўляецца месцам інтэгральнай фармацыі, у якой адбываюцца цесна звязаныя паміж сабою розныя аспекты асабістага сталення. У сям’і мы вучымся прасіць дазволу, не трапляючы ў рабалепства, ка-заць «дзякуй», выяўляючы шчырую ўдзячнасць за тое, што атрымліваем, апаноўваць агрэсію або хцівасць і прасіць прабачэння, калі прычынім нейкае зло. Гэтыя малыя жэсты шчырай спагады дапамагаюць будаваць культуру жыцця сумесна з іншымі і з пашанаю да таго, што нас акружае.

214. Да заданняў палітыкі і розных таварыстваў адносіцца фарміраванне сумлення. Гэта таксама датычыць Касцёла. У гэтым выхаванні важную ролю ма-юць усе хрысціянскія супольнасці. Я таксама спадзяюся, што ў нашых семінарыях і манаскіх фармацыйных дамах будзе адбывацца выхаванне адказнага аскетыз-му, умення захапляцца светам у поўнай удзячнасці і адчуваць слабасць убогіх і навакольнага асяроддзя. Улічваючы, што многае пастаўлена на карту, а таксама што неабходны ўстановы, якія маюць права прымя-няць санкцыі адносна нападаў на навакольнае асяроддзе, нам таксама неабходна кантраляваць сябе і выхоўваць адно аднаго.

215. У гэтым кнтэксце «нельга занядбоўваць адносінаў, якія ўзнікаюць паміж належным эстэтычным выхаваннем і ўтрыманнем здаровага прыроднага асяроддзя» [150] . Звяртанне ўвагі на прыгажосць і ўмілаванне прыгажосці дапамагае нам выйсці з утылітарнага прагматызму. Калі мы не спыняемся, каб палюбавацца і ацаніць прыгажосць, то нічога дзіўнага, што ўсё становіцца прадметам несумленнай эксплуатацыі. У той жа час, калі мы хочам дасягнуць глыбокіх зменаў, то павінны памятаць, што мадэль мыслення рэальна ўплывае на паводзіны. Адукацыя будзе бясплённай, а яе намаганні будуць дарэмнымі, калі не будуць прыкладвацца высілкі пашырэння новай мадэлі для чалавека, жыцця, грамадства і яго адносінаў з прыродай. У адваротным выпадку надалей будзе развівацца мадэль спажывання, якую прапануюць СМІ, а таксама эфектыўныя рынкавыя механізмы.

III. Экалагічнае навяртанне

216. Вялікае багацце хрысціянскай духоўнасці, выпрацаванае на працягу дваццаці стагоддзяў асабістага і грамадскага досведу, з’яўляецца цудоўным укладам у высілак аднаўлення чалавецтва. Я хацеў бы прапанаваць хрысціянам пэўныя ўказанні экалагічнай духоўнасці, якія вынікаюць з пераканання нашай веры, бо тое, чаму вучыць нас Евангелле, мае ўплыў на наш спосаб мыслення, адчування і жыцця. Маецца на ўвазе не столькі ідэя, колькі ў першую чаргу матывацыі, якія вынікаюць з духоўнасці, дзеля ўмацавання руплівага клопату пра свет. Бо немагчыма ўдзельнічаць у вялікіх справах толькі на падставе цудоўных дактрын, без пэўнай містыкі, якая заахвочвае нас, без унутранага хвалявання, «якое дае імпульс, матывацыю, дадае адвагі і надае сэнс асабістаму і супольнаму дзеянню» [151] . Трэба згадзіцца, што мы, хрысціяне, не заўсёды збіралі і памнажалі багацці, якія Бог даў Касцёлу, чыя духоў-насць не аддзелена ні ад цела, ні таксама ад прыроды ці рэалій гэтага свету, але мы жывём з імі і ў іх, у еднасці з усім, што нас акружае.

217. «У свеце ёсць штораз больш (…) знешніх пустыняў, бо ўнутраныя пустыні сталі вельмі пашыранымі» [152] . Экалагічны крызіс з’яўляецца заклікам да глыбокага ўнутранага навяртання. Мы павінны таксама прызнаць, што некаторыя актыўныя хрысціяне і людзі малітвы пад відам рэалізму і прагматызму часта насміхаюцца з клопату аб прыродным асяроддзі. Іншыя пасіўныя, не жадаючы змяніць свае звычкі, становяцца ўнутрана падзеленымі. Ім не хапае , якое звязана з развіццём усіх вынікаў іх сустрэчы з Езусам у адносінах з акружаючым іх светам. Жыццё паводле паклікання быць абаронцамі Божай справы з’яўляецца істотнай часткай дабрадзейнага жыцця, а не абавязковым ці таксама другасным элементам хрысціянскага досведу.

218. Каб прапанаваць здаровыя адносіны са ства-рэннем як неад’емны аспект асабістага навяртання, прыгадаем прыклад святога Францішка Асізскага. Гэта патрабуе прызнання сваіх памылак, грахоў, заганаў або занядбанняў і навяртання ўсім сэрцам, патрабуе ўнутранай перамены. Біскупы Аўстраліі змаглі акрэс-ліць навяртанне тэрмінамі паяднання са стварэннем: «Каб дасягнуць гэтага паяднання, мы павінны пра-аналізаваць нашае жыццё і пазнаць, чым мы пашкодзілі Божаму стварэнню сваімі дзеяннямі і бяздзейнасцю. Мы павінны адчуць навяртанне, перамену сэрца» [153] .

219. Аднак жа, каб справіцца з такой складанай сітуацыяй, перад якой стаіць свет, недастаткова, каб кожны быў лепшым сам па сабе. Ізаляваныя асобы могуць страціць здольнасць і свабоду ў пераадоленні логікі інструментальнага розуму і ў канчатковым выніку стаць ахвярай спажывальніцтва без этыкі, а таксама без грамадскага і экалагічнага пачуцця. На грамадскія праблемы адказваецца супольнаснымі повязямі, а не сумай індывідуальных дабротаў: «Патрабаванні гэтай справы будуць настолькі вялікімі, што з імі не змогуць справіцца ні індывідуальныя ініцыятывы, ні супрацоўніцтва людзей, выхаваных індывідуалістычна. Неабходна спалучэнне сілаў усіх і адзінства ў дзеянні» [154] . Экалагічнае

навяртанне, неабходнае для стварэння дынамікі трывалай змены, з’яўляецца таксама агульным навяртаннем.

220. Гэтае навяртанне вядзе да розных спалучаных паміж сабою пастаў, каб заахвоціць да шчодрага і сардэчнага клопату. Па-першае, патрабуе ўдзячнасці і бескарыслівасці, гэта значыць прызнання таго, што свет з’яўляецца дарам, атрыманым з любові Айца. Вынікам гэтага з’яўляецца гатоўнасць да бескарыслівага вырачэння, а таксама жэсты велікадушнасці, нават, калі ніхто іх не бачыць і недаацэньвае: «няхай не ведае твая левая рука, што робіць правіца твая [...] А твой Айцец, які бачыць патаемнае, аддасць табе» ( 6, 3-4). Гэта вядзе да любячага разумення, што мы не адлучаны ад іншых стварэнняў, але ствараем з іншымі істотамі Сусвету цудоўную паўсюдную еднасць. Веруючы чалавек не захапляецца светам звонку, але знутры, прызнаючы повязі, праз якія Айцец яднае нас з усімі істотамі. Больш за тое, экалагічнае навяртанне, развіваючы асаблівыя здольнасці, якімі Бог адарыў кожнага веруючага, вядзе да развіцця крэатыўнасці і энтузіязму дзеля вырашэння драмы свету, ахвяруючы сябе Богу як «ахвяру жывую, святую, прыемную Богу» ( 12, 1). Ён не бачыць у сваёй перавазе прычыны для асабістай хвалы або неадказнага кіравання, але асаблівую здольнасць, якая ў сваю чаргу накладвае на яго сур’ёзную адказнасць, што вынікае з веры.

221. Розныя аспекты нашай веры, прадстаўленыя на пачатку гэтай энцыклікі, дапамагаюць узбагаціць сэнс гэтага навяртання, напрыклад, усведамленне таго, што кожнае стварэнне адлюстроўвае ў сабе штосьці з Бога і змяшчае заклік, які павінна нам перdesigned казаць, або ўпэўненасць, што Хрыстус прыняў гэты матэрыяльны свет, а цяпер, уваскрослы, жыве ў глыбіні кожнай істоты, акружаючы яе сваёй любоўю і напаўняючы яе сваім святлом. Вядуць таксама да прызнання таго, што Бог стварыў свет і ўстанавіў у ім пэўны лад і дынамізм, таму чалавек не мае права іх ігнараваць. Калі чытаем у Евангеллі, як Езус кажа пра птушак, што ніводная з іх не забытая перад Богам ( 12, 6), то ці мы будзем здольныя здзекавацца з іх і прычыняць ім зло? Я заахвочваю ўсіх хрысціянаў, каб яны выразна паказалі гэтае вымярэнне свайго навяртання, дазваляючы, каб моц і святло атрыманай ласкі ахоплівалі таксама адносіны з іншымі істотамі і навакольным светам, абуджаючы гэтае цудоўнае братэрства з усім стварэннем, у якім так цудоўна жыў святы Францішак Асізскі.

## IV. Радасць і спакой

222. Хрысціянская духоўнасць прапануе альтэрнатыўны спосаб разумення якасці жыцця і заахвочвае да прароцкага і сузіральнага ладу жыцця, здольнага да глыбокай радасці, пазбягаючы апантанасці спажываннем. Важным з’яўляецца прыняцце даўнейшага навучання, прысутнага ў розных рэлігійных традыцыях, а таксама ў Бібліі. Маецца на ўвазе перакананне, што «менш азначае больш». Сапраўды, няспыннае назапашванне

магчымасцяў спажывання рассейвае сэрца, што робіць немагчымым ацаніць усё і ў кожную хвіліну. Але стаўшы ў радасці духа перад тым, што існуе, хоць бы гэтага было няшмат, адкрывае нам значна большыя магчымасці разумення і самарэалізацыі. Хрысціянская духоўнасць прапануе развіваць устрыманне і здольнасць радавацца, маючы няшмат. Гэта вяртанне да прастаты, якая дазваляе нам затрымацца і ацаніць тое, што малое, і дзякаваць за магчымасці, якія дае жыццё, без прывязанасці да іх і не сумаваць з прычыны таго, што мы чагосьці не маем. Гэта патрабуе пазбягання дынамікі панавання і назапашвання толькі задавальненняў.

223. Свядомае і свабоднае ўстрыманне вызваляе нас. Гэта не горшае жыццё, не менш інтэнсіўнае, але цалкам наадварот. На самай справе, больш атрымліваюць і лепш перажываюць кожную хвіліну тыя, хто не хоча ісці на кампраміс тут і там, няспынна шукаючы таго, чаго не маюць, але адчуваюць, што значыць цаніць кожную асобу і кожную рэч, яны вучацца ўстанаўліваць кантакт і могуць радавацца самым простым рэчам. Такім чынам, могуць паменшыць незадаволеныя запатрабаванні і паменшыць стомленасць і неспакой. Можна мець няшмат, а жыць інтэнсіўна, асабліва калі мы ў стане адкрыць іншыя прыемнасці і знайсці задавальненне ў братэрскіх сустрэчах, служэнні, у рэалізацыі сваіх дароў, у музыцы і мастацтве, у кантакце з прыродай, у малітве. Шчасце патрабуе ўмення абмяжоўваць пэўныя патрэбы, якія нас заглушаюць, і заставацца такім чынам адкрытымі на многія магчымасці, якія дае нам жыццё.

224. Устрыманне і пакора не ацэньваліся станоўча ў мінулыя стагоддзі. Аднак, калі адбываецца паўсюднае аслабленне практыкавання якойсьці цноты ў асабістым і грамадскім жыцці, гэта вядзе ў выніку да многіх парушэнняў раўнавагі, таксама экалагічнай. Таму недастаткова ўжо гаварыць толькі пра інтэгральнасць экасістэм. Мы павінны адважыцца гаварыць пра інтэгральнасць чалавечага жыцця, пра неабходнасць падтрымліваць і спалучаць усе вялікія каштоўнасці. Знікненне пакоры ў чалавеку, празмерна ўсхваляваным магчымасцю абсалютнага панавання, без ніякіх абмежаванняў, можа весці толькі да прычынення шкоды грамадству і навакольнаму асяроддзю. Нялёгка развіваць гэтую здаровую пакору і радаснае ўстры-манне, калі мы становімся самадастатковымі, калі выключаем Бога з нашага жыцця, а Яго месца займае нашае ўласнае «я», калі мы самі акрэсліваем, што з'яў-ляецца добрым, а што дрэнным.

225. З іншага боку, ніхто не можа ўзрастаць у радасным устрыманні, калі не жыве ў згодзе з самім сабою. Часткай правільнага разумення духоўнасці з'яўляецца пашырэнне нашага разумення спакою. Ён ёсць чымсь-ці большым за адсутнасць вайны. Унутраны спакой мае шмат агульнага з клопатам пра навакольнае асяроддзе і агульнае дабро, бо, калі яны перажываюцца праўдзіва, у іх адлюстроўваецца лад жыцця разам са здольнасцю захапляцца, што вядзе да больш глыбо-кага жыцця. Прырода напоўнена словамі любові, але як іх пачуць сярод пастаяннага шуму, неспакою і няўважлівасці ці таксама культу павярхоўнасці? Многія людзі адчуваюць глыбокую нестабільнасць, якая штурхае ўсё рабіць

на поўнай хуткасці, каб адчуваць сябе занятымі, у пастаяннай спешцы, і каб таптаць усё вакол сябе. Гэта ўплывае на спосаб адносінаў да навакольнага асяроддзя. Інтэгральная экалогія патрабуе прысвяціць крыху часу на адшуканне спакойнай гармоніі са стварэннем, на разважанне пра наш лад жыцця і нашыя ідэалы, на сузіранне Стварыцеля, які жыве сярод нас і ў тым, што нас акружае, і прысутнасць якога «не трэба ствараць, але адкрываць, выяўляць» [155] .

226. Мы кажам пра пэўную паставу сэрца, перажыванне ўсяго з радаснай канцэнтрацыяй, пра ўменне быць перад кімсьці ў поўнай меры, не думаючы аб тым, што будзе пасля, пра паставу таго, хто дае сябе ў кожную хвіліну як Божы дар, які павінен перажывацца ў поўні. Езус вучыў нас гэтай паставе, калі заклікаў глядзець на палявыя лілії і нябесных птушак, або, калі ў прысутнасці чалавека, які шукае, «паглядзеў на яго з любоўю» ( 10, 21). Ён умеў быць прысутным у поўнай меры для кожнага чалавека і стварэння, і паказаў нам шлях пераадолення хваравітага неспакою, які робіць нас павярхоўнымі, агрэсіўнымі і апанта--нымі спажыўцамі.

227. Выразам гэтай паставы з’яўляюцца моманты падзякі Богу перад і пасля спажывання ежы. Я прапаную ўсім веруючым узнавіць гэты каштоўны звычай і глыбока перажываць яго. Гэтая хвіліна благаслаўлення, хоць вельмі кароткая, нагадвае нам пра нашую залежнасць ад Бога, умацоўвае нашае пачуццё ўдзячнасці за дары стварэння, выказваючы прызнанне тым, чыя праца забяспечвае нас гэтымі дабротамі, а таксама яна ўмацоўвае салідарнасць з найбольш патрабуючымі.

## V. Грамадзянская і палітычная любоў

228. Клопат аб прыродзе з’яўляецца часткай стылю жыцця, які азначае здольнасць да сумеснага жыцця і еднасці. Езус нагадаў, што Бог з’яўляецца нашым агульным Айцом, а гэта робіць нас братамі. Братняя любоў можа быць толькі бескарыслівай, ніколі не можа быць узнагародаю за тое, што зрабіў хтосьці іншы, і не гарантыяй таго, што — як спадзяемся — зробіць. Таму мы можам любіць непрыяцеляў. Тая самая бескарыслівасць прычыняецца да таго, што мы любім і прымаем вецер, сонца або хмары, нягледзячы на тое, што яны не падлягаюць нашаму кантролю. Таму мы можам казаць пра .

229. Мы павінны зноў адчуць, што мы патрэбныя адзін аднаму, што мы адказваем за іншых і за свет, што варта быць добрым і сумленным. Занадта доўга мы заставаліся ў стане маральнай дэградацыі, насміхаючыся з этыкі, дабрыні, вернасці, сумленнасці. Надышоў момант прызнаць, што гэтая знешняя радасць нам зусім непрыдатная. Гэтае знішчэнне ўсялякіх падстаў грамадскага жыцця вядзе да ўзаемнай канфрантацыі ў імя абароны сваіх інтарэсаў. Выклікае з’яўленне новых формаў насілля і жорсткасці, а таксама робіць

немагчымым развіццё сапраўднай культуры клопату пра прыроднае асяроддзе.

230. Прыклад святой Тэрэзы з Лізьё заахвочвае нас практыкаваць малую дарогу любові, каб не прапусціць магчымасці сказаць добрае слова, усміхнуцца, зрабіць любы малы жэст, які сее спакой і сяброўства. Інтэгральная экалогія — гэта таксама простыя штодзённыя жэсты, якія пераадольваюць логіку насілля, эксплуатацыі, эгаізму. Між тым свет шалеючага спажы-вання з'яўляецца адначасова светам здзекаў над жыццём ва ўсіх яго формах.

231. Любоў, поўная малых жэстаў узаемнага кло-пату, мае таксама грамадзянскае і палітычнае вымя-рэнне, а выяўляецца ва ўсіх дзеяннях, якія намагаюцца будаваць лепшы свет. Умілаванне грамадства і пры-хільнасць да агульнага дабра з'яўляюцца дасканалай формай любові, якая не толькі ўплывае на адносіны паміж людзьмі, але таксама на макраадносіны: грамадскія, эканамічныя і палітычныя [156] . Таму Касцёл прапанаваў свету ідэал «цывілізацыі любові» [157] . Гра-мадская любоў — гэта ключ да сапраўднага развіцця: «Каб грамадства стала больш чалавечным, больш годным асобы, неабходна належным чынам ацаніць любоў у грамадскім жыцці — на палітычным, эканамічным, культурным узроўні — і зрабіць яе пастаяннай і найвышэйшай нормай дзейнасці» [158] . У гэтым кантэксце, побач са значэннем малых штодзённых жэстаў, грамадская любоў схіляе нас думаць пра вялікія стратэгіі, якія эфектыўна стрымалі б дэградацыю навакольнага асяроддзя і заахвоцілі б да , якая напаўняла б усё грамадства. Калі хтосьці прызнае заклік Бога ўдзельнічаць нароўні з іншымі ў гэтых грамадскіх мерапрыемствах, павінен памятаць, што гэта частка яго духоўнасці, якая з'яўляецца рэалізацыяй міласэрнасці, а таксама што такім чынам ён сталее і асвячаецца.

232. Не ўсе пакліканы непасрэдна займацца па-літыкай. У грамадстве квітнее, аднак, незлічоная раз-настайнасць таварыстваў, якія ўдзельнічаюць у памнажэнні агульнага дабра і клапоцяцца аб ахове прыроднага і гарадскога асяроддзя. Яны займаюцца, напрыклад, публічнымі месцамі (будынкамі, фантанамі, занядбанымі помнікамі, краявідамі, плошчамі), каб бараніць, аднаўляць, паляпшаць або ўпрыгожваць штосьці, што належыць усім. Вакол іх развіваюцца або аднаўляюцца повязі і нараджаецца новая мясцовая грамадская тканка. Такім чынам супольнасць вызваляецца ад спажывецкай абыякавасці. Гэта азначае таксама культываванне агульнай тоеснасці, а таксама захаванне і пераказ гісторыі. Такім чынам, мы клапоцімся пра свет і якасць жыцця самых бедных. З гэтым лучыцца пачуццё салідарнасці, якая з'яўляецца адначасова ўсведамленнем жыцця ў супольным доме, які даручыў нам Бог. Гэтыя супольныя дзеянні, калі выяўляюць ахвярную любоў, могуць стаць інтэнсіўным духоўным перажываннем.

## VI. Сакрамэнтальныя знакі і святочны адпачынак

233. Сусвет развіваецца ў Богу, які яго цалкам напаўняе. Таму існуе таямніца, якой трэба захапляцца ў лісці, у сцежцы, у расе, у твары ўбогага. Ідэалам з’яўляецца не толькі пераход са знешняга свету да ўнутранага, каб адкрыць дзеянне Бога ў душы, але і выйсце насустрач Яму ва ўсім [159] , так як вучыў святы Банавентура: «Су-зіранне з’яўляецца тым больш узнёслым, чым больш чалавек адчувае ў сабе дзеянне Божай ласкі і чым больш можа распазнаваць Бога ў іншых стварэннях» [160] .

234. Святы Ян ад Крыжа вучыў, што ўсё, што добрае ў рэчах і ў досведзе свету, «з’яўляецца ў Богу бясконца дасканалым, а больш выразна, кожная з гэтых веліччаў з’яўляецца Богам і ўсе разам з’яўляюцца Богам» [161] . Так бывае не таму, што абмежаваныя рэчы свету з’яўляюцца сапраўды боскімі, але таму, што містык адчувае ўнутраную сувязь, якая існуе паміж Богам і ўсімі істотамі, і такім чынам «адчувае, што Бог з’яўляецца для яго ўсім» [162] . Калі захапляецца прыгажосцю гор, не можа гэтай прыгажосці аддзяліць ад Бога і заўважае, што захапленне, якое перажывае, павінна быць аднесена да Пана: «Горы — высокія, магутныя, шырокія, велічныя, прыгожыя, поўныя кветак і паху. Гэтымі гарамі з’яўляецца для мяне мой Умілаваны. Самотныя даліны — спакойныя, поўныя чароўнасці і свежасці, ця-ністыя, багатыя на прэсную ваду. Разнастайнасцю сваіх гаёў, мілым спевам птушак, прыносяць супакаенне і раскошу пачуццям, даюць прахалоду і адпачынак у сваёй цішыні і самоце. Гэтымі далінамі з’яўляецца для мяне мой Умілаваны» [163] .

235. Сакрамэнты з’яўляюцца прывілеяваным спосабам, праз які Бог прымае прыроду і перамяняе яе ў звышпрыроднае жыццё. Праз культ мы заахвочаныя да разумення свету на іншым узроўні. Вада, алей, агонь і колеры прымаюцца разам з усёй іх сімвалічнай сілаю і ўключаюцца ў праслаўленне Бога. Рука, якая благаслаўляе, з’яўляецца прыладаю любові Бога і адлюстраваннем бліскасці Езуса Хрыста, які прый--шоў спадарожнічаць нам на жыццёвым шляху. Вада, якая выліваецца на цела дзіцяці падчас хросту, з’яўляецца знакам новага жыцця. Мы не ўцякаем ад свету і не супярэчым прыродзе, калі хочам сустракацца з Богам. Можна гэта заўважыць асабліва ў хрысціянскай духоўнасці Усходу: «прыгажосць, якая на Усходзе з’яўляецца адным з найцудоўнейшых спосабаў выяўлення Божай гармоніі і прыкладам новага чалавецтва, выяўляецца ўсюды: у формах святыні, гуках, колерах, святле, пахах» [164] . Для хрысціянскага досведу ўсе стварэнні матэрыяльнага свету знаходзяць свой праўдзівы сэнс ва Ўцелаўлёным Слове, бо Сын Божы ў сваёй асобе прыняў матэрыяльны сусвет, у які ўвёў пачатак канчатковай трансфармацыі: «Хрысціянства не адкідае матэрыі; наадварот, цялеснасць у поўні ацэнена ў літургічным чыне, дзе людское цела выяўляе сваю ўнутраную прыроду святыні Духа і яднаецца з Панам Езусам, які таксама прыняў цела дзеля збаўлення свету» [165] .

236. У Эўхарыстыі стварэнне знаходзіць сваё найбольшае ўзвышэнне. Ласка, якая прагне выявіцца даступным для пачуццяў спосабам, цудоўным чынам выяўляецца, калі сам Бог, які стаў чалавекам, робіць сябе спажыткам для свайго стварэння. Пан на вяршыні таямніцы Уцелаўлення хацеў дасягнуць нашай сутнасці праз фрагмент матэрыі. Не з вышыні, але

знутры, каб мы ў нашым свеце маглі сустрэцца з Ім. У Эўхарыстыі ўжо рэалізавана паўната. Яна з’яўляецца цэнтрам жыцця сусвету, цэнтрам, напоўненым любоўю і невычэрпным жыццём. Увесь сусвет, злучаны з Уцелаўлёным Сынам, прысутным у Эўхарыстыі, аддае хвалу Богу. Па сутнасці сама Эўхарыстыя мае касмічны характар любові: «Так, касмічны! Бо нават тады, калі Эўхарыстыя цэлебруецца на малым алтары вясковага касцёла, яна ўвесь час у пэўным сэнсе цэлебруецца на алтары свету» [166] . Эўхарыстыя яднае неба і зямлю, ахоплівае і працінае ўсё стварэнне. Свет, які выйшаў з рукі Бога, вяртаецца да Яго ў радаснай і поўнай адарацыі. У эўхарыстычным Хлебе «стварэнне імкнецца да абагаўлення, да святой гасціны, да з’яднання са сваім Стварыцелем» [167] . Па гэтай прычыне Эўхарыстыя з’яўляецца таксама крыніцаю святла і матывацыі для нашых турботаў пра навакольнае асяроддзе і накіроўвае нас, каб мы былі апекунамі ўсяго стварэння.

237. Асабліва важным з’яўляецца ўдзел у нядзельнай Эўхарыстыі. Гэты дзень, так, як габрэйскі шабат, да-дзены нам як дзень аздараўлення адносінаў чалавека з Богам, з самім сабою, з іншымі і са светам. Нядзеля з’яўляецца днём уваскрасення, «першым днём» новага стварэння, пачаткам якога з’яўляецца ўваскрэшанае Панам чалавецтва, якое з’яўляецца зарукаю канчатковага перамянення ўсёй створанай рэчаіснасці. Больш за тое, гэты дзень прадказвае «вечны адпачынак чалавека ў Богу» [168] . Таму хрысціянская духоўнасць дапаўняе каштоўнасць адпачынку і святкавання. Чалавек мае схільнасць зводзіць сузіральны адпачынак да сферы таго, што бескарыснае ці непатрэбнае, за-бываючы, што ў гэтым выпадку пазбаўляе здзейсненую справу таго, што найважнейшае: сэнсу. Нашым абавязкам з’яўляецца ўключэнне ў нашае дзеянне бескарыслівасці і характару ўспрыняцця. Гэта штосьці іншае, чым звычайнае бяздзеянне. Маецца на ўвазе іншы спосаб дзеяння, які з’яўляецца часткай нашага існавання. Такім чынам, людская дзейнасць абараняецца не толькі ад пустой актыўнасці, але таксама ад нястрыманасці, а таксама ізаляцыі сумлення, што вядзе да імкнення толькі да ўласнай выгады. Права на штотыднёвы адпачынак загадвала ўстрымлівацца ад працы ў сёмы дзень: «каб адпачыў твой вол і асёл і адпачылі сын тваёй нявольніцы і чужаземец» ( 23, 12). Адпачынак пашырае погляд, які дае магчымасць нанова прызнаць правы іншых. Такім чынам дзень адпачынку, цэнтрам якога з’яўляецца Эўхарыстыя, кідае сваё святло на ўвесь тыдзень і прычыняецца да таго, што апека над прыродай і ўбогімі становіцца нашым асабістым заданнем.

## VII. Святая Тройца і адносіны паміж стварэннямі

238. Айцец з’яўляецца канчатковай крыніцай усіх рэчаў, любячым і даступным падмуркам усяго, што існуе. Сын, які Яго адлюстроўвае і праз якога ўсё было створана, злучыўся з гэтай зямлёй, калі сфарміраваўся ва ўлонні Марыі. Дух, бясконцая повязь любові, унутрана прысутны ў сэрцы Сусвету, ажыўляючы і абуджаючы новыя дарогі. Свет быў створаны Трыма Асобамі, якія дзейнічаюць як адна Боская аснова, але кожная з іх рэалізуе гэтую

супольную справу згодна са сваёй тоеснасцю. Таму, «калі поўныя захаплення мы сузіраем веліч і прыгажосць Сусвету, мы павінны праслаўляць усю Святую Тройцу»[169].

239. Для хрысціянаў вера ў адзінага Бога, які з’яўляецца трынітарнай камуніяй, вядзе да пераканання, што ўся рэчаіснасць змяшчае ў сабе рысы Святой Тройцы. Святы Банавентура сцвярджаў, што чалавек да граху мог адкрыць, што кожнае стварэнне «сведчыць, што Бог ёсць у Трох Асобах». Адлюстраванне Тройцы можна распазнаць у прыродзе, «наколькі кніга гэтая не з’яўляецца для чалавека невядомай або вока чалавека не з’яўляецца зацемненым»[170]. Францішканскі святы вучыць нас, што , настолькі рэальную, што яе можа спантанна сузіраць, калі погляд чалавека не з’яўляецца абмежаваным, невыразным і слабым. Такім чынам заклікае нас спрабаваць зразумець рэчаіснасць у трынітарным ключы.

240. Божыя Асобы ўтвараюць самаісныя адносіны, а створаны на ўзор Бога свет з’яўляецца сеткай адносінаў. Стварэнне скіравана да Бога, а рысай усіх жывых істотаў з’яўляецца імкненне да іншага стварэння так, што ў Сусвеце можна знайсці незлічоныя, трывалыя адносіны, якія таямніча пераплятаюцца паміж сабою[171]. Гэта заахвочвае нас не толькі захапляцца многімі повязямі, якія існуюць паміж стварэннямі, але вядзе таксама да адкрыцця ключа нашай самарэалізацыі. Чалавечае быццё тым больш развіваецца, тым больш сталее і тым больш асвячаецца, чым больш уваходзіць у адносіны, пераўзыходзячы сябе, каб жыць у еднасці з Богам, з іншымі і з усімі стварэннямі. Такім чынам прымае ў сваім жыцці гэтую трынітарную дынаміку, якую Бог у ім выціснуў ад пачатку яго існавання. Усё звязана, і гэта заахвочвае нас да сталення ў духоўнасці глабальнай салідарнасці, якая выпраменьваецца з таямніцы Святой Тройцы.

## VIII. Каралева ўсяго стварэння

241. Марыя, Маці, якая клапацілася пра Езуса, цяпер клапоціцца з любоўю і мацярынскім болем пра гэты зранены свет. Так, як з сэрцам, прабітым мячом, аплаквала смерць Езуса, цяпер Яна спачувае цярпенню ўкрыжаваных убогіх, а таксама стварэнняў гэтага свету, знішчаных людской моцаю. Жыве Яна разам з Езусам, цалкам перамененая, а ўсе стварэнні апяваюць Яе прыгажосць. Яна — нявеста, «апранутая ў сон-ца, і месяц пад нагамі яе, а над яе галавою вянок з дванац-цаці зорак» ( 12, 1). Узятая ў неба, з’яўляецца Маці і Каралевай усяго стварэння. У Яе праслаўленым целе, разам з уваскрослым Хрыстом, частка стварэння дасягнула паўнаты сваёй прыгажосці. Яна трымае ў сваім сэрцы не толькі ўсё жыццё Езуса, якое клапатліва «захоўвала» (пар.  2, 19.51), але таксама сёння разумее сэнс усіх рэчаў. Таму мы можам прасіць Яе, каб Яна дапамагла нам глядзець на гэты свет больш мудрымі вачыма.

242. Побач з Марыяй вылучаецца ў Святой Сям'і з Назарэта постаць святога Юзафа. Праз сваю працу і велікадушную прысутнасць ён апекаваўся Марыяй і Езусам і бараніў іх. Вызваліў іх таксама ад насілля несправядлівых людзей, забіраючы ў Егіпет. У Евангеллі ён прадстае як справядлівы муж, працавіты, моцны. Але ў яго постаці мы бачым таксама вялікую чуласць, якая не з'яўляецца рысай людзей слабых, але сапраўды моцных, якія адчуваюць рэчаіснасць, гатовыя любіць і служыць з пакорай. Таму быў абвешчаны апекуном паўсюднага Касцёла. Ён таксама можа навучыць нас клапаціцца, можа заахвоціць нас да велікадушнай працы з чуласцю, каб аберагаць свет, даручаны нам Богам.

## IX. Па-над сонцам

243. Напрыканцы нашага жыцця мы сустрэнемся тварам у твар з бясконцай прыгажосцю Бога (пар. 1  13, 12) і зможам з радасным захапленнем прачытваць таямніцу сусвету, якая разам з намі будзе ўдзельнічаць у бясконцай паўнаце. Так, мы ў дарозе да шабату вечнасці, да новага Ерузалема, да супольнага дому ў небе. Езус кажа нам: «Вось чыню ўсё новае» ( 21, 5). Вечнае жыццё будзе сумесным захапленнем, дзе кожнае стварэнне, бліскуча перамененае, зойме сваё месца і будзе мець штосьці, чым адорыць канчаткова вызваленых убогіх.

244. У чаканні, з'яднаемся, каб заняцца гэтым до-мам, які быў нам даручаны, ведаючы, што ўсё, што ў ім добрае, будзе сабрана на нябеснай гасціне. Разам з усімі стварэннямі мы пілігрымуем на гэтай зямлі, шукаючы Бога, бо «калі свет мае пачатак і быў створаны, то шукае таго, хто яго стварыў, таго, хто даў яму пачатак, таго, хто з'яўляецца яго Стварыцелем» [172] . Мы пілігрымуем, спяваючы! Няхай нашыя змаганні і нашыя турботы аб гэтай планеце не забіраюць у нас радаснай надзеі!

245. Бог, які кліча нас да шчодрага прысвячэння сябе і цалкавітага аддання, дае нам сілы і святло, якіх мы патрабуем, каб ісці наперад. У цэнтры гэтага свету пастаянна прысутнічае Пан жыцця, які так моцна нас любіць. Ён не пакідае нас адных, бо канчаткова з'яднаўся з нашай зямлёй, а Яго любоў заўсёды вядзе нас да адшукання новых дарог. Няхай Яму будзе хвала!

* * *

Пасля гэтага доўгага разважання, і радаснага, і драматычнага, я прапаную дзве малітвы. Адной з іх мы можам дзяліцца з усімі, хто верыць ва ўсемагутнага Бога Стварыцеля, а другую будзем чытаць, каб хрысціяне маглі прыняць на сябе абавязкі, якія адносна стварэн-ня ставіць перад намі Евангелле Езуса.

Усемагутны Божа,
які існуеш ва ўсім Сусвеце,
а таксама ў найменшым Тваім стварэнні;
Ты, які атачаеш сваёй чуласцю ўсё, што існуе,
спашлі нам моц сваёй любові,
каб мы клапаціліся пра жыццё і прыгажосць.
Напоўні нас спакоем, каб мы жылі як браты і сёстры
і нікому не прычынялі крыўды.
Божа ўбогіх,
дапамажы нам ўратаваць
пакінутых і забытых на гэтай зямлі,
якія так шмат значаць у Тваіх вачах.
Аздараві нашае жыццё,
каб мы ахоўвалі свет, а не рабавалі яго,
каб мы сеялі прыгажосць,
а не забруджванне і знішчэнне.
Дакраніся да сэрца тых,
хто шукае толькі прыбытку
за кошт убогіх і зямлі.
Навучы нас бачыць каштоўнасць кожнай рэчы,
сузіраць яе ў захапленні,
прызнаваць, што мы глыбока з’яднаныя
з кожным стварэннем
у нашым пілігрымаванні да Тваёй бясконцай святасці.
Дзякуем, што Ты з намі кожны дзень.
Просім, падтрымлівай нас у нашых змаганнях
на карысць справядлівасці, любові і спакою.

Праслаўляем Цябе, Ойча, разам з усімі стварэннямі,
якія выйшлі з Тваёй усемагутнай рукі.
Яны — Твае, поўныя Тваёй прысутнасці
і Тваёй чуласці.
Будзь праслаўлены, Пане!

Езу, Сыне Божы,
усё праз Цябе было створана.
Ты фармаваўся ва ўлонні Марыі,

стаў часткай гэтай зямлі
і глядзеў на гэты свет людскімі вачыма.
Сёння Ты жывеш у кожным стварэнні
ў сваёй хвале Уваскрослага.
Будзь праслаўлены, Пане!

Духу Святы, які сваім святлом
накіроўваеш свет да любові Айца
і спадарожнічаеш стагнанням стварэння,
Ты жывеш таксама ў нашых сэрцах,
каб абуджаць нас да дабра.
Будзь праслаўлены, Пане!

Пане Божа, Адзіны ў Тройцы,
прыгожая супольнасць бясконцай любові,
навучы нас сузіраць Цябе
ў прыгажосці Сусвету,
дзе ўсё кажа нам пра Цябе.
Абудзі нашае праслаўленне і ўдзячнасць
за кожную істоту, якую Ты стварыў.
Адары нас ласкаю пачуцця ўнутранай еднасці
з усім, што існуе.
Божа любові, пакажы нам нашае месца ў гэтым свеце
як прылады Тваёй любові
для ўсіх істот гэтай зямлі,
бо ніводная з іх не забытая Табою.
Асвяці тых, хто мае ўладу і грошы,
каб яны не трапілі ў грэх абыякавасці,
каб любілі агульнае дабро, падтрымлівалі слабых
і апекаваліся светам, у якім мы жывём.
Убогія і зямля клічуць:
Пане, атулі нас сваёй моцаю і святлом,
каб мы ахоўвалі кожнае жыццё,
падрыхтавалі лепшую будучыню,
каб настала Тваё Валадарства
справядлівасці, спакою, любові і прыгажосці.
Будзь праслаўлены, Пане!
Амэн.

*, , 24 2015, , .*

Францішак

---

[1] *Cantico delle creature: Fonti Francescane* (*FF*) 263.

[2] Lett. ap. *Octogesima adveniens* (14 maggio 1971), 21: *AAS* 63 (1971), 416-417.

[3] *Discorso alla FAO nel 25 anniversario* (16 novembre 1970), 4: *AAS* 62 (1970), 833.

[4] Lett. enc. *Redemptor hominis* (4 marzo 1979), 15: *AAS* 71 (1979), 287.

[5] Пар. *Catechesi* (17 gennaio 2001), 4: *Insegnamenti* 24/1 (2001), 179.

[6] Lett. enc. *Centesimus annus* (1 maggio 1991), 38: *AAS* 83 (1991), 841.

[7] , 58: 863.

[8] Giovanni Paolo II, Lett. enc. *Sollicitudo rei socialis* (30 dicembre 1987), 34: *AAS* 80 (1988), 559.

[9] Пар. той жа, Lett. enc. *Centesimus annus* (1 maggio 1991), 37: *AAS* 83 (1991), 840.

[10] *Discorso al Corpo diplomatico accreditato presso la Santa Sede* (8 gennaio 2007): AAS 99 (2007), 73.

[11] Benedetto XVI, Lett. enc. *Caritas in veritate* (29 giugno 2009), 51.

[12] *Discorso al Deutscher Bundestag, Berlino* (22 settembre 2011): *AAS* 103 (2011), 664.

[13] *Discorso al clero della Diocesi di Bolzano-Bressanone* (6 agosto 2008): *AAS* 100 (2008), 634.

[14] *Messaggio per la Giornata di preghiera per la salvaguardia del creato* (1 settembre 2012).

[15] *Discorso a Santa Barbara*, California (8 novembre 1997); пар. John Chryssavgis, *On Earth as in Heaven: Ecological Vision and Initiatives of Ecumenical Patriarch Bartholomew*, Bronx, New York, 2012.

[16] .

[17] *Conferenza al Monastero di Utstein*, Norvegia (23 giugno 2003).

[18] *Discorso «Global Responsibility and Ecological Sustainability: Closing Remarks»*, I Vertice di Halki, Istanbul (20 giugno 2012).

[19] Tommaso da Celano, *Vita prima di San Francesco*, XXIX, 81: *FF* 460.

[20] *Legenda Maior,* VIII, 6: *FF* 1145.

[21] Пар. Tommaso da Celano, *Vita seconda di San Francesco*, CXXIV, 165: *FF* 750.

[22] Conferenza dei Vescovi Cattolici dell'Africa del Sud, *Pastoral Statement on the Environmental Crisis* (5 settembre 1999).

[23] Пар. *Saluto al personale della FAO* (20 novembre 2014): *AAS* 106 (2014), 985.

[24] V Conferenza Generale dell'Episcopato Latinoamericano e dei Caraibi, *Documento di Aparecida* (29 giugno 2007), 86.

[25] Conferenza dei Vescovi Cattolici delle Filippine, Lettera pastorale *What is Happening to our Beautiful Land?* (29 gennaio 1988).

[26] Conferenza Episcopale Boliviana, Lettera pastorale sull'ambiente e lo sviluppo umano in Bolivia *El universo, don de Dios para la vida* (2012), 17.

[27] Пар. Conferenza Episcopale Tedesca. Commissione per gli Affari Sociali, *Der Klimawandel: Brennpunkt globaler, intergenerationeller und ökologischer Gerechtigkeit* (settembre 2006), 28-30.

[28] Pontificio Consiglio della Giustizia e della Pace, *Compendio della Dottrina Sociale della Chiesa*, 483.

[29] *Catechesi* (5 giugno 2013): *Insegnamenti* 1/1 (2013), 280.

[30] Vescovi della Regione Patagonia-Comahue (Argentina), *Mensaje de Navidad* (dicembre 2009), 2.

[31] Conferenza dei Vescovi Cattolici degli Stati Uniti, *Global Climate Change: A Plea for Dialogue, Prudence and the Common Good* (15 giugno 2001).

[32] V Conferenza Generale dell'Episcopato Latinoamericano e dei Caraibi, *Documento di*

*Aparecida* (29 giugno 2007), 471.

[33] Esort. ap. *Evangelii gaudium* (24 novembre 2013), 56.

[34] Giovanni Paolo II, *Messaggio per la Giornata Mondiale della Pace 1990*, 12: *AAS* 82 (1990), 154.

[35] Той жа, *Catechesi* (17 gennaio 2001), 3: *Insegnamenti* 24/1 (2001), 178.

[36] Giovanni Paolo II, *Messaggio per la Giornata Mondiale della Pace 1990*, 15: *AAS* 82 (1990), 156.

[37] *Catechismo della Chiesa Cattolica*, 357.

[38] Пар. *Angelus* ad Osnabrück (Germania) con le persone disabili, 16 novembre 1980: *Insegnamenti* 3/2 (1980), 1232.

[39] Benedetto XVI, *Omelia per il solenne inizio del ministero petrino* (24 aprile 2005): *AAS* 97 (2005), 711.

[40] Пар. *Legenda Maior*, VIII, 1: *FF* 1134.

[41] *Catechismo della Chiesa Cattolica*, 2416.

[42] Conferenza Episcopale Tedesca, *Zukunft der Schöpfung – Zukunft der Menschheit. Erklärung der Deutschen Bischofskonferenz zu Fragen der Umwelt und der Energieversorgung* (1980), II, 2.

[43] *Catechismo della Chiesa Cattolica*, 339.

[44] *Hom. in Hexaemeron*, 1, 2, 10: PG 29, 9.

[45] *Divina Commedia. Paradiso*, Canto XXXIII, 145.

[46] Benedetto XVI, *Catechesi* (9 novembre 2005), 3: *Insegnamenti* 1 (2005), 768.

[47] Той жа, Lett. enc. *Caritas in veritate* (29 giugno 2009), 51.

[48] Giovanni Paolo II, *Catechesi* (24 aprile 1991), 6: *Insegnamenti* 14/1 (1991), 856.

[49] Катэхізіс раз’ясняе, што Бог хацеў стварыць свет «у дарозе» да яго канчатковай дасканаласці, а гэта значыць, што існуе фізічная недасканаласць і зло: пар. *Catechismo della Chiesa Cattolica*, 310.

[50] Пар. Conc. Ecum. Vat. II, Cost. past. *Gaudium et spes*, 36.

[51] Tommaso d’Aquino, *Summa Theologiae* I, q. 104, art. 1, ad 4.

[52] Той жа, *In octo libros Physicorum Aristotelis expositio*, lib. II, lectio 14.

[53] Па гэтым пытанні трэба згадаць уклад П. Тэйяра дэ Шардэна; пар. Paolo VI, *Discorso in uno stabilimento chimico-farmaceutico* (24 febbraio 1966): *Insegnamenti* 4 (1966), 992-993; Giovanni Paolo II, *Lettera al reverendo P. George V. Coyne* (1 giugno 1988): *Insegnamenti* 11/2 (1988), 1715; Benedetto XVI, *Omelia nella celebrazione dei Vespri ad Aosta* (24 luglio 2009): *Insegnamenti* 5/2 (2009), 60.

[54] Giovanni Paolo II, *Catechesi* (30 gennaio 2002), 6: *Insegnamenti* 25/1 (2002), 140.

[55] Conferenza dei Vescovi Cattolici del Canada. Commissione Affari Sociali, Lettera pastorale «*You Love All That Exists… All Things Are Yours, God, Lover of Life*» (4 ottobre 2003), 1.

[56] Conferenza dei Vescovi Cattolici del Giappone, *Reverence for Life. A Message for the Twenty-First Century* (1 gennaio 2001), 89.

[57] Giovanni Paolo II, *Catechesi* (26 gennaio 2000), 5: *Insegnamenti* 23/1 (2000), 123.

[58] Той жа, *Catechesi* (2 agosto 2000), 3: *Insegnamenti* 23/2 (2000), 112.

[59] Paul Ricœur, *Philosophie de la volonté. 2. Finitude et Culpabilité,* Paris 2009, 216 (trad. it.: Finitudine e colpa, Bologna, 1970, 258).

[60] *Summa Theologiae* I, q. 47, art. 1.

[61] .

[62] Пар. , art. 2, ad. 1; art. 3.

[63] *Catechismo della Chiesa Cattolica*, 340.

[64] *Cantico delle creature: FF* 263.

[65] Пар. Conferenza Nazionale dei Vescovi del Brasile, *A Igreja e a questão ecológica*, 1992, 53-54.

[66] , 61.

[67] Esort. ap. *Evangelii gaudium* (24 novembre 2013), 215.

[68] Пар. Benedetto XVI, Lett. enc. *Caritas in veritate* (29 giugno 2009), 14.

[69] *Catechismo della Chiesa Cattolica*, 2418.

[70] Conferenza dell'Episcopato Dominicano, Lettera pastorale *Sobre la relación del hombre con la naturaleza* (15 marzo 1987).

[71] Giovanni Paolo II, Lett. enc. *Laborem exercens* (14 settembre 1981), 19: *AAS* 73 (1981), 626.

[72] Lett. enc. *Centesimus annus* (1 maggio 1991), 31: *AAS* 83 (1991), 831.

[73] Lett. enc. *Sollicitudo rei socialis* (30 dicembre 1987), 33: *AAS* 80 (1988), 557.

[74] *Discorso agli indigeni e ai campesinos del Messico, Cuilapán* (29 gennaio 1979), 6: *AAS* 71 (1979), 209.

[75] *Omelia nella Messa celebrata per gli agricoltori a Recife, Brasile* (7 luglio 1980), 4: *AAS* 72 (1980), 926.

[76] Пар. *Messaggio per la Giornata Mondiale della Pace 1990*, 8: *AAS* 82 (1990), 152.

[77] Conferenza Episcopale Paraguayana, Lettera pastorale *El campesi-no paraguayo y la tierra* (12 giugno 1983), 2, 4, d.

[78] Conferenza Episcopale della Nuova Zelanda, *Statement on Environmental Issues*, Wellington (1 settembre 2006).

[79] Lett. enc. *Laborem exercens* (14 settembre 1981), 27: *AAS* 73 (1981), 645.

[80] Таму св. Юстын мог казаць пра «зерне Слова» ў свеце: пар. *II Apologia* 8, 1-2; 13, 3-6: *PG* 6, 457-458; 467.

[81] Giovanni Paolo II, *Discorso ai rappresentanti della scienza, della cultura e degli alti studi nell'Università delle Nazioni Unite*, Hiroshima (25 febbraio 1981), 3: AAS 73 (1981), 422.

[82] Benedetto XVI, Lett. enc. *Caritas in veritate* (29 giugno 2009), 69.

[83] Romano Guardini, *Das Ende der Neuzeit, Würzburg* 19659, 87 (ed. it.: *La fine dell'epoca moderna*, Brescia 1987, 80).

[84] , (ed. it.: 81).

[85] , 87-88 (ed. it.: 81).

[86] Pontificio Consiglio della Giustizia e della Pace, *Compendio della Dottrina Sociale della Chiesa*, 462.

[87] Romano Guardini, *Das Ende der Neuzeit*, 63-64 (ed. it.: *La fine dell'epoca moderna*, 58).

[88] , 64 (ed. it.: 58).

[89] Пар. Benedetto XVI, Lett. enc. *Caritas in veritate* (29 giugno 2009), 35.

[90] , 22.

[91] Esort. ap. *Evangelii gaudium* (24 novembre 2013), 231.

[92] Romano Guardini, *Das Ende der Neuzeit*, 63 (ed. it.: *La fine dell'epoca moderna*, 57-58).

[93] Giovanni Paolo II, Lett. enc. *Centesimus annus* (1 maggio 1991), 38: *AAS* 83 (1991), 841.

[94] Пар. Dichiarazione *Love for Creation. An Asian Response to the Ecological Crisis*, Colloquio promosso dalla Federazione delle Confere-nze dei Vescovi dell'Asia (Tagaytay, 31 gennaio-5 febbraio 1993), 3.3.2.

[95] Giovanni Paolo II, Lett. enc. *Centesimus annus* (1 maggio 1991), 37: *AAS* 83 (1991), 840.

[96] Benedetto XVI, *Messaggio per la Giornata Mondiale della Pace 2010*, 2: *AAS* 102 (2010), 41.

[97] Той жа, Lett. enc. Caritas in veritate (29 giugno 2009), 28.

[98] Пар. Vincenzo di Lérins, Commonitorium primum, cap. 23: PL 50, 668: «Каб з гадамі вера ўмацоўвалася, пашыралася з часам, узрастала са стагоддзямі».

[99] N. 80: *AAS* 105 (2013), 1053.

[100] Conc. Ecum. Vat. II, Cost. past. *Gaudium et spes*, 63.

[101] Пар. Giovanni Paolo II, Lett. enc. *Centesimus annus* (1 maggio 1991), 37: *AAS* 83 (1991), 840.

[102] Paolo VI, Lett. enc. *Populorum progressio* (26 marzo 1967), 34: *AAS* 59 (1967), 274.

[103] Benedetto XVI, Lettera enc. *Caritas in veritate* (29 giugno 2009), 32.

[104] .

[105] .

[106] *Catechismo della Chiesa Cattolica*, 2417.

[107] , 2418.

[108] , 2415.

[109] *Messaggio per la Giornata Mondiale della Pace 1990*, 6: *AAS* 82 (1990), 150.

[110] *Discorso alla Pontificia Accademia delle Scienze* (3 ottobre 1981), 3: *Insegnamenti* 4/2 (1981), 333.

[111] *Messaggio per la Giornata Mondiale della Pace 1990*, 7: *AAS* 82 (1990), 151.

[112] Giovanni Paolo II, *Discorso alla trentacinquesima Assemblea Generale dell'Associazione Medica Mondiale* (29 ottobre 1983), 6: *AAS* 76 (1984), 394.

[113] Commissione Episcopale di Pastorale Sociale dell'Argentina, *Una tierra para todos* (giugno 2005), 19.

[114] *Dichiarazione di Rio sull'ambiente e lo sviluppo* (14 giugno 1992), Principio 4.

[115] Esort. ap. *Evangelii gaudium* (24 novembre 2013), 237.

[116] Benedetto XVI, Lett. enc. *Caritas in veritate* (29 giugno 2009), 51.

[117] Некаторыя аўтары паказалі тыя каштоўнасці, якімі жывуць, напрыклад, *,* Лацінскай Амерыкі: пар. Juan Carlos Scannone, S.J., «*La irrupción del pobre y la lógica de la gratitud*», en Juan Carlos Scannone y Marcelo Perine (edd.), *Irrupción del pobre y quehacer filosófico. Hacia una nueva racionalidad*, Buenos Aires 1993, 225-230.

[118] Pontificio Consiglio della Giustizia e della Pace, *Compendio della Dottrina Sociale della Chiesa*, 482.

[119] Esort. ap. *Evangelii gaudium* (24 novembre 2013), 210.

[120] *Discorso al Deutscher Bundestag*, Berlino (22 settembre 2011): *AAS* 103 (2011), 668.

[121] *Catechesi* (15 aprile 2015): *L'Osservatore Romano*, 16 aprile 2015, p. 8.

[122] Conc. Ecum. Vat. II, Cost. past. *Gaudium et spes*, 26.

[123] Пар. nn. 186-201: *AAS* 105 (2013), 1098-1105.

[124] Conferenza Episcopale Portoghese, Lettera pastorale *Respon-sabilidade solidária pelo bem comum* (15 settembre 2003), 20.

[125] Benedetto XVI, *Messaggio per la Giornata Mondiale della Pace 2010*, 8: *AAS* 102 (2010), 45.

[126] *Dichiarazione di Rio sull'ambiente e lo sviluppo* (14 giugno 1992), Principio 1.

[127] Conferenza Episcopale Boliviana, Lettera pastorale sull'ambiente e lo sviluppo umano in Bolivia *El Universo, don de Dios para la Vida* (2012), 86.

[128] Pontificio Consiglio della Giustizia e della Pace, *Energia, Giustizia e Pace*, IV, 1, Città del Vaticano (2013), 56.

[129] Benedetto XVI, Lett. enc. *Caritas in veritate* (29 giugno 2009), 67.

[130] Esort. ap. *Evangelii gaudium* (24 novembre 2013), 222.

[131] Pontificio Consiglio della Giustizia e della Pace, *Compendio della Dottrina Sociale della Chiesa*, 469.

[132] *Dichiarazione di Rio sull'ambiente e lo sviluppo* (14 giugno 1992), Principio 15.

[133] Пар. Conferenza Episcopale Messicana. Commissione Episcopale per la Pastorale Sociale, *Jesucristo, vida y esperanza de los indígenas y campesinos* (14 gennaio 2008).

[134] Pontificio Consiglio della Giustizia e della Pace, *Compendio della Dottrina Sociale della Chiesa*, 470.

[135] *Messaggio per la Giornata Mondiale della Pace 2010*, 9: AAS 102 (2010), 46.

[136] .

[137] , 5: p. 43.

[138] Benedetto XVI, Lett. enc. *Caritas in veritate* (29 giugno 2009), 50.

[139] Esort. ap. *Evangelii gaudium* (24 novembre 2013), 209.

[140] , 228.

[141] Пар. Lett. enc. *Lumen fidei* (29 giugno 2013), 34: «Для святла веры, паколькі яно звязана з праўдай любові, не чужы матэрыяльны свет, бо любоў заўсёды перажываецца ў целе і ў душы; святло веры — гэта ўцелаўлёнае святло, крыніца якога ў светлым жыцці Езуса. Яно асвятляе таксама матэрыю, давярае яе ладу, ведае, што ў ёй адкрываецца больш шырокая дарога гармоніі і зразумення. Праз гэта вера дабратворна ўплывае на погляды навукі: яна запрашае вучонага адкрыцца на рэчаіснасць з усім яе невычарпальным багаццем. Вера абуджае крытычнае разуменне, бо не дазваляе, каб доследы задавольваліся толькі формуламі, і дапамагае зразумець, што прырода заўсёды большая за іх. Заахвочваючы да захаплення таямніцай стварэння, вера пашырае гарызонты розуму, каб лепш асвятліць свет, які адкрываецца перад навуковымі доследамі».

[142] Esort. ap. *Evangelii gaudium* (24 novembre 2013), 256.

[143] Esort. ap. *Evangelii gaudium* (24 novembre 2013), 231.

[144] *Das Ende der Neuzeit*, Würzburg 19659, 66-67 (ed. it. *La fine dell'epoca moderna*, Brescia 1987, 61).

[145] Giovanni Paolo II, *Messaggio per la Giornata Mondiale della Pace 1990*, 1: AAS 82 (1990), 147.

[146] Benedetto XVI, Lett. enc. *Caritas in veritate* (29 giugno 2009), 66.

[147] Той жа, *Messaggio per la Giornata Mondiale della Pace 2010*, 11: *AAS* 102 (2010), 48

[148] *Carta della Terra*, L'Aja (29 giugno 2000).

[149] Giovanni Paolo II, Lett. enc. *Centesimus annus* (1 maggio 1991), 39: *AAS* 83 (1991), 842.

[150] Той жа, *Messaggio per la Giornata Mondiale della Pace 1990*, 14: *AAS* 82 (1990), 155.

[151] Esort. ap. *Evangelii gaudium* (24 novembre 2013), 261.

[152] Benedetto XVI, *Omelia per il solenne inizio del ministero petrino* (24 aprile 2005): *AAS* 97 (2005), 710.

[153] Conferenza dei Vescovi Cattolici dell'Australia, *A New Earth. The Environmental Challenge*

(2002).

[154] Romano Guardini, *Das Ende der Neuzeit*, 72 (trad. it.: *La fine dell'epoca moderna*, 66).

[155] Esort. ap. *Evangelii gaudium* (24 novembre 2013), 71.

[156] Пар. Benedetto XVI, Lett. enc. *Caritas in veritate* (29 giugno 2009), 2.

[157] Paolo VI, *Messaggio per la Giornata Mondiale della Pace 1977*: *AAS* 68 (1976), 709.

[158] Pontificio Consiglio della Giustizia e della Pace, *Compendio della Dottrina Sociale della Chiesa*, 582.

[159] Духоўны настаўнік Алі Аль-Кювас, зыходзячы са свайго до-сведу, падкрэслівае, што не трэба празмерна аддзяляць стварэнняў свету ад адчування Бога ў глыбіні нашых сэрцаў. Ён пісаў: «Не трэба зласліва крытыкаваць тых, хто шукае экстазу ў музыцы або паэзіі. Кожны гук ці хваляванне гэтага свету змяшчае далікатную таямніцу. Утаямнічаным асобам удаецца ўхапіць тое, пра што кажа вецер, дрэвы, якія хістаюцца, вада, якая плыве, мухі, якія звіняць, рыпучыя дрэвы, спеў птушак, гучанне струнаў або флейты, уздыханні хворых, стогны церпячых…» (Eva De Vitray-Meyerovitch [ed.], *Anthologie du soufisme*, Paris 1978, 200; trad. it.: *I mistici dell'Islam*, Parma 1991, 199).

[160] *In II Sent*., 23, 2, 3.

[161] *Cántico Espiritual*, XIV, 5.

[162] .

[163] , XIV, 6-7.

[164] Giovanni Paolo II, Lett. ap. *Orientale lumen* (2 maggio 1995), 11: *AAS* 87 (1995), 757.

[165] .

[166] Той жа, Lett. enc. *Ecclesia de Eucharistia* (17 aprile 2003), 8.

[167] Benedetto XVI, *Omelia nella Messa del Corpus Domini* (15 giugno 2006): *AAS* 98 (2006), 513.

[168] *Catechismo della Chiesa Cattolica*, 2175.

[169] Giovanni Paolo II, *Catechesi* (2 agosto 2000), 4: *Insegnamenti* 23/2 (2000), 112.

[170] *Quaest. disp. de Myst. Trinitatis*, 1, 2, concl.

[171] Пар. Tommaso d’Aquino, *Summa Theologiae* I, q. 11, art. 3; q. 21, art. 1, ad 3; q. 47, art. 3.

[172] Basilio Magno, *Hom. in Hexaemeron*, 1, 2, 6: PG 29, 8.

Copyright © Dicastero per la Comunicazione - Libreria Editrice Vaticana